

ГЁТЭБОРГ · 1.05.1912 · ПЕРШАМАЙСКАЕ ШЭСЦЕ

Што такое сацыял-дэмакратыя?

Інгвар Карлсан, Ане-Мары Ліндгрэн

ПРАКСІС.

Пра выданне

Ingvar Carlsson, Anne-Marie Lindgren. What is Social Democracy? Англійскае выданне кнігі «Vad är socialdemokrati?» (7-е выданне), распаўсюджвае Olof Palme International Center, Стакгольм.

Беларускае выданне: Праксіс, 2026 — пераклад, калажы і вёрстка. praxis.hramada.eu.

Выданне перакладзена і апублікавана з дазволу Olof Palme International Center.

Тэкст кнігі адлюстроўвае становішча на 2019 год. Заўвагі перакладчыка пазначаныя ў зносках.

Змест

Прадмова 5

I **Гісторыя сацыял-дэмакратыі** 9

Гады барацьбы (прыкладна 1885–1920) 10
Гады прарыву (прыкладна 1920–1945) 16
Гады дзяржавы дабрабыту (прыкладна 1945–1980) 18
Перыяд пераменаў (прыкладна з 1980 года да нашага часу) 25
Будучыня? 37

II **Ідэалагічная спадчына сацыял-дэмакратыі** 38

Што такое ідэалогія? 39
Аналіз грамадства 40
Словы-каштоўнасці 50

III **Ідэйнае развіццё сацыял-дэмакратыі: свет вытворчасці** 87

Марксізм 88
Спадчына Маркса 92
Рэвалюцыя ці рэформа? 95
Класавая барацьба ці дзяржава дабрабыту? 101
Капітал, уласнасць і права вырашаць 106
Рынак і палітыка 114

IV **Ідэйнае развіццё сацыял-дэмакратыі: размеркаванне вынікаў вытворчасці** 122

Сацыял-дэмакратычная мадэль 124
Ці павінны мільянеры атрымліваць дзіцячую дапамогу? 126
Правая мадэль — іншы падыход 129
Ідэалогія, што за гэтым стаіць 131
Кантроль, адказнасць і стымулы 134
Рынкавыя рашэнні ў сферы дабрабыту 139
А як жа свабода выбару? 143

V **Сацыял-дэмакратыя — састарэлая ідэалогія?** 146

Новая шкала? 147

Правы папулізм 150
Шкала «левыя — правыя» 152
Састарэлыя ідэалогіі? 155
Роўнасць 156
Рост 159
Свабода асобы 159
Вяртанне на рынак працы 161
Роля інтарэсаў капіталу 163
Калектыўныя рашэнні і дзяржаўныя абавязацельствы 168
Самыя небяспечныя наступствы — расколіны ў грамадстве 177

VI **Будучыня?** 180
Вярнуць дэмакратыю 183
Новыя перадумовы 186

Ілюстрацыі 210

Прадмова

У КОЖНАГА СЯБРА шведскай Сацыял-дэмакратычнай партыі ёсць свой асабісты адказ на пытанне, вынесенае ў назву гэтай кнігі. Гэтыя адказы могуць мяняцца, і дзякуючы гэтаму дыскусія застаецца жывой. Аднак ёсць адна ідэалагічная канстанта, якую сфармавалі і каштоўнасці, і аналіз грамадства, і тэарэтычныя дыскусіі, і практычны палітычны досвед. Мы імкнёмся апісаць гэтую ідэалагічную традыцыю і яе развіццё праз розныя праграмы партыі з канца 1880-х гадоў — на фоне таго грамадскага развіцця, на якое сацыял-дэмакратыя ўплывала і якое, у сваю чаргу, уплывала на партыю. У гэтым сэнсе кніга — уводзіны ў сацыял-дэмакратычную ідэалогію, у гісторыю сацыял-дэмакратыі і ў асноўныя абрысы сацыял-дэмакратычнай палітыкі.

Аднак, вядома, кніга — гэта таксама і асабісты адказ на пытанне: што такое сацыял-дэмакратыя? Яе можна разглядаць як сінтэз нашага ўласнага шматгадовага досведу — і сацыял-дэмакратычных ідэалагічных дыскусій, і практычнай сацыял-дэмакратычнай палітыкі, якія развіваліся ва ўмовах зменлівых знешніх абставін і вельмі няўстойлівага клімату для дыскусіі.

У гэтай кнігі ёсць свая гісторыя — гісторыя змен у палітычных перадумовах і ў палітычнай дыскусіі. Першае выданне выйшла ў 1974 годзе. Ідэя кнігі насамрэч належала жонцы Інгвара Карлсана, Інгрыд: працуючы школьнай бібліятэкаркай, яна заўважыла, што ўводных тэкстаў пра тагачасныя больш

левырадыкальныя, нерэфармісцкія рухі было шмат, а падобных тэкстаў пра сацыял-дэмакратыю не было. Першае выданне кнігі *«Што такое сацыял-дэмакратыя?»* было напісана, каб запоўніць гэты прабел, — найперш для выкарыстання ў старэйшых класах сярэдняй школы. Аднак хутка высветлілася, што кніга адказвае і на патрэбу ўнутры самой сацыял-дэмакратыі, і так з'явіліся наступныя выданні — цяперашняе ўжо сёмае.



Аддзел дзіцячай літаратуры Хельсінкскай гарадской бібліятэкі (бібліятэка на вуліцы Рыхардынкату), 1931 год

Галоўныя тэмы ва ўсіх выданнях, у тым ліку і ў гэтым, засталіся тымі ж: дэмакратычна-рэфармісцкі падыход, гістарычна-матэрыялістычны падыход, ідэал роўнасці, палітыка дабрабыту, неабходнасць процівагі інтарэсам капіталу і неабходнасць бачыць сувязь паміж умовамі жыцця асобнага чалавека

і структурамі грамадства. Аднак калі выданне 1974 года абараняла рэфармісцкую сацыял-дэмакратыю ў спрэчцы з больш марксісцкімі, артадаксальнымі левымі рухамі з іх хісткім стаўленнем да дэмакратыі, то навейшыя выданні ўсё больш абараняюць сацыял-дэмакратычныя погляды ў спрэчцы з кансерватызмам, неалібералізмам і рынкавай артадоксіяй — бо клімат дыскусіі ўвесь час зрушваецца злева направа. Цяпер, у 2019 годзе, увага павінна быць скіравана на правы радыкалізм і пагрозу, якую ён нясе дэмакратыі.

Гэтая кніга пабудаваная крыху інакш, чым папярэднія выданні. Першая частка, як і раней, апісвае і абгрунтоўвае асноўныя рысы сацыял-дэмакратычнай ідэалогіі і бачання грамадства, а таксама ключавыя элементы сацыял-дэмакратычнай палітыкі. Другая частка, наадварот, не абапіраецца на дзейную праграму партыі: гэта хутчэй асабісты ўнёсак у дыскусію пра развіццё грамадства за апошнія дзесяцігоддзі і пра ролю і магчымасці сацыял-дэмакратыі ў будучыні. Звярніце ўвагу: гэта не задумана як прапанова канкрэтных дзеянняў ці мер у асобных галінах палітыкі — гэта хутчэй агульнае разважанне, яшчэ раз, пра асноўныя элементы сацыял-дэмакратычнага бачання грамадства, пра яго актуальнасць сёння і пра выклікі, з якімі яно сутыкаецца.

Як сацыял-дэмакраты, мы перакананыя, што галоўныя рысы сацыял-дэмакратычнай тэорыі і практыкі, пералічаныя вышэй, захоўваюць сілу і — што не менш важна — што яны важныя для абароны дэмакратыі. Сацыял-дэмакратыя — насуперак таму, што сцвярджаў рынкава-ліберальны рэжым апошніх дзесяцігоддзяў, — не састарэла і не страціла значэння.

З другога боку, знешнія перадумовы для сацыял-дэмакратычнай палітыкі — і ў краіне, і за мяжой, і ў эканоміцы, і ў грамадстве — у шэрагу істотных момантаў змяніліся. Мы абмяр-

коўваем гэтыя змены ў апошнім раздзеле, у тым ліку тое, якіх навацый яны патрабуюць ад сацыял-дэмакратыі. Як ветэраны, мы з поўным правам і з гарачым пачуццём перадаём маладзейшым пакаленням задачу распрацаваць і ўвасобіць у жыццё новыя палітычныя інструменты.

Стакгольм, снежань 2019 года

Інгвар Карлсан, Ане-Мары Ліндгрэн



Гісторыя сацыял-дэмакраты

Гады барацьбы

(прыкладна 1885–1920)

ПРАФСАЮЗНЫ І ПАЛІТЫЧНЫ рабочы рух у Швецыі па-сапраўднаму пачаў складвацца ў 1880-я гады. Яго ў вялікай ступені падтрымлівалі прамысловыя рабочыя, і шмат у чым рабочы рух можна лічыць менавіта прадуктам новага індустрыяльнага грамадства.

Рух, натуральна, нараджаўся з часта цяжкіх умоў працы і нізкіх заробкаў у прамысловасці. Рабочыя працавалі доўга — часта па 11–12 гадзін, шэсць дзён на тыдзень. Умовы на працоўных месцах часта былі шкоднымі для здароўя або проста небяспечнымі, а заробкі — надзвычай нізкімі. У лепшым выпадку заробку хапала, каб пакрыць выдаткі на жыццё і крыху адкласці, але многім ён ледзь дазваляў выжыць.

Ніякай сістэмы сацыяльнай абароны — страхавання па хваробе ці пенсій — не было, і рабочых, якія захварэлі або атрымалі траўму на працы, часта звальнялі. Апошняй крыніцай дапамогі, каб выжыць, для тых, хто не мог сябе ўтрымліваць, была дапамога бедным, але яе не хапала, і часта яна была прыніжальнай.

Выбарчае права, гэта значыць права галасаваць на выбарах у Рыксдаг (парламент) і на муніцыпальных выбарах, залежала ад даходу. Каб атрымаць права голасу на выбарах у Рыксдаг, трэба было мець капітал у 40 000 крон або гадавы даход у 800 крон і быць мужчынам — жанчыны выключаліся, нават калі адпавядалі маёмасным патрабаванням. Каб галасаваць на муніцыпальных выбарах, трэба было плаціць муніцыпальныя падаткі, якія збіралі з усіх, хто меў гадавы даход каля 400 крон. Жанчыны мелі права голасу, калі адпавядалі патрабаванню па даходзе і былі паўналетнімі. Гэтае апошняе правіла выклю-

чала замужніх жанчын, бо яны знаходзіліся пад апекай сваіх мужоў.

Вельмі нямногія рабочыя маглі зарабіць 800 крон за год. Большасць рабочых-мужчын і частка рабочых-жанчын адпавядалі патрабаванню па даходзе для муніцыпальных выбараў. Аднак муніцыпальнае выбарчае права было градуяванае паводле даходу: чым большы даход, тым больш галасоў. У выніку вышэйшыя слаі грамадства — дзякуючы значна большым даходам і, адпаведна, значна большай колькасці галасоў — мелі гарантаваную большасць у муніцыпальных сходах.

Менавіта на фоне такіх умоў — і ў працоўным жыцці, і ў грамадстве — і ўзнік рабочы рух.

Калі ўмовы на прамысловых прадпрыемствах былі вырашальнай прычынай узнікнення руху, то індустрыялізацыя стварыла і глебу для яго будучых поспехаў. Па-першае, індустрыялізацыя прывяла да значнага росту вытворчых магутнасцяў, а значыць — да большых рэсурсаў для ўвогуле вышэйшага ўзроўню жыцця, пры ўмове што вынікі вытворчасці размяркоўваліся б справядліва. Па-другое, прамысловыя прадпрыемствы адкрылі шлях да калектыўных дзеянняў рабочых, што дазваляла дасягнуць больш справядлівага балансу паміж капіталам і працай, а значыць — больш справядлівага размеркавання і ўплыву, і дабрабыту.

Такім чынам, рабочы рух патрабаваў пераразмеркавання палітычнай улады і эканамічных рэсурсаў. Гэта, натуральна, сустрэла супраціў тых груп, у руках якіх у асноўным была гэтая ўлада. Першыя дзесяцігоддзі рабочага руху былі цяжкай барацьбой — з аднаго боку, за палітычнае выбарчае права, з другога — за права належаць да прафсаюза, які мае права весці перамовы пра заробкі і ўмовы працы. Палітычная і прафсаюзная барацьба разглядаліся ў гэтым кантэксце як два бакі

аднаго медаля, скіраваныя на адно і тое ж — на змену грамадства.

Шведская Сацыял-дэмакратычная партыя была заснаваная ў 1889 годзе з ініцыятывы Сацыял-дэмакратычнага саюза ў Стакгольме. Спачатку партыя адказвала і за прафсаюзную арганізацыю. Аднак калі прафсаюзны рух пачаў расці, стала відавочна, што яму патрэбная ўласная арганізацыя, і ў 1898 годзе была заснаваная Шведская канфедэрацыя прафсаюзаў (LO). Гэта не змяніла погляду, што палітычная і прафсаюзная праца — два бакі аднаго медаля і што яны дапаўняюць адна адну.

У барацьбе за выбарчае права сацыял-дэмакраты і Ліберальная партыя аб'ядналіся супраць кансерватыўных сіл. Лібералы і сацыял-дэмакраты таксама сыходзіліся ў тым, што патрэбныя пэўныя сацыяльныя рэформы і большая абарона рабочых. З другога боку, лібералы былі ў асноўным абыякавыя да прафсаюзнага патрабавання права на перамовы пра заробкі і ўмовы працы.

Пад ціскам грамадскай думкі, якая ўсё мацнела, кансерватары ў 1905–1909 гадах былі вымушаныя прыняць шэраг рашэнняў, якія пашырылі выбарчае права мужчын на выбарах у Другую палату Рыксдага[1]. У прынцыпе права голасу атрымалі ўсе мужчыны старэйшыя за 25 гадоў, але яно было абстаўленае такой колькасцю ўмоў, што вялікая частка рабочага класа

1 Заўвага перакладчыка: да 1970 года Рыксдаг меў дзве палаты — Першую, якую выбіралі ўскосна, і Другую, якую выбіралі непасрэдна; з 1971 года шведскі парламент аднапалатны.

на практыцы па-ранейшаму заставалася выключанай. Градуяванае паводле даходу выбарчае права на муніцыпальных выбарах і на выбарах у ландстынгі[2] захавалася — адзін выбаршчык мог мець да 40 галасоў.

Правыя патрабавалі захаваць гэтую градацыю паводле даходу як умову, без якой яны ўвогуле не сталі б разглядаць пашырэнне выбарчага права на выбарах у Другую палату. Справа ў тым, што сябраў Першай палаты Рыксдага выбіралі ўскосна — выбаршчыкі, прызначаныя паводле вынікаў выбараў у ландстынгі. Таму градацыя паводле даходу азначала, што больш заможныя выбаршчыкі — на практыцы тыя, хто галасаваў за Правую партыю, — маглі вызначаць вынікі выбараў у ландстынгі, а значыць, і склад Першай палаты Рыксдага. Гэта дазваляла Першай палаце блакаваць рашэнні Другой палаты, з якімі Правая партыя не хацела пагаджацца.

У 1917 годзе выбары ў Другую палату далі большасць сацыял-дэмакратам і лібералам, і яны разам сфармавалі ўрад, у якім прэм'ер-міністрам стаў ліберал Нільс Эдэн, а міністрам фінансаў — лідар Сацыял-дэмакратычнай партыі Хьялмар Брантынг. Вясной 1918 года новы ўрад унёс прапанову пра ўсеагульнае і роўнае выбарчае права. Яна прадугледжвала права голасу на выбарах у Рыксдаг і для мужчын, і для жанчын, а таксама адмену градацыі паводле даходу на муніцыпальных выбарах, каб кожны выбаршчык меў адзін голас.

Другая палата з яе левай большасцю прапанову ўхваліла, але Першая палата яе адхіліла: Правая партыя па-ранейшаму выступала супраць выбарчага права для жанчын. Толькі позняй

2 Заўвага перакладчыка: ландстынг (*landsting*) — выбарны орган рэгіянальнага самакіравання ў шведскіх ленах (адміністрацыйных акругах), які адказваў перадусім за ахову здароўя; з 2019 года ландстынгі называюцца рэгіёнамі.

восенню 1918 года, пад ціскам Нямецкай рэвалюцыі і відавочных бунтоўных настрояў у самой Швецыі, правыя капітулявалі: апынуўшыся перад выбарам паміж правам голасу для жанчын і рэвалюцыяй, яны выбралі меншае з двух ліхаў.

На рынку працы часта ўспыхвалі канфлікты вакол свабоды аб'яднанняў. Найбуйнейшы з іх адбыўся ў 1909 годзе і ў народзе вядомы як «шведскі ўсеагульны страйк», хоць дакладней было б назваць яго «ўсеагульным лакаўтам»: страйк быў адказам — і практычна вымушаным адказам — на ўльтыматыўную пагрозу Шведскай асацыяцыі наймальнікаў абвясціць лакаўт па ўсёй краіне. Канфлікт скончыўся паразай рабочых. Наймальнікі патрабавалі, каб страйкоўцы выйшлі са свайго прафсаюза, інакш іх не пусцілі б назад на працу.

Такім чынам, мэта, якая стаяла за канфліктам, — знішчыць прафсаюзную арганізацыю — была часова дасягнутая. Аднак забарону на аб'яднанне немагчыма было ўтрымліваць доўга, і ўжо праз дзесяць гадоў прафсаюзная арганізацыя вярнулася на ранейшы ўзровень і працягвала расці. У 1919 годзе рашэннем Рыксдага было ўведзена ў дзеянне адно з ключавых патрабаванняў прафсаюзаў — васьмігадзінны працоўны дзень.

Вясной 1917 года Сацыял-дэмакратычная партыя раскалолася на дзве. Прычынай расколу было даўняе пытанне пра тое, якімі тактычнымі і стратэгічнымі метадамі павінна карыстацца партыя: рэфармісцкімі і мірнымі ці актывісцкімі і баявымі, з мэтай рэвалюцыі. Гэты канфлікт узмацнялі супрацьлеглыя погляды на пытанне абароны, дзе лініі разыходжанняў наконт узброеных сіл ішлі насуперак апісаным вышэй: рэфармісцкая група хацела захаваць узброеныя сілы Швецыі, тады як больш рэвалюцыйная група выступала за радыкальнае разбраенне.

Гэты канфлікт абвастраўся на працягу некалькіх гадоў. На з'ездзе партыі ў 1917 годзе апазіцыйная група пацярпела паразу ў пытанні аб'яднання, якое стала сімвалам двух бакоў партыі. Гэта дало штуршок да стварэння новай партыі праз некалькі месяцаў. Новая партыя называлася Левай сацыял-дэмакратычнай партыяй Швецыі. Аднак у 1921 годзе гэтая новая партыя ўступіла ў Камуністычны Інтэрнацыянал (Камінтэрн) і змяніла назву на Камуністычную партыю Швецыі.



Ваенная варта на Цэнтральным вакзале ў Стакгольме падчас усеагульнага страйку 1909 года; здымак з кнігі Цэта Хёглунда «Hjalmar Branting och hans livsgärning» (1928)

Сёння, праз шмат дзесяцігоддзяў, пасля некалькіх расколаў і перайменаванняў, гэтая партыя называецца Левай партыяй.

Гады прарыву
(прыкладна 1920–1945)

ПАСЛЯ ТАГО ЯК БЫЛІ заваяваныя палітычнае выбарчае права, васьмігадзінны працоўны дзень і (у пэўнай меры) свабода аб'яднанняў, палітычная праца ўвайшла ў новую фазу. Спачатку гэтая фаза не была лёгкай. Сітуацыя ў парламенце ў 1920-я гады была нестабільнай: адзін за адным мяняліся новыя ўрады меншасці, якія сыходзілі пасля кароткага часу ва ўладзе. З 1920 года да восені 1932 года ў Швецыі змянілася дзесяць урадаў, тры з якіх былі сацыял-дэмакратычнымі. І парламенцкія, і эканамічныя абставіны моцна абмяжоўвалі прастору для палітычнага манеўру.

Ужо сам факт, што сацыял-дэмакратыя, якую толькі некалькі дзесяцігоддзяў таму лічылі вялікай пагрозай для грамадства, цяпер выросла настолькі, што апынулася ва ўрадзе, сведчыў пра вялікія змены ў грамадстве. Аднак у кансерватыўных колах па-ранейшаму моцнымі заставаліся і варожасць да рабочага руху, і страх перад ім. Выразны прыклад гэтага — кампанія запалохвання супраць сацыял-дэмакратаў падчас выбараў 1928 года. Сёння ў падручніках гісторыі яна апісваецца як «казацкія выбары»: на шэрагу правых перадвыбарчых плакатаў былі паказаныя ўзброеныя салдаты («казакі»), якія выганяюць людзей з дамоў і адрываюць ад сем'яў. Правыя сцвярджалі, што такім і будзе канчатковы вынік сацыял-дэмакратычнай палітыкі: «захоп асабістай маёмасці», «распад сем'яў», «бездагляднасць дзяцей» і «заняпад звычаяў».

Кампанія запалохвання мела поспех, і сацыял-дэмакраты на гэтых выбарах страцілі пазіцыі, але вярнуліся ў 1932 годзе, калі атрымалі вялікую колькасць месцаў. Сацыял-дэмакраты на чале з прэм'ер-міністрам Пер Альбінам Хансанам у чацвёрты раз сфармавалі ўрад, але без уласнай большасці ў Рыкс-

дагу. Аднак ужо ў наступным годзе партыя заключыла пагадненне з Сялянскім саюзам (*Bondeförbundet*) — цяпер гэта Партыя цэнтра (Швецыя) — пра эканамічную палітыку барацьбы з беспрацоўем, заснаваную на дзяржаўных інвестыцыях, найперш у будаўнічыя праекты.

Ідэю актыўных дзяржаўных мер для процідзеяння крызісу найбольш выразна сфармуляваў брытанскі эканаміст Джон Мейнард Кейнс, і яе часта называюць кейнсіянскай эканомікай. Падобныя ідэі мелі і шведскія эканамісты так званай Стакгольмскай школы. Да гэтай стакгольмскай школы эканамічнай думкі належалі будучы лідар Народнай партыі Бертыль Улін і будучы сацыял-дэмакратычны міністр Гунар Мюрдаль.

Дзяржаўныя інвестыцыі, прадугледжаныя крызіснымі пагадненнямі 1933 года, самі па сабе былі адносна сціплымі, і найбольш адчувальныя змены ў лічбах беспрацоўя ў Швецыі праявіліся толькі ў другой палове 1930-х гадоў, з эканамічным уздымам, які наступіў пасля. Аднак прынцыповае значэнне гэтых інвестыцый было велізарным. Пагадненне азначала прарыў да новага погляду на эканамічную ролю дзяржавы і паказвала кірунак, як вырвацца з паралічу перад беспрацоўем, — а гэта было праблемай і для сацыял-дэмакратаў з-за тупіковых уяўленняў 1920-х гадоў пра саманалады рынку. Поўнага і паспяховага ўздзеяння гэты падыход дасягнуў у 1950-я і 1960-я гады ў спалучэнні з актыўнай палітыкай на рынку працы.

У 1930-я гады былі праведзеныя некаторыя сацыяльныя рэформы, у тым ліку некалькі відаў падтрымкі сем'яў з дзецьмі, дапамога пры пэўных відах інваліднасці і закон, які ўстанавіў права на двухтыднёвы адпачынак. Аднак прапанову павялічыць дзяржаўную пенсію — абгрунтаваную, між іншым, тым,

што кожны трэці пенсіянер патрабаваў падтрымкі з фондаў дапамогі бедным, — Рыксдаг не ўхваліў. У гэтым пытанні Сялянскі саюз галасаваў разам з іншымі правымі партыямі. У выніку сацыял-дэмакратычны ўрад вясной 1936 года падаў у адстаўку, каб вярнуцца пасля перамогі на выбарах восенню таго ж года.

Неспакой на рынку працы працягваўся і ў 1930-я гады, з шматлікімі канфліктамі. З-за жорсткай лініі, якую займалі і наймальнікі, і — у процістаянні ім — камуністычныя групы («клас супраць класа»), прафсаюзы страчвалі сяброў, а экспартная прамысловасць — кліентаў. Пад пагрозай новага заканадаўства, якое сацыял-дэмакратычны ўрад лічыў сябе вымушаным разгледзець, Шведская канфедэрацыя прафсаюзаў (LO) і Шведская асацыяцыя наймальнікаў падпісалі дагавор пра ўрэгуляванне працоўных канфліктаў, вядомы як Сальтшёбадэнскае пагадненне. Асноўныя палажэнні гэтага дагавора дзейнічаюць і сёння.

Восенню 1939 года пачалася Другая сусветная вайна, і сацыял-дэмакратычны ўрад ператварыўся ў кааліцыю ўсіх партый Рыксдага, за выключэннем Камуністычнай партыі. Гэты кааліцыйны ўрад быў распушчаны ў 1945 годзе, і пасля яго ўтварыўся чыста сацыял-дэмакратычны ўрад.

Гады дзяржавы дабрабыту

(прыкладна 1945–1980)

ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ ПАСЛЯ заканчэння Другой сусветнай вайны часам называлі часам жніва: менавіта тады сацыял-дэмакраты змаглі ажыццявіць вялікія сацыяльныя рэформы, пра якія марылі і якія планавалі на працягу папярэдніх дзесяцігоддзяў. У выніку ўсё гэта склалася ў дзяржаву дабрабыту.

У дзяржавы дабрабыту было дзве асноўныя ўмовы. Па-першае, палітычная воля да справядлівага размеркавання дабрабыту. Па-другое, моцны эканамічны рост, які пачаўся пасля заканчэння вайны, калі прамысловая масавая вытворчасць пачала па-сапраўднаму даваць плён і калі шведская прамысловасць мела вельмі моцныя пазіцыі на сусветным рынку.

Сілу шведскай прамысловасці падмацоўвалі эканамічная палітыка і палітыка на рынку працы і — не ў апошнюю чаргу — формы супрацоўніцтва, якія выпрацавалі бакі рынку працы. Разам гэта дало пачатак «шведскай мадэлі» — паняццю, якое потым пашырылі і на палітыку дабрабыту.

У 1947 годзе былі ўведзеныя дзіцячая дапамога і павышэнне дзяржаўнай базавай пенсіі. У 1950 годзе Рыксдаг ухваліў рашэнне пра дзевяцігадовую абавязковую асноўную школу. Затым, у 1951 годзе, быў прыняты новы закон, які даў усім работнікам права на трохтыднёвы аплатны адпачынак. На працягу 1950-х гадоў паэтапна пашыралася страхаванне па хваробе. Былі ўведзеныя спецыяльныя дзяржаўныя субсідыі, каб павялічыць жыллёвае будаўніцтва і палепшыць якасць жылля.

Народная партыя (цяперашнія ліберaлы) і Сялянскі саюз (цяперашняя Партыя цэнтра) часта падтрымлівалі прапановы ўрада ў галіне палітыкі дабрабыту, тады як Правая партыя (цяперашняя Умераная партыя) раз за разам выступала супраць такіх прапаноў, у тым ліку супраць дзіцячай дапамогі і ўсеагульнага страхавання па хваробе. З другога боку, Сялянскі саюз і Народная партыя не заўсёды былі гатовыя плаціць большыя падаткі, патрэбныя для фінансавання такіх рэформаў. Асаблівы супраціў выклікалі падатак на капітал і падатак на спадчыну, а таксама пытанне падатку з продажаў на спажыванне (ранняй формы ПДВ).

Аднак адна з рэформаў дабрабыту выклікала ў 1950-я гады сур'ёзны палітычны канфлікт — гэта было пытанне агульнай дадатковай пенсіі (АТР) у дадатак да дзяржаўнай базавай пенсіі. На практыцы гэтая рэформа тычылася рабочых і ніжэйшых служачых: большасць вышэйшых служачых ужо мелі праз пагадненне права на дадатковую пенсію ад свайго наймальніка. Калі спроба ўвесці такое пагадненне для іншых катэгорый работнікаў правалілася з-за супраціву наймальнікаў, стала актуальным пытанне палітычнага рашэння.

З 1951 года ў Швецыі дзейнічаў кааліцыйны ўрад сацыял-дэмакратаў і Сялянскага саюза. Гэтыя дзве партыі па-рознаму глядзелі на дадатковую пенсію, і ўрад вырашыў вынесці пытанне на ўсенародны рэферэндум у 1957 годзе.

На рэферэндум былі вынесеныя тры супрацьлеглыя пазіцыі: пазіцыя сацыял-дэмакратаў за абавязковую, устаноўленую законам прафесійную пенсію і дзве правыя пазіцыі за добраахвотныя пенсійныя зберажэнні. Прапанова сацыял-дэмакратаў прадугледжвала фінансаванне праз абавязковыя ўнёскі наймальнікаў, якія плацяцца на карысць будучых пенсіянераў. Такое назапашванне капіталу ў грамадскай уласнасці было адной з прычын супраціву правых, якія бачылі ў гэтым форму сацыялізацыі. Пазней гэтыя фонды адыгралі важную ролю ў жыллёвым будаўніцтве.

Прапанова сацыял-дэмакратаў атрымала 47 працэнтаў галасоў, і кааліцыйны ўрад распаўся. Новы сацыял-дэмакратычны ўрад меншасці ў 1958 годзе ўнёс законапраект пра абавязковую прафесійную пенсію. Калі Рыксдаг яго адхіліў, спатрэбіліся новыя ўсеагульныя выбары.

На новых выбарах сацыял-дэмакраты атрымалі больш месцаў. Аднак новае галасаванне ў Рыксдагу скончылася б нічыёй, калі б не адзін з дэпутатаў Рыксдага ад Народнай партыі —

Турэ Кёнігсан. Ён быў металістам з Гётэборга і вырашыў устрымацца ад галасавання, нягледзячы на надзвычайны ціск з боку ўласнай партыі.

У 1950-я гады палітыку занятасці звязалі з палітыкай росту; гэта часам называюць мадэллю Рэна — Мейднера, паводле імёнаў двух яе архітэктараў, эканамістаў Шведскай канфедэрацыі прафсаюзаў Ёсты Рэна і Рудольфа Мейднера. І ў эканамічнай палітыцы, і ў палітыцы заробкаў прафсаюзаў была свядома праведзеная лінія: нерэнтабельныя кампаніі і састарэлыя галіны не павінны атрымліваць фінансавай падтрымкі. Лічылася, што ў інтарэсах грамадства і эканомікі, каб менш жыццяздольныя кампаніі зніклі і каб сродкі і рабочая сіла перайшлі ў кампаніі з лепшымі перспектывамі і з большай магчымасцю плаціць заробкі. Гэта дало пачатак развіццю мер прафесійнага навучання на рынку працы, якія дазвалялі людзям, што страцілі працу пры закрыцці кампаній, атрымаць кваліфікацыю для новых галін, што ўзнікалі.

Развіццё грамадскага сектара — найперш аховы здароўя і школ — вызначала палітыку дабрабыту ў 1960-я гады. Гэта азначала і большы попыт на рабочую сілу, і ў выніку больш жанчын выйшла на рынак працы. Гэта, у сваю чаргу, прывяло да значнага развіцця дашкольнага выхавання і догляду дзяцей — і да таго, што пытанне роўнасці жанчын і мужчын было ўключана ў парадак дня як сур'ёзнае.

Становішча работнікаў адносна наймальнікаў у 1970-я гады было ўмацавана некалькімі спосабамі. У 1973 годзе быў прыняты Закон аб абароне занятасці, у 1974 годзе — закон пра становішча прафсаюзных прадстаўнікоў, а ў 1976 годзе — Закон аб удзеле работнікаў у прыняцці рашэнняў на працоўным месцы. Арганізацыі наймальнікаў і бізнесу крытыкавалі новае заканадаўства, найперш Закон аб абароне занятасці

і Закон аб удзеле работнікаў у прыняцці рашэнняў на працоўным месцы, але правыя партыі ў Рыксдагу ў цэлым падтрымалі прапанову. Мадэраты таксама падтрымалі закон аб абароне занятасці. Пасля, у 1977 годзе, Рыксдаг прыняў узмоцнены Закон аб працоўным асяроддзі, прапанаваны ўрадам Фельдзіна з Партыі цэнтра.

У 1970-я гады розныя партыі ў асноўным сыходзіліся ў пытаннях працоўнага асяроддзя і ўплыву работнікаў. Гэтыя пытанні ацэньваліся з пункту гледжання работнікаў і з улікам іх інтарэсаў, а не інтарэсаў капіталістаў і наймальнікаў. У наступныя дзесяцігоддзі супраціў і палітыцы дабрабыту, і ўплыву ў працоўным жыцці рос па меры таго, як усё мацней праяўляліся новыя рынкава-ліберальныя плыні і як цэнтр увагі зрушваўся ад інтарэсаў работнікаў да інтарэсаў кампаній. Сёння правыя партыі адкрыта выступаюць за разбурэнне таго працоўнага заканадаўства, увядзенне якога яны калісьці падтрымалі.

Такім чынам, пытанні працоўнага заканадаўства ў гэты перыяд не былі прадметам вялікіх міжпартыйных канфліктаў. Затое сур'ёзныя рознагалоссі выклікала пытанне ўдзелу работнікаў у капіталізацыі кампаній. Прапанова пра асноўныя прынцыпы перадачы прыбыткаў у калектыўна ўласныя фонды работнікаў, ухваленая з'ездам LO ў 1976 годзе, выклікала некалькі гадоў усё больш варожага палітычнага канфлікту, у якім вельмі актыўную ролю адыгрывалі і арганізацыі наймальнікаў.

Канфлікт вакол фондаў работнікаў, як і канфлікт 1950-х гадоў вакол агульнай дадатковай пенсіі (ATP), можна лічыць самымі значнымі палітычнымі канфліктамі ў Швецыі ў другой палове XX стагоддзя: па сутнасці абодва тычыліся аднаго і таго ж — перадачы капіталу, а значыць, і права вырашаць, як распара-

джацца капіталам, ад бізнесу і кампаній да дзяржавы або да работнікаў як калектыўнай арганізацыі. Аргументы правых партый і бізнесу былі даволі падобнымі: і тыя, і другія бачылі ў грамадскім і (або) прафсаюзным кантролі над фінансаваннем інвестыцыйнага капіталу — а значыць, і над магчымасцю купляць акцыі прыватных кампаній — пагрозу свабоднаму прадпрымальніцтву, а з ім і дэмакратыі і свабодзе ў Швецыі ўвогуле.



Кухня ў кватэры часоў «народнага дома» (folkhemmet) — экспазіцыя Паўночнага музея (Nordiska museet) у Стакгольме

Для сацыял-дэмакратаў гэтая жорсткая кампанія з боку бізнесу азначала, што пытанне ўдзелу ў прыбытках ператварылася ў прынцыповае пытанне пра размеркаванне ўлады ў эканоміцы. Гэта, натуральна, узмацніла гатоўнасць змагацца. Аднак пытанне было складаным і эканамічна, і канцэптуа-

льна. Тое, што яно спарадзіла няпэўнасць унутры руху, стала відаць па перапрацаваных прапановах да двух першапачатковых з'ездаў партыі: адзіным вынікам стала прынцыповая згода на калектыўны ўдзел у прыбытках, але без згоды ў тым, як гэта павінна адбывацца на практыцы.

Складанасцяў было некалькі. Канцэптуальна рэформы працоўнага заканадаўства зыходзілі з прынцыпу, што права на ўплыў работнікаў дае сама праца — занятасць. Фонды ж абапіраліся на супрацьлеглы прынцып: уплыў павінен вынікаць з суўласнасці на капітал кампаній. Аднак гэта азначала, што па-за ўвагай заставаліся ўсе работнікі некамерцыйных арганізацый, у тым ліку ўвесь грамадскі сектар: удзел у прыбытках па азначэнні магчымы толькі на прадпрыемствах, якія прыносяць прыбытак. Спрачаліся і пра тое, ці пажадана змешваць інтарэсы капіталу з інтарэсамі работнікаў, робячы работнікаў адначасова і суўласнікамі, і наёмнымі работнікамі. Гэта ставіла пытанне, як такое паўплывае на гатоўнасць інвеставаць і на перамовы пра заробкі. Яшчэ адным пытаннем быў уплыў на новыя прадпрыемствы, а таксама тое, ці не прывядзе абавязковы ўдзел у прыбытках да таго, што кампаніі будуць пераносіць сваю дзейнасць і галаўныя офісы ў іншыя краіны.

У 1982 годзе Сацыял-дэмакратычная партыя вярнула сабе ўрадавую ўладу і ў 1983 годзе ўнесла законапраект, які паклаў канец спрэчцы пра фонды. У рамках сістэмы агульнай дадатковай пенсіі былі створаныя пяць фондавых праўленняў, у якія кампаніі павінны былі плаціць пэўны ўнёсак з прыбытку. Гэты капітал затым ішоў на куплю акцый — але не больш як васьмі працэнтаў усіх акцый адной кампаніі, — а даход перадаваўся ў пенсійную сістэму. Фондавыя праўленні былі ліквідаваныя ўрадам Більта пасля перамогі правых на выбарах 1991 года. Капітал фондаў быў перададзены част-

кова шэрагу навуковых фондаў, а часткова назад у пенсійную сістэму.

Перыяд пераменаў

(прыкладна з 1980 года да нашага часу)

ГАДЫ БАРАЦЬБЫ, ГАДЫ прарыву, гады дзяржавы дабрабыту — усе гэтыя перыяды можна апісаць як наступальныя: у гэты час рабочы рух ішоў наперад і кіраваў развіццём у свой бок. Шведская Сацыял-дэмакратычная партыя і прафсаюзны рух умацоўваліся арганізацыйна, а сацыял-дэмакраты знаходзіліся ва ўрадзе з 1932 па 1976 год — за выключэннем некалькіх месяцаў летам 1936 года, — хоць часцей за ўсё без большасці ў Рыксдагу. За гэты доўгі перыяд шведскае грамадства істотна змянілася, і гэтыя змены глыбока закранулі эканоміку і сацыяльную структуру, а таксама погляды і каштоўнасці.

З канца 1970-х гадоў гэтая тэндэнцыя павярнула ў іншы бок. На міжнародным узроўні ўзмацняліся моцныя інтарэсы капіталу, а разам з імі і звязаныя з імі палітычныя рухі. Яны ўсё больш уплывалі на ўмовы для нацыянальнай шведскай палітыкі. Адной з ключавых перадумоў сацыял-дэмакратычнай палітыкі дзяржавы дабрабыту была здольнасць уплываць на капіталаўкладанні і патокі капіталу ў межах нацыянальнай дзяржавы — праз грашова-крэдытную і фінансавую палітыку, праз падаткі і палітыку размеркавання, а таксама праз моцныя прафсаюзныя арганізацыі, якія ўраўнаважвалі інтарэсы прадпрыемстваў на рынку працы. Развіццё падзей з 1980-х гадоў азначала, што гэтая здольнасць у цэлым аслабла: інтарэсы капіталу здолелі вырвацца з-пад кантролю нацыянальнай палітыкі.

У апошнія дзесяцігоддзі сацыял-дэмакраты апынуліся ў абарончай пазіцыі як у Швецыі, так і ў астатняй Еўропе. Частка ранейшых здабыткаў партыі была страчаная, і гэта асабліва выразна выявілася ў гады правага ўрада пачынаючы з 2006 года.

Калі мы хочам зразумець магчымасці і цяжкасці сацыял-дэмакратычнай палітыкі ў рэальным жыцці і ў сённяшнім свеце, нам трэба таксама зразумець, чаму наступальная пазіцыя першых трох перыядаў была зламаная і ператварылася ў абарончую дзесьці на пачатку 1990-х гадоў.

Змены заўсёды адбываюцца паэтапна, і можа прайсці час, перш чым становіцца зразумела, што яны насамрэч азначаюць і якая новая палітыка патрэбная. Значная частка ўнутранай дыскусіі ў Сацыял-дэмакратычнай партыі ў 1980-я гады датычылася таго, як вытлумачыць новую рэчаіснасць. Прайшоў пэўны час, перш чым стала ясна, што гаворка ідзе пра вялікія змены ў глыбінных умовах вытворчасці, якія фармуюць эканоміку і ўплываюць на грамадства. Пакуль дыскусія працягвалася, было цяжка сур'ёзна ўзяцца за задачу выпрацоўкі новай палітыкі, здольнай адстойваць класічныя каштоўнасці ў новых матэрыяльных умовах.

Сутыкнуўшыся са зменамі перадумоў, сацыял-дэмакраты не заўсёды ўсё як след прадумвалі і часам крыху губляліся. Аднак трэба разумець, што адбыліся сапраўдныя матэрыяльныя змены палітычных умоў, з-за якіх ранейшыя паспяховыя палітычныя метады аслаблі, а часам і зусім сталі немагчымымі. Без такога разумення цяжка выйсці з абарончай пазіцыі і выпрацаваць эфектыўную сацыял-дэмакратычную палітыку, адпаведную сённяшняй рэчаіснасці.

Адпраўны пункт нашага аналізу развіцця апошніх дзесяцігоддзяў — гістарычны матэрыялізм, гэта значыць тэзіс, што пра-

дукцыйныя сілы — эканамічныя структуры, эканамічныя адносіны ўлады, тэхналагічнае развіццё — адыгрываюць цэнтральную ролю таксама для грамадскай і сацыяльнай арганізацыі і для поглядаў і каштоўнасцяў у гэтым грамадстве. Мы пачынаем аналіз з агляду палітычнага зруху ў Швецыі з 1980-х гадоў, а потым змяшчаем яго ў кантэкст глыбінных змен у свеце.

Нестабільны парламент: новыя партыі і частыя змены ўрада

У 1976 годзе доўгае знаходжанне сацыял-дэмакратаў ва ўрадзе скончылася. За гэтым настаў перыяд адносна частых змен урада, калі правыя кааліцыі чаргаваліся з сацыял-дэмакратамі, якія ў свабодных формах супрацоўнічалі з іншымі партыямі. Варта адзначыць, што да 1994 года ўключна тэрмін паўнамоцтваў складаў тры гады, а потым — чатыры.

Змянілася і партыйная структура: на нацыянальным узроўні з'явілася больш новых партый. Тры з іх сёння прадстаўленыя ў Рыксдагу: хрысціянскія дэмакраты (KD), заснаваныя ў 1964 годзе; шведская Партыя зялёных (MP), заснаваная ў 1981 годзе; і Шведскія дэмакраты (SD), заснаваныя ў 1988 годзе. Чацвёртая партыя, «Новая дэмакратыя», мела месцы ў Рыксдагу з 1991 па 1994 год, але ў палітыцы больш не ўдзельнічае. Яшчэ дзве партыі — Піратская партыя, заснаваная ў 2006 годзе, і «Фемінісцкая ініцыятыва» — мелі сваіх прадстаўнікоў у Еўрапейскім парламенце, але на выбарах у Рыксдаг ніколі не пераадольвалі парог, неабходны для атрымання месцаў.

На муніцыпальным узроўні ўжо некалькі дзесяцігоддзяў існуе вялікая разнастайнасць мясцовых партый.

З 1976 па 1982 год урадамі кіравалі правыя ў розных складах — з адной, дзвюх або трох партый; канфлікты паміж імі не раз выклікалі ўрадавыя крызісы. Галоўнымі ўнутранымі спрэчкамі былі развіццё атамнай энергетыкі і падатковая сістэма. Рознагалоссі наконт атамнай энергетыкі прывялі ў 1978 годзе да распаду кіруючага трохпартыйнага ўрада. У знак пратэсту супраць Партыі цэнтра, якая парушыла кааліцыйнае пагадненне, мадэраты заблакавалі фармаванне новага правага ўрада. У выніку сацыял-дэмакраты, устрымаўшыся пры галасаванні ў Рыксдагу, адкрылі шлях ліберальнаму ўраду меншасці. Пасля выбараў 1979 года быў сфармаваны новы трохпартыйны правы ўрад. Мадэраты выйшлі з гэтага ўрада ў 1981 годзе, пасля таго як сацыял-дэмакраты і Народная партыя падпісалі пагадненне па некаторых падатковых пытаннях, і ў выніку Народная партыя і Партыя цэнтра сфармавалі сумесны ўрад.

Прынцыпы палітыкі дабрабыту ў перыяд правага ўрада не змяніліся; наадварот, правы ўрад падкрэсліваў, што падтрымлівае далейшыя сацыяльныя рэформы, хоць і «без сацыялізму». У эканамічным плане гэты перыяд быў поўны вялікіх праблем для базавых галін шведскай прамысловасці, і трохпартыйны правы ўрад нават часова нацыяналізаваў шведскую сталеліцейную прамысловасць. У цэлым шведская прамысловасць сутыкнулася з больш жорсткай міжнароднай канкурэнцыяй з боку новых індустрыяльных краін, што толькі набіралі сілу. Атамная энергетыка заставалася прадметам пастаянных спрэчак, і ў 1980 годзе гэта прывяло да ўсеагульнага рэферэндуму, які на некалькі наступных дзесяцігоддзяў стаў асновай энергетычнай палітыкі.

На выбарах 1982 года Сацыял-дэмакратычная партыя вярнулася да ўлады, але атрымала ў спадчыну вялікі дэфіцыт дзяр-

жаўнага бюджэту і — для таго часу — вельмі высокае беспрацоўе. За наступныя некалькі гадоў Сацыял-дэмакратычнай партыі ўдалося ліквідаваць дэфіцыт, а занятасць істотна выраслa. Аднак у другой палове 1980-х гадоў зноў і зноў узрастала інфляцыя і нарастала эканамічная нестабільнасць, што вымушала прымаць шэраг тэрміновых надзвычайных мер.

Таму магчымасці для рэформ у сферы дабрабыту былі абмежаваныя, і частку гэтых магчымасцяў давялося скіраваць на рост выдаткаў на ўжо існуючыя абавязацельствы. Тым не менш некаторыя важныя паляпшэнні былі зроблены. Дзіцячыя садкі сталі даступнымі для ўсіх, адукацыя дарослых палепшылася, а ўкладанні ў вышэйшую адукацыю павялічыліся.

Падатковая сістэма была грунтоўна рэфармаваная. Гэтая рэформа выклікала спрэчкі ўнутры партыі, але яна адкрыла шлях да значна больш узгодненага, неінфляцыйнага фарміравання заробкаў, якое пераважае з 1990-х гадоў. Да таго ж гэта — у адрозненне ад высокага намінальнага росту 1980-х гадоў — азначала сапраўднае павышэнне заробкаў. Падаткаабкладанне капіталу стала больш жорсткім, бо яно грунтавалася на базавым прынцыпе, што капітал і зароблены даходы павінны абкладацца падаткамі па аднолькавых стаўках; гэта азначала, што на практыцы больш нельга было карыстацца ранейшымі магчымасцямі зніжаць падаткі, напрыклад, пераносячы даход з адной падатковай крыніцы ў іншую. З-за такіх магчымасцяў, як і з-за ранейшага права на 100-працэнтны вылік працэнтных выдаткаў, сістэма на практыцы была значна менш прагрэсіўнай, чым паказвалі самі шкалы падатковых ставак. Аднак пазнейшыя змены падатковай сістэмы зноў вярнулі магчымасць пераносіць грошы паміж рознымі шкаламі падатку на даходы.

1980-я гады пачаліся з сапраўдных праблем з фінансаваннем у сферы дабрабыту, якая на той час стала ўжо вельмі шырокай. Залішне жорсткія правілы крытыкавалі, а грамадзяне ўсё больш патрабавалі шырэйшага выбару і большай разнастайнасці грамадскіх паслуг. Не ў апошнюю чаргу левыя крытыкавалі тое, што, на іх думку, было залішняй бюракратыяй і недастатковым уплывам грамадзян. Для змен былі важкія прычыны, і дыскусія, якая разгарнулася ў 1980-я гады, была інтэнсіўнай. Сацыял-дэмакраты і часткова Партыя цэнтра лічылі, што адна з частак рашэння — дэцэнтралізацыя на карысць муніцыпалітэтаў. Сацыял-дэмакраты таксама абмяркоўвалі розныя формы пашырэння свабоды выбару ў межах захавання грамадскага кіравання школамі, аховай здароўя і паслугамі апекі, але ў партыі па гэтых пытаннях не было адзінства.

Мадэраты перш за ўсё выступалі за тое, каб адкрыць фінансаваную з падаткаў сферу дабрабыту для прыватных прадпрыемстваў, захаваўшы пры гэтым фінансаванне з падаткаў. Такія ідэі моцна падтрымлівалі гаспадарчыя суб'екты, якія імкнуліся выйсці на рынак дабрабыту з яго высокім патэнцыялам прыбытку. У гэтым пытанні таксама дамінавала эканамічная дыскусія, якая ў той час лічыла рынкавыя рашэнні больш эфектыўнымі за палітычныя інструменты.

У 1991 годзе сацыял-дэмакраты зноў прайгралі ўсеагульныя выбары. Усяго праз некалькі месяцаў пасля прыходу да ўлады, восенню 1991 года, правы ўрад — без якога-небудзь папярэдняга аналізу — правёў вялікую змену ў фінансаваных з падаткаў паслугах дабрабыту (ахова здароўя, школы, апека), адкрыўшы іх для прыватных пастаўшчыкоў паслуг. Спачатку гэтыя змены не мелі вялікага ўплыву, але па меры таго як прыбытковыя прыватныя прадпрыемствы павялічвалі сваю

долю, наступствы, асабліва ў адукацыі, аказаліся праблемнымі.

Эканамічны ўздым да восені 1991 года пачаў змяняцца спадам, аднак новы правы ўрад не змог адпаведна адаптаваць сваю эканамічную палітыку, а да таго ж няправільна ацаніў валютныя хваляванні з яўнымі прыкметамі спекуляцыі супраць шведскай кроны. У выніку восенню 1992 года пачаўся сур'ёзны эканамічны крызіс. За наступныя некалькі гадоў беспрацоўе вырасла да рэкордных узроўняў — больш за 13 працэнтаў, — і адначасова рэзка ўзрос дэфіцыт дзяржаўных фінансаў.

Перамогшы на выбарах 1994 года, сацыял-дэмакраты зноў сфармавалі ўрад. На той час было абсалютна неабходна скараціць вялікі бюджэтны дэфіцыт, павысіўшы падаткі і скараціўшы выдаткі. Каб дасягнуць гэтага, патрабаваліся такія вялізныя сумы, што немагчыма было пазбегнуць далейшых скарачэнняў у палітыцы дабрабыту, якую выпрацавалі самі сацыял-дэмакраты.

Да канца 1990-х гадоў сацыял-дэмакраты аднавілі збалансаваны бюджэт, а беспрацоўе знізілася прыкладна да чатырох працэнтаў. У наступныя гады эканоміка заставалася адносна стабільнай, хоць слабейшая эканамічная кан'юнктура на мяжы тысячагоддзяў выклікала новы рост беспрацоўя. Потым, калі кан'юнктура палепшылася, занятасць расла толькі павольна, і няпэўнасць наконт занятасці адыграла вялікую ролю ў тым, што нядаўна створаны правы «Альянс» чатырох партый выйграў выбары 2006 года і атрымаў уласную большасць у Рыксдагу.

Гэты альянс утрымаў уладу і на выбарах 2010 года, але страціў большасць у Рыксдагу. Правапапулісцкія Шведскія дэмакраты апынуліся ў Рыксдагу ў ролі сілы, ад якой залежала большасць, і працягвалі атрымліваць усё больш месцаў на выбарах

як 2014, так і 2018 года. У 2014 годзе быў сфармаваны чырвона-зялёны ўрад меншасці з сацыял-дэмакратаў і Партыі зялёных пры пэўнай падтрымцы Левай партыі. Пасля выбараў 2018 года гэтая кааліцыя працягнула працу пры абмежаванай падтрымцы Партыі цэнтра і лібералаў па асобна ўзгодненых пытаннях. У выніку гэта прывяло да распаду альянсу. Пасля гэтага мадэраты і хрысціянскія дэмакраты зрушыліся ў больш кансерватыўны бок. Партыя цэнтра і лібералы па-ранейшаму падкрэсліваюць больш ліберальныя каштоўнасці, хоць хутчэй у эканамічным, чым у сацыяльным сэнсе.



Зала пасяджэнняў шведскага Рыксдага ў Стакгольме, 2019 год

Паварот управа

У адрозненне ад палітыкі правага ўрада 1976–1982 гадоў новы «Альянс» прынёс з сабой вялікія прынцыповыя змены ў параў-

нанні з палітыкай сацыял-дэмакратаў. Гэта ілюструе той ідэйны зрух, які адбыўся з 1990-х гадоў не толькі ў Швецыі, але і ва ўсім заходнім свеце.

Ранейшы прынцып збору падаткаў — «падатак паводле плацежаздольнасці» — на практыцы быў скасаваны. Абгрунтоўвалася гэта тым, што падатковая сістэма павінна быць пабудаваная так, каб уплываць на эканамічныя паводзіны грамадзян, перш за ўсё на прапанову працы. Для розных відаў даходу ўвялі розныя шкалы падатковых ставак: пенсіі і выплаты са страхавання па хваробе і па беспрацоўі абкладаліся па вышэйшых стаўках, чым заробкі. Розныя стаўкі ўвялі для таго, каб мець аплатную працу заўсёды было выгадней, чым не мець яе. Падатак на капітал скасавалі, а падатак на нерухомасць замянілі зборам, які не спаганяецца звыш пэўнай мяжы, — іншымі словамі, падаткаабкладанне больш не адпавядала ацэначнай вартасці нерухомасці. На практыцы гэта азначала зніжэнне падаткаў на нерухомасць з высокай рынкавай вартасцю, тады як зборы за нерухомасць сярэдняй і нізкай вартасці засталіся на ранейшым узроўні.

Быў скасаваны і кіруючы прынцып для дапамогі па хваробе і па беспрацоўі і для кампенсацыі страчанага даходу. Як і ў выпадку са зменай падатку на даходы, гэтыя папраўкі праводзіліся не праз выразна сфармуляваныя рашэнні аб новых прынцыпах. Замест гэтага ўвялі шэраг новых правілаў, якія фактычна азначалі паступовую адмову ад кампенсацыі страчанага даходу, але публічна пра гэта не абвяшчалася.

У цэлым палітыку ўрада «Альянсу» можна апісаць як заснаваную на ідэі эканамічных стымулаў — гэта значыць на ўяўленні, што паводзінамі людзей можна кіраваць, правільна суадносячы эканамічныя ўзнагароды і эканамічныя санкцыі. У прынцыпе гэта азначае перанос рынкавых цэнавых механі-

змаў у падатковую сістэму і сістэму дабрабыту: калі «купляць» дапамогу па хваробе і па беспрацоўі, напрыклад, будзе занадта дорага, людзі самі паклапоцяцца пра тое, каб заставацца здаровымі і знайсці працу. Гэта азначала і змену перспектывы: знешнія чыннікі, такія як тэхналагічнае развіццё, рынкавая кан'юнктура, змены ў міжнароднай канкурэнцыі і ўмовы працоўнага жыцця, як тлумачэнні беспрацоўя былі адсунутыя на другі план, а беспрацоўе і працяглыя адпачынкі па хваробе пачалі разглядаць як пытанні, звязаныя з асабістай гатоўнасцю чалавека працаваць і з яго памкненнямі.

Працоўнае заканадаўства таксама змякчылі, дазволіўшы найманьнікам браць работнікаў на часовыя і няўстойлівыя пасады.

Чаму партыйная сістэма і палітыка так істотна змяніліся?

Сацыял-дэмакратычная палітыка дабрабыту, якая склалася ў гады дзяржавы дабрабыту, грунтавалася на шэрагу каштоўнасцяў, звязаных з роўнасцю: ахова здароўя і апека паводле патрэбы, эканамічная абарона ў выпадку хваробы і беспрацоўя, забяспечаная старасць, уплыў на ўласную працу — для ўсіх, а не толькі для некаторых. Аднак адной з ключавых глыбінных перадумоў такой палітыкі была моцная эканоміка, якая стварала ўсё большыя рэсурсы для размеркавання.

Некаторыя з гэтых перадумоў былі створаныя палітычнымі сродкамі. Сярод іх — палітыка ў сферы адукацыі і рынку працы, якая спрыяла высокаму і стабільнаму ўзроўню кваліфікацыі работнікаў і ўстойліваму росту прадукцыйнасці — а таксама гатоўнасці прымаць тыя змены ў працоўным жыцці, якіх патрабавала тэхналагічнае развіццё. Аднак некаторыя перадумовы залежалі ад знешніх чыннікаў, напрыклад ад спрыя-

льнага становішча шведскіх экспартных тавараў на міжнародным рынку.

Адной з важных перадумоў усёй палітыкі дзяржавы дабрабыту была магчымасць кантраляваць на нацыянальным узроўні працэнтныя стаўкі, крэдытныя рынкі і трансгранічныя валютныя аперацыі. Для гэтага, вядома, патрэбная была палітычная воля ажыццяўляць такі кантроль, але гэтак жа відавочна — і тое, каб такі кантроль быў фактычна магчымы.

У 1970-я гады ўсе гэтыя перадумовы пачалі мяняцца так, што ўмовы для сацыял-дэмакратычнай палітыкі пагоршыліся.

- Міжнародная валютная сістэма абрынулася. Гэта прывяло да працяглага перыяду валютнай нестабільнасці, а часам і да прамых фінансавых атак на валюты асобных краін.
- Да 1970-х гадоў існаваў палітычны кансэнсус — як на міжнародным узроўні, так і паміж усімі партыямі, — што фінансавая сістэма патрабуе рэгулявання. Аднак на пачатку 1980-х гадоў ЗША і Вялікабрытанія пачалі дэрэгуляцыю фінансавых рынкаў. Гэтыя меры грунтаваліся на неаліберальнай эканамічнай тэорыі, якая ўзнікла ў 1970-я гады, але былі таксама спосабам прыстасавацца да фактычнага развіцця, калі растучыя глабальныя рынкі капіталу і міжнародныя карпарацыі на практыцы рабілі кантроль над валютамі і працэнтнымі стаўкамі на нацыянальным узроўні цяжкім. Капіталізм зноў усталёўваў свае ўласныя правілы.
- Кейнсіянская палітыка эканамічнага стымулявання ўсё часцей не магла ўтрымаць узровень занятасці ў час спадаў, што вяло да росту выдаткаў і павелічэння дэфіцыту. Гэта вымусіла многія краіны пераходзіць да перыядаў палітыкі жорсткай эканоміі. Слабы рост у краінах, важных для шведскага экспарту, таксама адбіўся на шведскай эканоміцы.

- Шведская прамысловасць сутыкнулася з усё больш жорсткай канкурэнцыяй, калі з'явіліся новыя індустрыяльныя краіны, здольныя пастаўляць тавары такой жа высокай тэхнічнай якасці, але з меншымі выдаткамі на працу.
- Рынак працы змяніўся. Колькасць занятых у вытворчай прамысловасці скарачалася, а колькасць працоўных месцаў у сферы паслуг расла. Сфера паслуг па самой сваёй прыродзе больш працаёмкая, чым прамысловасць, таму зрух на рынку працы азначаў больш павольны рост прадукцыйнасці і, як вынік, эканамічнага росту. Гэта, у сваю чаргу, звужала магчымасці для рэформ у сферы дабрабыту.

Змены былі і эканамічнымі, і сацыяльнымі, бо змена эканамічных структур азначае змену ўмоў жыцця грамадзян і, у сваю чаргу, змену таго грамадства, у якім мы жывём. Гэтыя змены паўплывалі на ўзоры мыслення, каштоўнасці і погляды, якія, як і новыя эканамічныя ўмовы, адбіліся на палітычным жыцці. Карацей кажучы, змены ўмацавалі інтарэсы капіталу за кошт рабочага класа, пайшлі на карысць эканамічна мацнейшым групам і на шкоду эканамічна слабейшым. Набылі сілу ідэі пра карысць, калі не сказаць неабходнасць, эканамічнай няроўнасці, а значэнне сацыяльных чыннікаў для жыццёвых шанцаў чалавека адсунулі аргументы, якія вылучаюць на першы план асабістыя памкненні. Палітыкі маюць менш магчымасцяў уплываць на эканоміку, а сфера дзеяння рынкавых механізмаў пашырылася.

Як вынік, сацыяльная няроўнасць таксама паўсюдна выросла: на працы, у школах, на рынку жылля, у эканамічным плане і ў тым, што датычыць будучых магчымасцяў дзяцей і падлеткаў.

Будучыня?

ПАПЯРЭДНІЯ РАЗДЗЕЛЫ прысвечаныя гісторыі і маюць пераважна апісальны характар, з некаторымі каментарамі наконт апошніх дзесяцігоддзяў пад асобнымі загалоўкамі. Будучыню па самім вызначэнні нельга апісаць — яе можна толькі абмяркоўваць. Таму апошні раздзел гэтай кнігі мы прысвячаем нашаму погляду на сённяшняе становішча і нашаму разуменню таго, якім шляхам сацыял-дэмакраты могуць пайсці ў будучыні.

Ідэалагічная спадчына сацыял-дэмакраты

Што такое ідэалогія?

«ІДЭАЛОГІЯ» ВЫЗНАЧАЕЦЦА як «сукупнасць ідэй». Гэты тэрмін часта ўжываюць у дачыненні да каштоўнасцяў, але класічныя палітычныя ідэалогіі — кансерватызм, лібералізм і сацыялізм — уключаюць таксама ўяўленні пра тое, як павінны быць арганізаваныя грамадства і эканоміка. Такім чынам, развітая палітычная ідэалогія складаецца з дзвюх частак. Па-першае, гэта ўяўленні пра каштоўнасці, якія павінны ляжаць у аснове грамадства і ўмоў жыцця асобных людзей. Па-другое, гэта аналіз грамадства і грамадская тэорыя — уяўленні пра тое, якія механізмы кіруюць развіццём грамадства і як іх трэба фармаваць або змяняць, каб гэтыя каштоўнасці ажыццявіць.

Асноўныя каштоўнасці сацыял-дэмакратыі першапачаткова выказваў дэвіз Французскай рэвалюцыі — вольнасць, роўнасць і братэрства. Дзеля роўнасці полаў слова «братэрства» пазней замянілі на «салідарнасць». Больш сучаснае слова для «вольнасці» — «свабода». Гэтыя тры паняцці, у сваю чаргу, можна абагульніць словам «дэмакратыя», бо сапраўдная дэмакратыя і патрабуе, і спараджае свабоду, роўнасць і салідарнасць.

Сацыял-дэмакратычны аналіз грамадства абапіраецца на матэрыялістычнае разуменне гісторыі: тое, як арганізаваныя эканоміка і працоўнае жыццё, мае вырашальнае значэнне і для таго, якім становіцца грамадства, а змены ў сферы вытворчасці ланцуговым чынам адбіваюцца на грамадскіх структурах.

Каштоўнасці паказваюць нам кірунак руху, шлях да грамадства, якім яно павінна быць. Аналіз грамадства дае нам адп-

раўны пункт — механізмы, якія трэба змяніць, і перадумовы, неабходныя, каб гэтага дасягнуць.

Аналіз грамадства

Гістарычны матэрыялізм і канфлікты інтарэсаў

ГІСТАРЫЧНА-МАТЭРЫЯЛІСТЫЧНЫ ПОГЛЯД азначае, што матэрыяльныя фактары — у дадзеным выпадку тэхналогіі, умовы вытворчасці і эканамічная ўлада — лічацца вырашальнымі і для арганізацыі грамадства, а значыць, і для магчымасці ажыццявіць такія каштоўнасці, як свабода і роўнасць. З гэтым звязана тое, што сацыял-дэмакраты з моманту заснавання партыі падкрэслівалі пытанні эканамічнай улады, а не толькі палітычнай дэмакратыі. Як арганізаваная праца, хто вызначае ўмовы працы і працоўны час і як размяркоўваюцца рэсурсы, створаныя ў сферы вытворчасці, — усё гэта вырашальныя фактары для ўмоў жыцця ў грамадстве ўвогуле.

Калі працоўнае жыццё падзелена на начальнікаў і падначаленых, на людзей з уладай і людзей без яе, на тых, хто вырашае за іншых, і тых, каму не дазволена вырашаць за сябе, гэта не толькі вядзе да вялікай няроўнасці ўмоў жыцця. Гэта яшчэ і фармуе ўяўленне, што адзін чалавек мае большую каштоўнасць, чым іншы, і больш важны для грамадства, — уяўленне, якое можа адлюстроўвацца ў грамадскім і палітычным жыцці. Калі мы хочам палітычнай дэмакратыі з цалкам самастойнымі грамадзянамі, у нас не можа быць працоўнага жыцця, дзе пануюць несамастойныя работнікі, якія толькі выконваюць загады, — іх выкарыстоўваюць проста як дэталі машыны і ставяць туды, куды наймальнік адвольна вырашыць.

Гэты гістарычна-матэрыялістычны погляд узыходзіць да Карла Маркса, хоць ён быў не адзіны, хто яго распрацоўваў.

На думку Маркса, гістарычнае развіццё было бесперапыннай барацьбой за ўладу над сферай вытворчасці і над размеркаваннем вынікаў вытворчасці, з непазбежным канфліктам інтарэсаў паміж групамі, якія мелі ўладу, і групамі, якія яе не мелі.

Гэты канфлікт інтарэсаў з'яўляецца часткай і сацыял-дэмакратычнага аналізу грамадства, дзе ён апісваецца як канфлікт паміж працай і капіталам, але ў больш нюансаванай форме. Інтарэсы абедзвюх груп часткова супадаюць: абедзве зацікаўленыя ў паспяховай вытворчасці, якая стварае дастаткова рэсурсаў для дабрабыту. Сутыкацца гэтыя інтарэсы могуць тады, калі ўзнікае пытанне, як павінна весціся гэтая вытворчасць і як размяркоўваюцца яе вынікі.

Канфлікты інтарэсаў паміж працай і капіталам зусім не абавязкова лічыць шкоднымі па вызначэнні. Наадварот, пры правільным выкарыстанні яны могуць спараджаць дынаміку, карысную для эканомікі і гаспадаркі, бо яна патрабуе рацыянальнага выкарыстання абодвух фактараў вытворчасці — капіталу і працы. Калі няма нікога, хто сочыць, каб капітал расходаваўся эфектыўна, вынікам будзе знішчэнне эканамічных рэсурсаў. Калі няма нікога, хто мае сілу абараніць інтарэсы работнікаў — разумны працоўны час, бяспечныя ўмовы працы і заробкі, на якія можна жыць, — вынікам будзе страта людзей.

Тое, што ў канфлікце інтарэсаў паміж працай і капіталам сацыял-дэмакратыя стаіць на баку інтарэсаў працы, не абавязкова азначае, што яна адмаўляе значэнне інтарэсаў капіталу. Гаворка хутчэй пра тое, каб не дазволіць інтарэсам капіталу дамінаваць над іншымі ўдзельнікамі і іншымі інтарэсамі ў эканамічным жыцці, гэта значыць эксплуатаваць іх.

Палітыка дабрабыту і фарміраванне заробкаў заўсёды павінны ўлічваць эканамічныя рэаліі, такія як выдаткі і канкурэнцыя ў навакольным свеце. Аднак такія меркаванні трэба адрозні-

ваць ад патрабаванняў улічваць прыватныя інтарэсы прыбытку кампаній і капіталістаў. Нельга ставіць знак роўнасці паміж такімі прыватнымі эканамічнымі інтарэсамі і тым, што найлепш для грамадства ў цэлым. Крытыка эканамічнага мыслення апошніх дзесяцігоддзяў зводзіцца якраз да таго, што такі знак роўнасці ставіўся.

Індустрыялізм і глабалізацыя — два прыклады матэрыяльных змен, якія змянілі грамадства

Калі людзі перасяляліся з вёсак і мястэчак у прамысловыя пасёлкі і гарады, змянялася не толькі іх працоўнае жыццё. Яны стваралі новы лад жыцця, ставілі новыя патрабаванні да грамадскіх інстытутаў, такіх як ахова здароўя, і патрабавалі адукацыі для ўсіх. Спатрэбіліся новыя формы гаспадарчага заканадаўства і новая падатковая сістэма, якая ўжо не грунтавалася на землеўласнасці. Гэта адкрыла шлях новым эканамічна значным слаям з большым палітычным уплывам — дырэктарам кампаній, тэхнікам і прадпрымальнікам, — тады як вышэйшы клас землеўласнікаў губляў уладу.

Індустрыяльнае грамадства сфармавала новыя адносіны паміж работнікам і наймальнікам, не такія, як у сялянскай супольнасці. Узніклі новыя тыпы працоўных месцаў, дзе вялікія групы работнікаў маглі арганізоўвацца і змагацца за свае інтарэсы зусім інакш, чым гэта было магчыма для маладых парабкаў і служанак. Гэтыя групы паступова прасоўвалі змены ва ўсёй палітычнай арганізацыі — і ў маштабах краіны, і ў мясцовых супольнасцях.

Рабочы рух узнік як форма пратэсту супраць беднасці і несправядлівасці ранняга індустрыяльнага грамадства. Гэта быў не першы раз, калі бедныя і прыгнечаныя людзі паўставалі супраць нястачы і няроўнасці: гісторыя ведае шмат такіх прык-

ладаў — паўстанні рабоў у старажытнасці, сялянскія бунты ў Сярэднявеччы. Аднак такія паўстанні заўсёды падаўляліся і ніколі не давалі трывалых вынікаў. Рабочы рух стаў першым рухам за сацыяльнае вызваленне, якому сапраўды ўдалося дабіцца больш устойлівых змен у грамадстве.



■ «Са страйку ў Норбергскай горнай акрузе 13–23 красавіка»: малюнкі Карла Чэліна ў «Ny Illustrerad Tidning» ад 2 мая 1891 года — уверсе кіраўнік страйку Кварнстрэм і страйкоўцы каля рудніка Мосгруван, унізе возера Нурэн і вартавы

Прычына была ў тым, што тэхнічнае развіццё XVIII і XIX стагоддзяў упершыню ў гісторыі зрабіла магчымым рост дабрабыту для ўсіх. А калі гэта стала магчымым, ужо немагчыма было супрацьстаяць сіле патрабаванняў вялікіх груп насельніцтва выраўнаваць велізарную на той час няроўнасць у размеркаванні як улады, так і рэсурсаў.

Або, словамі Карла Маркса з працы *«Да крытыкі палітычнай эканоміі»*: «Змены ў эканамічнай аснове раней ці пазней вядуць да перавароту ва ўсёй велізарнай надбудове».

Лічбавізацыя і глабальныя фінансавыя рынкі ўяўляюць сабой менавіта такую ўсеахопную змену прадукцыйных сіл, якая вядзе і да змен у грамадскіх структурах, працоўным жыцці, ладзе мыслення — і ў суадносінах улады.

- Вытворчасць глабалізавалася: вырабляць прадукцыю ў асноўным можна ў любым месцы свету, а канчатковыя вырабы складаюцца з камплектуючых ад мноства розных субпадрадчыкаў, часта з розных краін. Фінансавыя рынкі набралі сілу і ствараюць уласны прырост вартасці незалежна ад вытворчасці. Магчымасці нацыянальнай дзяржавы ўплываць на рух і размяшчэнне капіталу прыкметна знізіліся, што паслабіла інструменты эканамічнай палітыкі. Нестабільнасць на фінансавых рынках узрасла, і вынікам сталі паўторныя фінансавыя крызісы.
- Буйныя прамысловыя прадпрыемствы ўсё часцей саступаюць месца меншым і больш раздробленым галінам сферы паслуг. Патрабаванні да ведаў у працоўным жыцці сталі вышэйшыя — як для рабочых, так і для служачых. Сёння прафесійны поспех вялікіх груп людзей вызначаецца індывідуальнымі дасягненнямі, а не калектыўнай сілай на перамовах. У некаторых галінах сапраўдны найм замяніла праца па кантракце: самазанятыя / прадпрымальнікі выконваюць абмежаванае ў часе заданне, а потым пераходзяць да іншага задання для іншага наймальніка. З так званай эканомікай сумеснага карыстання гэтае развіццё зрабіла яшчэ адзін крок: кліенты купляюць паслугі не праз кампанію, а наўпрост у асобных пастаўшчыкоў, з якімі звязваюцца праз лічбавыя платформы.

- У выніку глабалізацыі вытворчасці і рынкаў капіталу ў спалучэнні са зменамі на самім рынку працы прафсаюзы аслаблі і цяпер менш здольныя быць дастаткова моцнай процівагай інтарэсам капіталу. Адзін з вынікаў гэтага — напрыклад, рост колькасці няўстойлівых працоўных месцаў.

Такім чынам, гістарычна-матэрыялістычны падыход важны для разумення сённяшняга дня, і не ў апошнюю чаргу новых палітычных умоў, якія ўзніклі ў выніку змен, што адбыліся з класічным індустрыяльным грамадствам, глабалізацыі і ўсеахопнага ўплыву інфармацыйных тэхналогій на вытворчасць, камунікацыю і палітыку. З-за гэтых змен у сацыял-дэмакратычнай палітыкі сёння іншыя перадумовы, чым у 1960-я гады, і ўсе дыскусіі пра сацыял-дэмакратычную палітыку будучыні павінны зыходзіць з гэтага факту.

Матэрыяльныя перадумовы як умовы палітыкі

«Матэрыяльныя перадумовы» як ключавы палітычны фактар — гэта ў шырокім сэнсе тыя рэальныя матэрыяльныя рэсурсы, якія ёсць у наяўнасці або якія можна стварыць за разумны час для выканання палітычна прынятых абавязацельстваў. Ідэалогія і каштоўнасці патрэбныя, каб вызначыць, якія рэформы пажаданыя. Аднак калі рашэнне правесці рэформу павінна прывесці да сапраўдных грамадскіх змен, гэтую рэформу павінна быць матэрыяльна магчыма ажыццявіць. Аднаго добрага намеру недастаткова: рэформа патрабуе таксама грошай, персаналу, памяшканняў або тэхнічнай інфраструктуры. Калі матэрыяльных перадумоў не хапае, рэформа не будзе паспяховай, а ў горшым выпадку можа стварыць праблемы замест таго, каб іх вырашыць.

Гэтае разуменне — што рэформы, вызначаныя на падставе ідэй, павінны абапірацца на рэальныя матэрыяльныя перадумовы

мовы, калі іх хочуць ажыццявіць, — дамінавала ў сацыял-дэмакратычнай палітыцы ў гады дзяржавы дабрабыту. Густаў Мёлер, які як міністр сацыяльных спраў падпісаў некалькі буйных законапраектаў у сферы дабрабыту, пісаў у 1947 годзе, што «далейшае развіццё будзе адбывацца ў тым тэмпе, які дазваляе эканамічнае развіццё».

Такім чынам, праца над рэформамі можа ўключаць і папярэдняе стварэнне матэрыяльных перадумоў: напрыклад, развіццё сістэмы дагляду дзяцей у 1970-я гады патрабавала і пашырэння сеткі дзіцячых садкоў, і павелічэння падрыхтоўкі выхавальнікаў дашкольных устаноў, перш чым попыт можна было задаволіць цалкам. Калі вы не гатовыя стварыць неабходныя матэрыяльныя рэсурсы для пэўнага віду грамадскіх абавязацельстваў — напрыклад, падаткі на ўзроўні, патрэбным для іх выканання, — то не варта і абяцаць браць на сябе такія абавязацельствы ў такім аб'ёме. Тут варта адзначыць, што такія абяцанні памылкова даваліся неаднаразова на працягу апошніх дзесяцігоддзяў.

Аднак часам матэрыяльныя перадумовы самі становяцца перашкодай. Вялікі бюджэтны дэфіцыт, які сацыял-дэмакраты атрымалі ў спадчыну ў 1994 годзе, вымусіў зрабіць буйныя скарачэнні ў дзяржаўным бюджэце, а буйныя скарачэнні немагчымыя без таго, каб не закрануць мэты, важныя самі па сабе.

Палітыка грунтуецца на каштоўнасцях, але практычная палітыка не можа будавацца на мроях. Палітыцы патрэбная рацыянальнасць, каб звязваць ідэі з рэальнасцю, а ідэал — з рэсурсамі, патрэбнымі для яго ажыццяўлення. Гэта таксама азначае, што ідэі, якія былі праверaныя на практыцы і далі няправільны або зусім недастатковы ў параўнанні з іх мэтай вынік, трэба перагледзець.

Сувязь паміж ідэямі і эканомікай

Гістарычна-матэрыялістычны падыход мае на ўвазе таксама сувязь паміж ідэямі і грамадскімі каштоўнасцямі, з аднаго боку, і эканамічнай арганізацыяй — з другога.

«Спосаб вытворчасці матэрыяльнага жыцця абумоўлівае агульны працэс сацыяльнага, палітычнага і духоўнага жыцця. Не свядомасць людзей вызначае іх быццё, а іх грамадскае быццё вызначае іх свядомасць», — пісаў Карл Маркс у працы *«Да крытыкі палітычнай эканоміі»*. Прыведзеную цытату можна прыблізна вытлумачыць так: не ідэі вызначаюць уладкаванне грамадства, а грамадскія ўмовы, створаныя тэхналогіямі, эканомікай і эканамічнай уладай, фармуюць гэтыя ідэі.

Ідэі, якія адпавядаюць таму, што ў пануючым эканамічным парадку выглядае натуральным, разумным і маральным, фармуюць наша ўяўленне пра тое, што насамрэч натуральнае, разумнае і маральнае. Калі гэты парадак мяняецца і ўзнікаюць новыя патрабаванні або патрэбы, гэта ўплывае і на нашы погляды на нормы і мараль. Адзін гістарычны прыклад — стаўленне да працэнтаў па пазыках. У Сярэднявеччы, у грамадстве з нізкім узроўнем тэхнікі, дзе прыбытак на капітал быў нізкі або яго не было зусім, браць працэнты не дазвалялася. Калі развіліся гандаль і мараплаўства і стала немагчыма ажыццяўляць буйныя гандлёвыя праекты без пазык — а атрымаць іх было цяжка, бо пазыкадаўцы не мелі ніякай кампенсацыі за рызыку, якую бралі на сябе, — забарону на працэнты змякчылі, а потым яна паступова знікла.

Вядома, ідэі і ідэалы нельга разглядаць як механічныя прылады эканамічных інтарэсаў. Ідэі свабоды і роўнасці, справядлівасці і клопату пра іншых існавалі заўсёды, незалежна ад тэхналогіі вытворчасці і эканомікі. У любыя часы людзі даглядалі старых і хворых, і ва ўсіх грамадствах былі правілы, што

рэгулявалі паводзіны людзей, каб даць хоць нейкую абарону слабым перад моцнымі.

Аднак механізмы, створаныя для ажыццяўлення гэтых ідэй, моцна адрозніваліся, і рэальная абарона слабых і ўразлівых груп была вельмі рознай. Існуе выразная сувязь паміж эканамічным развіццём і развіццём такіх паслуг, як школьная адукацыя і ахова здароўя: патрабаванне, каб яны былі задачай грамадства, а не абавязкам царквы, сем'яў або дабрачынных арганізацый, стала палітычна ажыццявімым толькі тады, калі з'явілася дастаткова эканамічных рэсурсаў, каб за гэта заплаціць. Відавочная і сувязь паміж ідэямі і інтарэсамі: паўночная мадэль дабрабыту, заснаваная на сацыял-дэмакратычнай ідэі роўнасці, адрозніваецца ад мадэлі ў ЗША, дзе дазволілі панаваць рынкава-ліберальным прынцыпам і недаверу да дзяржавы.

Уяўленні пра тое, якім павінна быць добрае грамадства, звычайна афарбаваныя, з аднаго боку, тым, чаго можна дасягнуць у межах існуючай сістэмы вытворчасці, а з другога — патрабаваннямі, якія гэтая сістэма вытворчасці ставіць да рабочай сілы і грамадскіх інстытутаў. І не ў апошнюю чаргу гэтыя ўяўленні афарбаваныя інтарэсамі групы (груп), якая мае найбольшую ўладу над сферай вытворчасці. За зменамі ў эканамічных суадносінах улады звычайна ідуць змены ў каштоўнасцях.

У апошнія дзесяцігоддзі адбыўся зрух улады ад палітыкі / дэмакратыі да працэсаў, якімі рухаюць рынкавыя сілы, а значыць, да груп, якія маюць моцныя пазіцыі на рынку. Гэтыя групы валодаюць або распараджаюцца актывамі, ключавымі для сённяшняй сістэмы вытворчасці. Сёння гэта, з аднаго боку, фінансавы капітал, а з другога — капітал ведаў, іншымі словамі, грошы і вышэйшая адукацыя.

І ў выніку зруху ўлады ў эканоміцы і працоўным жыцці за апошнія дзесяцігоддзі на першы план выйшла асаблівае значэнне кампаній / прадпрымальнікаў і добра адукаваных экспертаў для развіцця грамадства, тады як значэнне іншых было прыглушана.

Калі пэўныя групы атрымліваюць больш улады ў эканоміцы, гэта ўплывае і на лад мыслення і меркаванні. Тыя, хто мае ўладу, абараняюць свае пазіцыі, сцвярджаючы, што гэта вядзе да большага эканамічнага росту і тым самым да лепшага грамадскага развіцця для ўсіх, — і што дзеля такіх паляпшэнняў тыя, хто іх стварае, павінны карыстацца асабліва спрыяльнымі ўмовамі. Вынікам становіцца зрух і ў каштоўнасцях, і ў практычнай палітыцы на карысць гэтых груп.

Адзін прыклад — падатковая палітыка: падаткі на капітал і на прыбытак кампаній былі істотна зніжаныя, а падаходныя падаткі паменшаныя так, што выйгралі ад гэтага пераважна людзі з больш высокімі даходамі. Іншы прыклад — прыход прыватных камерцыйных кампаній у сектар, які фінансуецца з падаткаў. У абодвух выпадках такія зрухі абгрунтоўвалі тым, што стымулы для прадпрымальнікаў і людзей з вышэйшай адукацыяй — з іх нібыта само сабой зразумелым асаблівым значэннем для эканомікі — умацуюць дзяржаўныя фінансы ўвогуле, а значыць, і дабрабыт для ўсіх.

Трэці прыклад — тое, як барацьбу 1970-х і 1980-х гадоў за тое, каб усе работнікі мелі ўплыў на арганізацыю працы і працоўнае жыццё, змянілі мадэлі кіравання, распрацаваныя асобнымі знешнімі спецыялістамі. Калі раней досвед работнікаў лічыўся неабходным для развіцця паспяховых вытворчых ланцужкоў, то цяпер акцэнт робіцца на фармальнай адукацыі ў галіне тэорыі арганізацыі.

Падобна да гэтага і акцэнт 1970-х гадоў на «добрай працы» змяніўся патрабаваннем новага тысячагоддзя да «гнуткасці» ў формах занятасці і графіках працы — незалежна ад таго, як негатыўна гэта можа адбівацца на работніках. У 1970-я гады дыскусію вызначалі інтарэсы работнікаў. Цяпер, пасля пачатку новага тысячагоддзя, яе вызначаюць інтарэсы кампаній. Сувязь паміж гэтым ідэалагічным зрухам у поглядах на ўмовы працы і адначасовым зрухам улады ад палітыкі і прафсаюзаў да капіталу і інтарэсаў кампаній — відавочная.

Словы-каштоўнасці

Свабода

«СВАБОДА» — ШМАТГРАННЫ тэрмін, які мае і калектыўнае, і індывідуальнае значэнне.

У калектыўным сэнсе ён можа азначаць права краіны — або этнічнай групы — на нацыянальнае самавызначэнне, без якога-небудзь кіравання з боку іншай краіны. Ліквідацыя каланіяльнага панавання ў XX стагоддзі і распад савецкай імперыі ва Усходняй Еўропе — прыклады такога калектыўнага вызвалення адной краіны з-пад суверэнітэту іншай. Калектыўнае значэнне слова ўключае і свабоду ўсіх грамадзян краіны ўдзельнічаць ва ўплыве на тое, як краінай кіруюць, не падпарадкоўваючыся нейкім вышэйшым вузкім групам улады, якія адны вызначаюць умовы для ўсіх астатніх грамадзян.

Нацыянальная незалежнасць і грамадзянскія свабоды і правы — аснова найвышэйшага сэнсу слова «свабода»: права асобнага чалавека кіраваць уласным жыццём і рабіць уласны выбар. Для гэтага патрэбныя грамадзянскія правы — выбарчае права, свабода слова і меркаванняў, — і індывідуальныя

правы, такія як свабода выбару адукацыі і прафесіі, свабода выбару партнёра для шлюбу, права свабодна перамяшчацца па сваёй краіне і праз дзяржаўныя межы. У палітычнай філасофіі гэта звычайна называюць «свабодай для» чаго-небудзь.

Палітычная філасофія апісвае як не менш неабходную і «свабоду ад» чаго-небудзь — напрыклад, свабоду ад голаду, ад прыгнятальнай беднасці, ад шкоднага для здароўя жыццёвага асяроддзя. Бо без такіх асноўных сацыяльных і эканамічных свабод рэальная свабода дзеянняў асобнага чалавека вельмі абмежаваная, як бы моцна ні былі замацаваныя ў заканадаўстве грамадзянскія і індывідуальныя свабоды.

Сацыял-дэмакратычнае разуменне свабоды

У часы, калі ўзнікала сацыял-дэмакратыя, рабочым у значнай ступені не хапала і «свабоды для», і «свабоды ад». Яны не мелі выбарчага права, права аб'ядноўвацца дзеля агульных інтарэсаў і ў значнай ступені права свабодна крытыкаваць палітычную і эканамічную ўладу. На практыцы ім не хапала і індывідуальных свабод, такіх як выбар адукацыі або клопат пра ўласнае здароўе, — не таму, што гэта забаранялі законы, а таму, што ім перашкаджала эканамічная беднасць.

Таму барацьба ранняга рабочага руху за свабоду ішла на некалькіх узроўнях. Яна ўключала заваёву грамадзянскіх правоў, такіх як выбарчае права і свабода слова. Яна ўключала і ліквідацыю падпарадкаванасці на працоўным месцы, якая азначала несвабоду для рабочых як калектыву, і ператварэнне індывідуальных свабод — такіх як магчымасць атрымаць адукацыю і свабода выбару прафесіі — у рэальнасць праз стварэнне эканамічных перадумоў для гэтага.

У сацыял-дэмакратыі паняцце свабоды мае двайное значэнне: адпраўны пункт — свабода асобнага чалавека, але шлях

да такой свабоды патрабуе змен у грамадстве і працоўным жыцці. Недастаткова адкрыць асобным людзям шлях, каб тыя скінулі кайданы беднасці і падпарадкаванасці, — трэба ліквідаваць самі беднасць і падпарадкаванасць, для ўсіх. Для гэтага патрэбныя калектыўныя рашэнні, захады супраць тых механізмаў, якія спараджаюць беднасць і падпарадкаванасць, а значыць, і несвабоду для многіх.

Твая свабода — і свабода іншых

Пераход ад сістэмы падпарадкавання і панавання да больш роўнай сістэмы азначае не толькі тое, што падпарадкаваная група атрымлівае больш свабоды, але і тое, што — непазбежна — свабода групы, якая панавала, абмяжоўваецца. Гэта датычыць і большай роўнасці полаў, і змен у праве вырашаць у працоўным жыцці. Таму не дзіўна, што групы, якія карысталіся перавагамі ранейшай сістэмы, рэагуюць на захады па такіх зменах. Гэта можа праяўляцца ў крытыцы рэформаў роўнасці: маўляў, яны пагражаюць традыцыйным (= патрыярхальным) сямейным каштоўнасцям. Гэта можа праяўляцца і ў крытыцы захадаў, якія пашыраюць правы работнікаў у адносінах да наймальнікаў: маўляў, гэта зніжае эфектыўнасць кампаніі.

Для сацыял-дэмакратыі адно з ключавых прызнанняў — тое, што розніца ў эканамічнай уладзе ў грамадстве вядзе да рознай ступені асабістай свабоды і дае тым, хто мае больш улады, шырокія магчымасці абмяжоўваць свабоду ўсіх астатніх. Таму сацыял-дэмакратычнае разуменне свабоды ўключае і захады, каб гэтую розніцу змяншаць. Паколькі барацьба за ўсеагульнае выбарчае права была выйграная стагоддзе таму, большасць дыскусій пра паняцце свабоды ў наш час датычыць эканамічнай улады.



Хьялмар Брантынг на трыбуне на Ердэце (Gärdet) у Стакгольме, 1 мая 1917 года

Класічны лібералізм таксама прызнае, што ўсе члены грамадства павінны мірыцца з пэўнымі абмежаваннямі, каб свабода аднаго не ператваралася ў несвабоду другога; «Твая свабода махаць кулаком заканчваецца там, дзе пачынаецца мой нос», — так гучыць вядомае выслоўе, якое прыпісваюць Джону Сцюарту Мілю. Лібералізм адыграў і працягвае адыгрываць важную ролю ў барацьбе за грамадзянскія свабоды і правы — напрыклад, за ўсеагульнае выбарчае права, якое зламала ўладныя прывілеі вышэйшых класаў, або за заўсёды актуальную абарону свабоды слова і свабоды друку. Тое ж можна сказаць пра барацьбу супраць прыгнятальных грамадскіх умоўнасцяў, якія абмяжоўваюць свабоду чалавека кіраваць уласным жыццём.

З другога боку, лібералізму цяжка спраўляцца з розніцай у свабодзе, якую спараджае розніца ў эканамічнай уладзе. Сацыяльны лібералізм, які адыграў значную ролю ў пэўныя перыяды XX стагоддзя, прызнае патрэбу ў сістэме сацыяльнай абароны і ў пэўным дзяржаўным умяшанні ў эканоміку, каб процідзейнічаць рынкавым ваганням і пэўнай розніцы ў рынкавай сіле. Аднак рынкавы лібералізм і неалібералізм, якія вызначаюць развіццё з 1990-х гадоў, пераносяць ідэалогію канкурэнцыі з дзелавога жыцця ў грамадзянскую, сацыяльную сферу і даюць моцным права выцясняць слабых. На практыцы гэта азначае і згоду з розніцай у свабодзе паміж грамадзянамі ў залежнасці ад розніцы ў іх эканамічнай сіле. Яскравы прыклад гэтага — рынак працы.

Кансерватыўныя і ліберальныя публіцысты, якія не прызнаюць значэння розніцы ў эканамічнай уладзе, лічаць права работніка адмовіцца ад нізкаплатнай працы раўназначным свабоднаму праву наймальніка такую працу прапанаваць. Калі работнік згаджаецца на дрэнныя ўмовы, гэта цалкам свабодны выбар, і таму няма падстаў умешвацца ў права наймальніка плаціць нізкія заробкі або прапаноўваць дрэнныя ўмовы працы. Прафсаюзная арганізацыя, такім чынам, разглядаецца як пагроза свабодзе прадпрымальніка, а не як інструмент пашырэння свабоды работніка.

Насамрэч асобны работнік, калі толькі ён ці яна не мае вельмі асаблівых ведаў або навыкаў, заўсёды падпарадкаваны наймальніку. І мінулае, і сучаснасць паказваюць, што гэта часта ператвараецца ў жорсткую эксплуатацыю і празмерна нізкія заробкі. Прафсаюзная арганізацыя і працоўнае заканадаўства могуць зламаць такое становішча і забяспечыць лепшы баланс паміж інтарэсамі работніка і наймальніка. Работнікі атрымліваюць больш уплыву на ўмовы сваёй працы. Гэта дае ім больш

свабоды ва ўласным жыцці. Праўда, наймальнік пры гэтым, безумоўна, мае менш свабоды.

Неабходныя правілы

Грамадскія правілы з вузкага пункту гледжання таксама можна апісаць як абмежаванне свабод асобнага чалавека. Аднак чалавек непазбежна залежыць ад таго, як функцыянуе грамадства, а грамадства, якое добра функцыянуе, гэтак жа непазбежна залежыць ад правілаў, што вызначаюць, што чалавек можа рабіць і чаго не можа. Абмежаванне індывідуальнай свабоды, якое азначае немагчымасць паставіць машыну, дзе захочаш, з лішкам кампенсуецца большай свабодай перамяшчэння, якую дае гэтае абмежаванне, — бо дарогі не застаўленыя машынамі, прыпаркаванымі дзе папала. Забарона курэння ў рэстаранах абмяжоўвае свабоду курцоў выкурыць цыгарэту, але пашырае свабоду некурцоў пазбягаць шкодных рэчываў ад чужога дыму.

Паміж патрабаваннямі свабоды з боку асобнага чалавека і абмежаваннямі індывідуальнай свабоды, неабходнымі для абароны свабоды ўсіх астатніх, заўсёды існуе напружанне. Гэтае напружанне паміж асобай і калектывам — непазбежны вынік таго, што людзі адначасова і ва ўзаемазалежнасці з'яўляюцца і асобамі, і членамі грамадства. Калі аднабакова падкрэсліваць індывідуальную свабоду дзеянняў, не клапоцячыся пра тое, як гэта адбіваецца на іншых людзях, вы становіцеся датычнымі да прыгнёту слабейшых з боку мацнейшых. Калі ж аднабакова падкрэсліваць агульныя, калектыўныя патрабаванні, то, наадварот, узнікае рызыка, што патрэбы асобнага чалавека будуць безумоўна падпарадкаваныя патрэбам групы. Аднолькава важна асцерагацца абодвух відаў рызыкі.

Неалібералы часта адмаўляюць існаванне першага віду рызыкі, бо не бачаць у асобным чалавеку часткі грамадскага кантэксту, які непазбежна патрабуе ўзаемнай зважлівасці. Нам, сацыял-дэмакратам, трэба сачыць, каб не адмаўляць другі від рызыкі: мы ніколі не павінны па звычцы апраўдваць умяшанне ў індывідуальныя свабоды тым, што яно на нейкім агульным і ўсеахопным узроўні можа павялічыць свабоду для большых груп.

Калектыў можа навязваць уніфікацыю ладу жыцця і меркаванняў, якую немагчыма апраўдаць патрэбай зважаць на іншых. Групавая лаяльнасць можа перашкаджаць унутранай дыскусіі і праверцы рашэнняў, прынятых групай, а ўнутры калектываў могуць узнікаць пануючыя эліты, якія дзейнічаюць больш ва ўласных інтарэсах, чым у агульных.

Такая рызыка ёсць ва ўсіх відах калектываў, не толькі ва ўрадах, і ва ўрадах самых розных палітычных колераў. Савецкі Саюз пры Сталіне і нацысцкая Германія былі жорстка рэпрэсіўнымі рэжымамі, як і фашысцкая Іспанія, Чылі пры Піначэце і сучасны Кітай. Рэлігійныя супольнасці могуць ставіць надзвычай жорсткія патрабаванні, якія сягаюць у самыя прыватныя бакі жыцця. Абмежавальнымі могуць быць цесныя грамадскія нормы, што вызначаюць выбар прафесіі або партнёра, як і пэўныя грамадскія кодэксы, якія выключаюць людзей, што ў іх не ўпісваюцца.

Мы, сацыял-дэмакраты, мабыць, асабліва здольныя асцерагацца рызык калектывізму — якраз таму, што ў аснове нашых перакананняў ляжыць думка: індывідуальная свабода патрабуе пэўнай ступені калектывізму. І, як ужо гаварылася, гэта важна памятаць на будучыню.

Сродак, які дазваляе справіцца з напружаннем паміж асобай і калектывам на палітычным узроўні — на ўзроўні дзяр-

жавы, — гэта дэмакратыя, бо дэмакратыя дае кожнаму чалавеку такія ж правы, як і ўсім астатнім, уплываць на калектыў. Дэмакратычная дыскусія і дэмакратычнае прыняцце рашэнняў ёсць і павінны быць бесперапынным пошукам раўнавагі паміж калектывам і асобай, паміж рознымі групамі і паміж рознымі патрэбамі асобных людзей.

Ці атрымлівае чалавек больш свабоды, калі дзяржава скарачаецца?

Асабліва ў неаліберальнай дыскусіі сцвярджаецца, што індывідуальная свабода павялічваецца, калі палітычна арганізаваныя калектывы — такія як дзяржава і муніцыпалітэты — адступаюць. Гэта, вядома, праўда, калі гаворка ідзе пра глыбока асабістыя справы, дзе свабода аднаго чалавека не пагражае свабодзе іншых. Адзін прыклад — выбар спадарожніка жыцця: няма ніякіх падстаў абмяжоўваць гэты выбар толькі гетэрасексуальнымі людзьмі, і змена заканадаўства, якая дазволіла аднаполыя шлюбы, азначала выразнае пашырэнне свабоды — а таксама роўнасці.

Аднак і гісторыя, і сучасны досвед паказваюць: калі палітычная дэмакратыя адыходзіць ад пытанняў, у якіх чалавек істотна залежыць ад таго, як функцыянуе яго асяроддзе, гэта вядзе не да павелічэння індывідуальнай свабоды, а да залежнасці ад іншых калектываў.

Калі раней догляд дзяцей і пажылых людзей быў натуральным абавязкам, ускладзеным на жанчын дома, то грамадская арганізацыя і фінансаванне такога догляду вызвалілі жанчын ад гэтых абавязкаў. Сёння мы бачым, як скарачэнне рэсурсаў на догляд пажылых людзей прывяло да таго, што многія жанчыны скарачаюць свой працоўны час, каб даглядаць састарэлых сваякоў.

Мы бачым і выразныя прыклады таго, як невялікія, але вельмі схільныя да гвалту групы ўплываюць на ўмовы жыцця ў некаторых уразлівых раёнах і пагаршаюць іх — бо грамадства згарнула неабходныя ўкладанні ў сацыяльнае развіццё, а таксама з-за скарачэння рэсурсаў паліцыі, якой даручана прадухіляць гвалт і злачыннасць.

Грамадскія структуры вызначаюць умовы жыцця асобнага чалавека. Таму немагчыма разглядаць асобу і калектыў як процілегласці: як асобы мы ёсць і застаемся грамадскімі істотамі, і ў многіх адносінах інтарэсы асобнага чалавека павінны рэалізоўвацца праз калектывы. Гэта сляпая пляма неалібералізму.

Галоўнае пытанне — якія гэтыя структуры і гэтыя калектывы і як асобныя людзі могуць на іх уплываць: ці пабудаваныя яны на дэмакратычных прынцыпах, з роўным правам на ўплыў для ўсіх, ці іх будуюць групы ўлады, якія многіх выключаюць? Ці забяспечваюць яны роўнае размеркаванне правоў і абавязкаў, ці ў адных больш правоў, а ў іншых больш абавязкаў?

Свабодзе не пагражае дэмакратычны калектывізм, які грунтуецца на простай ісціне: асобны чалавек заўсёды залежыць ад свайго асяроддзя, і таму грамадства павінна абапірацца на правілы, што дзейнічаюць для ўсіх і складзеныя з улікам узаемнай зважлівасці да ўсіх і адказнасці за супольнасць.

Калектывізм, які пагражае свабодзе, — гэта фундаменталізм, г. зн. перакананне, што на баку ўласнай групы абсалютная ісціна, згодна з місіяй, ускладзенай на яе Богам, Гісторыяй або Рынкам. Паколькі група сама па сабе ўвасабляе адзіную ісціну, погляды іншых не проста памылковыя — яны наўпрост небяспечныя, і задачай самой групы становіцца сачыць, каб гэтым ілжывым вучэнням нават не давалі пашырацца.

Адкрытасць да розных перакананняў і меркаванняў, гатоўнасць слухаць і абменьвацца поглядамі, каб шукаць найлепшыя агульныя рашэнні, — неабходныя перадумовы дэмакратыі і для грамадзян дэмакратычнага грамадства.

Роўнасць

Патрабаванне роўнасці займае ў сацыял-дэмакратыі ключавое месца менавіта таму, што сацыял-дэмакратыю стваралі групы, якія самі заплацілі цану няроўнасці, а значыць, і несвабоды. Няроўнасць можа здавацца карыснай усім, хто знаходзіцца на выйгрышным баку, але для тых, хто апынуўся на іншым баку, няроўнасць азначае вялікія абмежаванні ў свабодзе дзеянняў і выбары.

Патрабаванне роўнасці — тая партыйная каштоўнасць, якая выклікае найбольш палітычных канфліктаў. Гэта адбываецца таму, што палітыка роўнасці ў канчатковым выніку тычыцца размеркавання ўлады — улады над уласнымі ўмовамі жыцця і ўлады над грамадствам, у якім ты жывеш. А калі гэтая ўлада мусіць быць справядліва і пароўну размеркаваная паміж рознымі групамі грамадства, якія раней знаходзіліся па розныя бакі глыбокіх разрываў, гэта азначае тое, што мы ўжо канстатавалі: адзін бок мусіць нечым саступіць, каб другі бок мог атрымаць больш.

Паняцце роўнасці мае шмат вымярэнняў

Першапачаткова рабочы рух разглядаў роўнасць толькі як класавае пытанне, гэта значыць як няроўнасць, створаную розніцай у эканамічнай уладзе і матэрыяльных багаццях. Доўгі час палітыка, накіраваная на большую роўнасць, таксама была скіраваная перадусім на эканамічныя разрывы і класавыя падзелы. Чакалася, што змяншэнне класавых па-

дзелаў прывядзе і да змяншэння іншых разрываў; розніцу ва ўмовах жыцця мужчын і жанчын тлумачылі патрабаваннямі капіталістычнага грамадства.

Жанчыны ў сацыял-дэмакратычным руху глядзелі на гэта крыху інакш і рана пачалі ўздымаць пытанні, якія датычылі менавіта ўмоў жыцця жанчын і іх падпарадкаванага становішча. Аднак толькі ў 1960-я гады сацыял-дэмакратычная дыскусія ўсур'ёз звярнула ўвагу на іншыя віды няроўнасці, акрамя тых, што вызначаюцца класам. Гэта няроўнасці, якія спараджаюцца найперш не эканамічнымі структурамі — хоць часам і праяўляюцца праз іх, — а сацыяльна абумоўленымі нормамі, каштоўнасцямі і ўстаноўкамі.

Няроўнасць узнікае па некалькіх розных восях. Эканамічныя структуры ствараюць няроўнасць паміж людзьмі ў залежнасці ад іх маёмасці і становішча ў працоўным жыцці. Патрыярхальныя структуры і гендарныя ролі, якія азначаюць розныя патрабаванні да полаў і няроўнае размеркаванне правоў і магчымасцяў паміж імі, ствараюць няроўныя ўмовы жыцця для жанчын і мужчын. Дыскрымінацыя людзей паводле такіх прыкмет, як этнічнае паходжанне, інваліднасць ці сэксуальная арыентацыя, азначае, што дыскрымінаваныя групы маюць у жыцці менш магчымасцяў, чым тыя, хто дыскрымінацыі не зазнае.

Гэтыя розныя чыннікі няроўнасці часта пераплятаюцца і могуць як аслабляць, так і ўзмацняць адзін аднаго. У кожным сацыяльным класе жанчыны ў сярэднім зарабляюць менш, чым мужчыны таго ж класа. Аднак жанчыны з вышэйшых даходных груп у сярэднім зарабляюць больш, чым мужчыны з ніжэйшых. Гістарычна сыны заўсёды мелі перавагу перад дочкамі ў спадкаванні маёмасці і ўлады. Але калі не было сына, які мог бы стаць спадкаемцам бацькі — няхай сабе гас-

падаркі ці кароны, — даводзілася задавольвацца дачкой: інтарэсы класа пераважалі патрабаванне адрозніваць полы.

Пол і этнічнае паходжанне дагэтуль застаюцца чыннікамі эканамічнай розніцы паміж мужчынамі і жанчынамі і паміж тымі, хто нарадзіўся ў Швецыі, і імігрантамі. Рост эканамічных разрываў узмацняе класавы падзел, а часта і іншыя віды няроўнасці. Большыя разрывы павялічваюць напружанне паміж рознымі класамі, але таксама і розніцу ўнутры кожнага класа — і часта мацней закранаюць тых, хто з самага пачатку быў у слабейшым становішчы, напрыклад жанчын і імігрантаў. Высокае беспрацоўе ў цэлым вядзе да росту дыскрымінацыі, бо групы, якія лічацца менш надзейным выбарам, — падлеткі, а таксама пажылыя людзі, тыя, хто нядаўна прыехаў у Швецыю, або людзі з інваліднасцю, — могуць аказацца выключанымі. Беспрацоўе і (або) дэмпінг заробкаў могуць узмацняць недавер да імігрантаў: маўляў, яны «адбіраюць нашы працоўныя месцы» або ціснуць на заробкі.

Палітыка роўнасці павінна ахоплівать усе гэтыя чыннікі, што спараджаюць няроўнасць. Збольшага палітыка, накіраваная супраць іншых, не класавых, відаў няроўнасці, таксама прадугледжвае выраўноўванне эканамічных разрываў — напрыклад, розніцы ў заробках жанчын і мужчын — або меры супраць сацыяльна-эканамічна абумоўленай розніцы ва ўмовах жыцця маленькіх дзяцей. Аднак палітыка роўнасці павінна быць скіраваная і непасрэдна на ўстаноўкі і каштоўнасці, якія спараджаюць свядомыя ці несвядомыя ўяўленні пра падпарадкаванне і перавагу і ўплываюць на тое, як людзі паводзяць сябе адно з адным. Таму палітыка роўнасці ўключае і барацьбу з расізмам у яго розных формах, з прадузятасцю да людзей з інваліднасцю, з сэксуальнымі дамаганнямі, з прадузятасцю да гомасэксуальнасці і з падобнымі каштоўнасцямі і паводзінамі,

праз якія адны групы лічаць сябе вышэйшымі за іншых і ўпэўненыя, што маюць права паводзіць сябе адпаведна.

Паняцце роўнасці, як ужо сказана, — самае спрэчнае слова-каштоўнасць у сацыял-дэмакратыі, але супраціў ідэалогіі роўнасці і падтрымка яе розняцца ў залежнасці ад таго, пра які від няроўнасці ідзе гаворка. У пытаннях эканамічнай улады і эканамічных разрываў лініі размежавання звычайна праходзяць па класічнай шкале «левыя — правыя», і ў XXI стагоддзі супраціў роўнасці з боку ўсіх правых партый узмацніўся.



Дэманстрацыя за жаночае выбарчае права ў Гётэборгу, 2 чэрвеня 1919 года

Што ж датычыць роўнасці полаў, то лібералы і сацыял-дэмакраты з часоў барацьбы за выбарчае права знаходзіліся на адным баку — як і ў пытаннях, што тычацца ЛГБТК-супольнасці. Кансерватыўныя партыі былі больш нерашучымі, і цяпер мы бачым, як некаторыя партыі вяртаюцца да даўніх

правых пазіцый адносна грамадскага догляду дзяцей і рэпрадуктыўных правоў жанчын. Правапапулісцкія партыі часта маюць кансерватыўны погляд на жанчын і сям'ю. Адна з вызначальных рыс такіх партый — таксама ксенафобскія, а часам і адкрыта расісцкія погляды: яны не прызнаюць асноўнага прынцыпу роўнасці, паводле якога ўсе людзі маюць роўную каштоўнасць.

Што ўключае ў сябе роўнасць?

Роўнасць ахоплівае як калектыўныя, так і індывідуальныя правы — правы, якія выяўляюцца не толькі ў фармальных нормах, але і ў канкрэтных грамадскіх абавязацельствах, што ператвараюць фармальныя правы ў рэальныя магчымасці.

Палітычная дэмакратыя — аснова і свабоды, і роўнасці. Права рабочага класа таксама ўплываць на грамадства — праз выбарчае права і права на палітычныя і прафсаюзныя аб'яднанні — было для ранняга рабочага руху патрабаваннем роўнасці і патрабаваннем свабоды. Усеагульнае і роўнае выбарчае права, свабода слова, свабода друку, свабода думкі і веравызнання і свабода ствараць партыі і групы інтарэсаў — усё гэта неабходныя складнікі палітычнай роўнасці, якія не падлягаюць перамовам.

Веды — адзін з найважнейшых індывідуальных рэсурсаў улады як на рынку працы, так і ў грамадстве. Патрабаванне роўнасці азначае, што магчымасць атрымаць якасную адукацыю дастатковага аб'ёму павінна быць правам кожнага, незалежна ад уласных эканамічных рэсурсаў чалавека. Гэтаксама ўсе людзі павінны мець права на якасную медыцынскую дапамогу дастатковага аб'ёму, незалежна ад уласных эканамічных рэсурсаў, бо здароўе — важны індывідуальны рэсурс. Таму ўсе павінны мець і магчымасць уплываць на сваё пра-

цоўнае месца, каб пазбаўляцца ад працоўных заданняў і ўмоў працы, небяспечных для здароўя.

Умовы працы увогуле важныя для роўнасці, бо гэтыя ўмовы — заробак, працоўны час, працоўнае асяроддзе, графік і г. д. — у вельмі вялікай ступені вызначаюць умовы жыцця ў цэлым. Гэта азначае, што работнікі павінны мець права і магчымасць уплываць на розныя чыннікі, якія вызначаюць умовы іх працы, а не проста падпарадкоўвацца рашэнням, прынятым наймальнікам у аднабаковым парадку. Для гэтага патрэбныя і моцныя прафсаюзы, і працоўнае заканадаўства.

Базавая эканамічная і сацыяльная бяспека — таксама пытанне роўнасці. Людзям, якія не маюць эканамічнай незалежнасці, цяжка абараняць свае інтарэсы, і іх могуць прымусіць працаваць ва ўмовах, шкодных для здароўя. Магчымасці асабістага развіцця ў людзей, якія ледзь зарабляюць на ежу, абмежаваныя. Людзі, якія пастаянна трывожацца з-за хваробы або беспрацоўя, не маюць прасторы для асабістага развіцця. Асноўная перадумова эканамічнай і сацыяльнай бяспекі — вядома ж, уласная праца, якая дае сродкі на жыццё. Аднак эканамічная бяспека на выпадак беспрацоўя і хваробы — і, вядома, у старасці, пасля заканчэння працоўнага жыцця, — не менш важная для таго, каб людзі мелі ўладу над уласным жыццём.

Нормы і каштоўнасці могуць спараджаць няроўнасць нават тады, калі заканадаўства і правілы прызнаюць роўныя правы для ўсіх і роўныя магчымасці ў грамадстве і працоўным жыцці. Дыскрымінацыя паводле полу, дыскрымінацыя людзей з інваліднасцю і людзей нешведскага паходжання — усё гэта грунтуецца на каштоўнасных уяўленнях пра розніцу паміж поламі, паміж людзьмі з рознымі фізічнымі магчымасцямі і паміж людзьмі рознага этнічнага і рэлігійнага пахо-

джання — уяўленнях, якія могуць прыводзіць да няроўнага стаўлення і абмяжоўваць выбар, даступны некаторым людзям.

Роўнасць і аднолькавасць

Адзін з самых распаўсюджаных кансерватыўных аргументаў супраць роўнасці — што яна прымушае людзей быць аднолькавымі. Гэтая крытыка блытае аднолькавасць з роўнасцю.

У некаторых ключавых адносінах роўнасць, безумоўна, патрабуе *аднолькавасці* — у сэнсе роўнага стаўлення і роўных правоў. Аднак у шэрагу іншых адносін роўнасць патрабуе *разнастайнасці*.

- Аднолькавасць перад законам — даўняе патрабаванне роўнасці: судовая сістэма павінна аднолькава ставіцца да ўсіх людзей, а законы павінны распаўсюджвацца на ўсіх, незалежна ад грошай, паходжання, полу ці веравызнання.
- Аднолькавасць у выбарчым праве — значна больш нядаўняе патрабаванне. Сёння яно само сабой зразумелае, але, каб яго дасягнуць, спатрэбіліся дзесяцігоддзі барацьбы. У першыя гады рабочага руху выбарчае права залежала і ад даходу, і ад полу, а гэтую сістэму падтрымлівала перакананне, што паміж рознымі сацыяльнымі класамі і паміж поламі існуе сапраўдная розніца ў здольнасці разумець грамадскія пытанні і несці за іх адказнасць.
- Роўнае стаўленне ў працоўным жыцці — таксама патрабаванне роўнасці: напрыклад, роўная аплата за падобную працу, роўныя магчымасці для кар'ернага росту і забарона ўсіх відаў дыскрымінацыі.
- Патрабаванне аднолькавасці закладзенае і ў прынцыпах палітыкі дабрабыту, і ў роўным доступе ўсіх да сацыяльных даброт, ключавых для ўмоў жыцця чалавека, — такіх

як школа, ахова здароўя і базавая эканамічная бяспека ў старасці.

Роўнасць, аднак, не азначае, што ўсе павінны жыць аднолькава.

Людзі розныя. Калі ўсур'ёз ставіцца да патрабавання, каб кожны меў магчымасць свабодна выбудоўваць уласнае жыццё, трэба — само сабой — прыняць і тое, што гэты выбар будзе розным. Аднолькавасць — патрабаванне, каб усе былі ўціснутыя ў адзін і той жа шаблон, — з гэтага пункту гледжання насамрэч вораг роўнасці: яна азначае, што кожны, хто не адпавядае пэўнаму шаблону, але ўсё роўна вымушаны да яго прыстасоўвацца, пазбаўлены магчымасці распараджацца ўласным жыццём. Роўнасць патрабуе разнастайнасці і варыятыўнасці.

Пра паняцце роўнасці часам гавораць у тэрмінах «роўнасці магчымасцяў» і «роўнасці вынікаў». На нашу думку, гэта збольшага ўводзіць у зман. Абсалютная «роўнасць вынікаў» — напрыклад, зусім аднолькавыя адзнакі ў школе або аднолькавы заробак за любую працу — відавочна ніколі не была б магчымай якраз таму, што людзі не вылітыя з адной формы і насамрэч не імкнуцца да аднолькавых мэтаў і не ажыццяўляюць аднолькавых мараў.

Патрабаванне роўнасці сапраўды азначае, што кожны павінен мець аднолькавую — рэальную — магчымасць ажыццявіць свае мары. Адсюль вынікае, што ніякі выбар адукацыі ці кар'еры не павінен прыводзіць да горшага доступу да аховы здароўя і сацыяльнай апекі, да большай незабяспечанасці на выпадак хваробы і беспрацоўя або да горшых магчымасцяў уплываць на ўласныя ўмовы працы. Калі пэўны выбар прыводзіць да значна горшых умоў у гэтых адносінах, такі выбар на справе нельга лічыць свабодным. Менавіта ў гэтым сэнсе — каб пэўны выбар не азначаў меншай сацыяльнай аба-

роненасці або горшага становішча на рынку працы — і трэба ставіць патрабаванне «роўнасці вынікаў».

Абавязковая адукацыя павінна, такім чынам, даваць усім вучням веды, якія лічацца асноватворнымі для ўсіх грамадзян. Аднак мы не павінны імкнуцца да таго, каб кожны вучань пасля заканчэння абавязковай базавай школы выбіраў аднолькавую адукацыю і аднолькавую кар'еру, бо і грамадскае, і працоўнае жыццё патрабуюць вялізнай колькасці розных кампетэнцый. Не азначае патрабаванне роўнасці і таго, што гэты розны выбар павінен весці да кар'ер з аднолькавымі заробкамі. Сацыял-дэмакратыя выступае за тое, каб любая праца аплачвалася так, каб работнік мог на гэта жыць, і каб розніца ў заробках была разумнай і абгрунтаванай з улікам такіх чыннікаў, як адказнасць, спецыяльныя кампетэнцыі і магчымая рызыка, звязаная з працай.

Свабода і роўнасць — супрацьлегласці ці раўназначныя каштоўнасці?

І кансерватыўныя, і неаліберальныя ўдзельнікі дыскусій у пэўнай ступені разглядаюць свабоду і роўнасць як супрацьлегласці: патрабаванне роўнасці ператвараецца ў абмежаванне права і магчымасці індывіда на свабоднае развіццё. Сацыял-дэмакратыя сцвярджае адваротнае: роўнасць і свабода ўзаемна абумоўліваюць адна адну. Няроўнае грамадства, вядома, дае значна больш свабоды тым, хто мае найбольшыя прывілеі. Аднак гэта азначае і тое, што тыя, хто апынуўся на няправільным баку эканамічных і сацыяльных разрываў, на практыцы маюць значна абмежаваную свабоду: эканамічная нястача не дазваляе ім іншага выбару, акрамя таго, які неабходны, каб зарабіць на жыццё, і яны падпарадкаваныя рашэнням больш прывілеяваных груп, не маючы магчымасці на гэтыя рашэнні ўплываць.

У няроўным грамадстве, дзе наймацнейшым дазваляецца карыстацца перавагамі за кошт слабейшых, адны людзі будуць мець менш магчымасцяў, чым іншыя, распараджацца ўласным жыццём; іншыя, больш прывілеяваныя групы змогуць дыктаваць ім умовы жыцця і тым самым абмяжоўваць іх свабоду. Калі свабоду вызначаць як права наймацнейшых выкарыстоўваць сваю сілу дзеля ўласнай выгады, на практыцы гэта вядзе да падпарадкавання і меншай свабоды для многіх іншых людзей. Насамрэч гэта ўжо не патрабаванне свабоды, а патрабаванне прывілеяў.

Калі патрабаванне свабоды шчырае, яно, вядома, павінна распаўсюджвацца на ўсіх. Таму сцвярджаць, што свабода — супрацьлегласць роўнасці, — супярэчнасць сама ў сабе: толькі ў роўным грамадстве кожны мае магчымасць быць свабодным. Чытач ужо, напэўна, заўважыў, што чыннікі, якія мы называем важнымі для роўнасці, — тыя ж самыя, што важныя для свабоды.

Салідарнасць

Свабода і роўнасць — паняцці, якія дзякуючы сваёй складанасці прыцягвалі ўвагу палітычных філосафаў; пра іх сэнс і ўзаемасувязь напісана вельмі шмат. Паняцце салідарнасці не прыцягвала ўвагі палітычных філосафаў у такой ступені. Затое ёсць шмат простых, амаль лозунгавых выразаў пра сэнс салідарнасці — як, напрыклад, словы з Біблії: «Нясіце цяжары адзін аднаго» або старое гасло рабочага руху: «Разам мы выстаім, паасобку загінем».

Гэтыя выразы апісваюць саюз паміж людзьмі — саюз, які ўключае і адказнасць адно за аднаго, і залежнасць адно ад аднаго. Для гэтага патрэбнае пачуццё еднасці, або салідарнасць.

Сёння слова «салідарнасць» часта ўжываюць у сэнсе «падзяліцца» або «заступіцца», гэта значыць фактычна як рух у адзін бок, калі адзін дае, а другі атрымлівае. Бываюць сітуацыі, калі гэта сапраўды вынікае з патрабавання салідарнасці, але сапраўдны сэнс салідарнасці — ва ўзаемнасці: мы ўсе і даем, і атрымліваем. На гэтай узаемнасці грунтуецца ўсеагульная палітыка дабрабыту: мы ўсе плацім падаткі, каб пакрываць выдаткі на адукацыю, ахову здароўя і сацыяльную апеку і пенсіі, нават калі самі ў гэтых паслугах не маем патрэбы. Але калі яны нам патрэбныя, яны даступныя. Мы плацім адно за аднаго, і іншыя плацяць за нас: мы і даем, і атрымліваем. Важна таксама адзначыць, што гэта дае нам нешта агульнае. Слова «салідарнасць» паходзіць ад лацінскага слова *solidus*, якое азначае «цвёрды, шчыльны, трывалы» і якое сустракаецца ў такіх словах, як «салідны» і «саліднасць». Прасцей кажучы, салідарнасць стварае больш трывалае, больш устойлівае і згуртаванае грамадства.

Для ранняга рабочага руху аб'яднанне было неабходнай перадумовай змены грамадства. Ніхто, дзейнічаючы ў адзіночку, не змог бы супрацьстаяць несправядлівасці. Патрэбную сілу можна было здабыць толькі разам. Патрабаванне аб'яднання, падтрымкі адно аднаго і агульнай мэты было неабходнае і ў барацьбе за рэальныя змены, і ў бачанні новага грамадства. Важна было заставацца адзінымі ў барацьбе і справядліва і пароўну дзяліць здабытае. Барацьба за новае грамадства азначала дасягненне агульных паляпшэнняў, сістэму дабрабыту, якая ахоплівала б усіх, і магчымасць для ўсіх мець уплыў. Яна не азначала, што асобныя людзі могуць пераступаць праз іншых, каб ствараць багацце і ўладу для сябе.

Паняцце салідарнасці — практычнае выяўленне разумення таго, што ўсе мы істоты грамадскія, залежныя адно ад аднаго,

і што жыццёвыя магчымасці чалавека вызначаюцца яго асяроддзем і грамадствам. Салідарнасць азначае таксама, што грамадства, пабудаванае на аснове агульнага дабра, — найбольш паспяховы тып грамадства.

На гэтым грунтуецца наша палітыка дабрабыту, якая фінансуецца з падаткаў. Сумеснае, салідарнае фінансаванне дае бяспеку чалавеку і роўнасць паміж людзьмі. Але яно стварае і больш бяспечнае для ўсіх грамадства, у якім менш сацыяльнага напружання, што заўсёды суправаджае несправядлівасць і эканамічныя разрывы.

Такім чынам, салідарнасць можна разглядаць як калектыўны асабісты інтарэс, але таксама як агульную і ўзаемную адказнасць за тое, як функцыянуе грамадства. Гэта можна праілюстраваць прымаўкай: «Каб выхаваць дзіця, патрэбная ўся вёска». Бацькі нясуць асноўную і асаблівую адказнасць за выхаванне ўласных дзяцей і іх дабрабыт, але асяроддзе, у якім растуць дзеці, ствараюць не толькі бацькі — на яго ўплывае ўсё сацыяльнае асяроддзе дзіцяці. І за гэта адказныя ўсе мы.

Для салідарнасці ёсць адна перадумова — прызнанне і перажыванне адначасовай еднасці і залежнасці. Салідарнасць — гэта стаяць разам і падтрымліваць адно аднаго, але мы не падтрымліваем тых, у кім адчуваем пагрозу. Як ужо гаварылася, салідарнасць — гэта ўзаемнасць.

Развіццё апошніх дзесяцігоддзяў ішло ў адваротным кірунку. Збольшага гэта свядомыя палітычныя рашэнні — напрыклад, калі беспрацоўных і хворых пачалі лічыць цяжарам для нацыянальнай эканомікі. А збольшага гэта растучыя разрывы, якія ствараюць усё большую розніцу ва ўмовах жыцця і больш палярызаванае грамадства.

Некаторыя прывілеяваныя групы цяпер адчуваюць сябе менш залежнымі ад сацыяльнага асяроддзя і не хочуць або не разумеюць, навошта патрэбная палітыка дабрабыту з салідарным фінансаваннем. Іншыя групы, якія ад гэтага развіцця пацярпелі, могуць адчуваць, што «палітыкі» больш не цікавяцца іх праблемамі — магчыма, аддаючы перавагу зусім іншым групам. Гэта ўплывае на пачуццё еднасці з гэтымі іншымі групамі і з грамадствам у цэлым.

Салідарнасць — умова развіцця справядлівага і роўнага грамадства, але правільна і адваротнае: справядлівыя і роўныя ўмовы — умова сацыяльнай салідарнасці.

Дэмакратыя

Дэмакратыя — гэта сума свабоды, роўнасці і салідарнасці: дэмакратыя адначасова патрабуе гэтых трох каштоўнасцяў і робіць іх магчымымі.

Паводле паходжання слова «дэмакратыя» азначае ўладу народа — у адрозненне ад розных формаў «алігархіі», дзе ўлада належыць толькі нямногім. Дэмакратыя як форма кіравання паводле канстытуцыі азначае, што палітычныя органы, якія прымаюць рашэнні ў краіне, фармуюцца праз свабодныя, рэгулярныя выбары, заснаваныя на свабодзе думкі і свабодным стварэнні палітычных партый, і што ўсе грамадзяне старэйшыя за пэўны ўзрост — «народ» — маюць роўнае выбарчае права.

Гістарычна паняцце дэмакратыі супрацьпастаўлялася перадусім уладзе караля і дваранства. Сёння дэмакратыю часцей супрацьпастаўляюць паняццю «дыктатуры», гэта значыць такому спосабу кіравання, пры якім свабоду думкі і свабоду аб'яднанняў абмяжоўваюць правілы, устаноўленыя кіруючымі

элітнымі групамі, што ў выніку ўтрымліваюць сваю ўладу сілай. Прыклады дыктатур — аднапартыйныя дзяржавы, заснаваныя на пэўнай ідэалогіі, як Кітай ці былы Савецкі Саюз, ваенныя дыктатуры або рэлігійна кіраваныя дзяржавы, як Іран і Саудаўская Аравія. Ёсць таксама дзяржавы, дзе форма кіравання фармальна абапіраецца на дэмакратычныя выбары і дэмакратычныя правы, але дзе магчымасць галасаваць і права на ўласную думку на практыцы кантралюе існы рэжым, а апазіцыя дапускаецца толькі ў абмежаваных межах.



Велізарны натоўп на плошчы Грунмаркт (Groenmarkt) у Гаазе на дэманстрацыі за ўсеагульнае выбарчае права, 17 верасня 1912 года; сярод удзельнікаў шмат сацыял-дэмакратаў

Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму дэмакратыя лічылася відавочна найлепшай формай кіравання і агульнай мэтай усякага развіцця. У дзесяцігоддзі вакол мяжы тысячагоддзяў дэмакратыя ўмацоўвалася ва ўсё большай колькасці краін. Але

ў апошнія гады гэтае развіццё спынілася, а ў некаторых рэгіёнах фактычна павярнула назад. Недэмакратычныя рухі набіраюць сілу, і ўсё больш адкрытае сумненне ў дэмакратыі чуваць нават у краінах, якія лічацца стабільнымі дэмакратыямі або знаходзяцца на шляху да дэмакратыі.

Таму мы хацелі б пачаць з пытання: «Навошта дэмакратыя?»

Навошта дэмакратыя?

Ніхто не жыве незалежна ад грамадства; наадварот, усе мы цалкам залежым ад таго, як грамадства функцыянуе, якія магчымасці яно нам дае і якія правілы ўстанаўлівае. Адсюль павінна вынікаць, што ўсе мы маем аднолькавыя правы і магчымасці — на роўных умовах адно з адным — уплываць на тое, як функцыянуе грамадства і якія ў ім правілы.

Гэта і ёсць просты адказ на пытанне «навошта дэмакратыя?»: кожны павінен мець магчымасць уплываць на тое, што датычыць усіх нас. На роўных умовах.

Нельга апраўдаць становішча, калі невялікая частка грамадзян нейкага грамадства мае права вырашаць за ўсіх астатніх, без іх ведама, як будзе развівацца грамадства, у якім усе яны жывуць. Якімі б высокімі ні былі аргументы на карысць такой алігархіі, і мінулае, і сучаснасць паказваюць, што гэтая форма кіравання заўсёды азначае расслаенне на вышэйшыя групы, якія маюць уладу, і падначаленыя групы без улады. Рашэнні заўсёды будуць падпарадкоўвацца асаблівым інтарэсам тых, хто пры ўладзе, і гэта заўсёды пагражае свабодзе тых, хто ўлады не мае, і абмяжоўвае іх жыццё.

Для сацыял-дэмакратыі паняцце дэмакратыі — сума асноўных каштоўнасцяў: свабоды, роўнасці і салідарнасці. Дэмакратыя і патрабуе свабоды, і стварае яе. Яна абапіраецца на асноўную роўнасць, звязаную з роўным правам кожнага

грамадзяніна ўплываць на сваё грамадства. Яна і патрабуе, і стварае салідарнасць паміж грамадзянамі, што закладзеная ў нашым разуменні ўзаемнай залежнасці адно ад аднаго і сумеснай адказнасці за грамадства, якое фармуе наша ўласнае жыццё.

Плюралізм

Дэмакратыя немагчымая без плюралізму. Любое ўяўленне, што асабістыя погляды, рэлігія ці лад жыцця павінны быць падпарадкаваныя нейкай палітычнай або рэлігійнай ідэалогіі, вызначанай і падтрымліванай дзяржавай, несумяшчальнае з дэмакратыяй.

З другога боку, дэмакратыя павінна быць здольная захоўваць і абараняць свае дэмакратычныя каштоўнасці ў тым выглядзе, у якім яны выяўляюцца ў грамадскім ладзе і грамадскіх інстытутах. Свабода думкі сама па сабе ўключае і свабоду выказваць недэмакратычныя погляды, але не права рабіць гэта з дапамогай гвалту, пагроз ці запалохвання і не права ператвараць гэтыя погляды ў спробы абмежаваць свабоду іншых у тым самым грамадстве. Свабода вызнаваць рэлігію не дае права па рэлігійных прычынах абмяжоўваць жыццёвы выбар іншых людзей у супольнасці або патрабаваць, каб розныя грамадскія функцыі прыстасоўваліся да патрабаванняў гэтай рэлігіі.

У той жа час дэмакратыя ў канстытуцыйна-палітычным сэнсе абапіраецца на рашэнні большасці. Тое, што дэмакратыя адначасова патрабуе плюралізму поглядаў і рашэнняў большасці, гэта значыць адсутнасці плюралізму ў практычнай палітыцы, у пэўным сэнсе з'яўляецца парадоксам. Таму было створана некалькі механізмаў, каб правіла большасці не вяло да ўціску меншасцяў. Адзін з такіх механізмаў — падзел улады. Правасуддзе павінны ажыццяўляць незалежныя суды. Патрэбна раз-

меркаванне абавязкаў і паўнамоцтваў прымаць рашэнні паміж цэнтральнымі і мясцовымі органамі. Незалежныя медыя ўвесь час правяраюць дзейнасць органаў улады і палітычных сходаў.

А рэгулярныя выбары ў палітычныя прадстаўнічыя органы, якія прымаюць рашэнні, раз за разам даюць грамадзянам магчымасць ствараць новыя большасці і адмаўляцца ад няўдалай палітыкі.

Бо ў рэшце рэшт менавіта самі грамадзяне адказваюць за захаванне дэмакратыі. Дэмакратыя патрабуе актыўных і неабыякавых выбаршчыкаў — не толькі ў час саміх выбараў, — выбаршчыкаў, якія ўключаюцца ў розныя пытанні, удзельнічаюць у дыскусіі і гатовыя ўдзельнічаць у грамадскай працы. Яна патрабуе выбаршчыкаў, якія самі дзейнічаюць паводле дэмакратычных прынцыпаў свабоды думкі і свабоды слова і паважаюць не толькі ўласную такую свабоду, але і свабоду іншых. Яна патрабуе, каб выбраныя прадстаўнікі розных партый былі гатовыя выслухоўваць погляды адно аднаго і знаходзіць баланс паміж інтарэсамі розных выбаршчыкаў, каб можна было знайсці рашэнні, якія найлепш служаць усяму насельніцтву.

Дэмакратыя ўключае разнастайнасць, але патрабуе супрацоўніцтва — на дэмакратычных падставах — паміж рознымі часткамі гэтай разнастайнасці. Яна таксама патрабуе агульнай сістэмы каштоўнасцяў і агульнага прызнання дэмакратычных прынцыпаў свабоды думкі, свабоды слова і права асобы на самавызначэнне.

Сфера ўплыву дэмакратыі

Грамадзянскія свабоды і правы, якія нельга абмяжоўваць, — неабходныя перадумовы дэмакратыі: выбарчае права, свабода

ствараць партыі і розныя групы інтарэсаў, свабода думкі і веравызнання, свабода слова і свабода друку. Без іх няма дэмакратыі.

Аднак дэмакратыя, як ужо гаварылася, азначае ўладу народа — а такая форма кіравання прадугледжвае і рэальныя магчымасці ўплываць на ўмовы і развіццё грамадства, якое, у сваю чаргу, фармуе ўмовы жыцця яго людзей. Каб выбары ў органы, якія прымаюць рашэнні, мелі сэнс, а не былі проста нагодай для нейкага агульнага выказвання поглядаў, выбары павінны весці да рашэнняў, якія ўплываюць на грамадства. Таму пытанне дэмакратыі ўключае і сферу яе ўплыву: што ўваходзіць у кампетэнцыю дэмакратычна выбраных органаў у прыняцці рашэнняў і якую ўладу яны павінны мець, каб ператвараць гэтыя рашэнні ў дзеянні?

Палітычныя партыі ў Швецыі маюць на гэта розныя погляды. Адрозненні тычацца галоўным чынам ролі ўрада — з аднаго боку, у эканамічнай палітыцы і ў пытаннях занятасці, а з другога — у палітыцы дабрабыту і размеркавання.

Існуе згода ў тым, што дэмакратыя, гэта значыць палітычна выбраныя прадстаўнічыя органы на нацыянальным і рэгіянальным/мясцовым узроўні, павінна адказваць за шэраг калектыўных паслуг, з якімі «рынак» ніколі не справіўся б, — такіх як правасуддзе, узброеныя сілы і інфраструктура. Ёсць таксама згода ў тым, што гэтыя дэмакратычна адказныя органы грамадства павінны адказваць за шэраг грамадзянскіх службаў, такіх як адукацыя і ахова здароўя, але погляды на маштаб і ўладкаванне гэтых паслуг разыходзяцца. Што да грамадскага рэгулявання сферы вытворчасці і рынку працы, тут ёсць і заўсёды былі выразныя разыходжанні ў поглядах.

За імі стаяць ідэалагічныя падзелы, якія, у сваю чаргу, адлюстроўваюць і розныя інтарэсы.

Ідэалогія і інтарэсы

Значная частка ўмоў жыцця асобы фармуецца грамадскімі структурамі. Калі магчымасць атрымаць адукацыю залежыць ад даходу бацькоў, некаторыя дзеці — як у першыя гады рабочага руху — на практыцы будуць пазбаўленыя вышэйшай адукацыі і, такім чынам, у дарослым узросце будуць мець абмежаваныя магчымасці. Калі доступ да дзіцячых садкоў ці догляду за пажылымі людзьмі залежыць ад уласных эканамічных рэсурсаў чалавека, уся адказнасць за такі догляд перакладаецца на сям'ю; на практыцы гэта звужае магчымасці жанчын.

Таму для сацыял-дэмакратаў дэмакратыя заўсёды азначала клопат пра тое, каб палітычна выбраныя прадстаўнічыя органы мелі дастаткова паўнамоцтваў, каб ствараць і падтрымліваць такія структуры, што маюць ключавое значэнне для дабрабыту і роўных магчымасцяў людзей у іх уласным жыцці. Гаворка ідзе пра паслугі, неабходныя практычна кожнаму, якія ў той ці іншай форме заўсёды патрабуюць укладанняў, большых за тое, што можа дазволіць сабе асобны чалавек. Прыклады такіх паслуг — адукацыя і ахова здароўя, а таксама культура, дзіцячыя садкі і догляд за пажылымі людзьмі. Ёсць і паслугі, неабходныя для функцыянавання эканомікі, працоўнага жыцця і, у выніку, усяго грамадства, — і роўны доступ усіх да такіх паслуг дазваляе эканоміцы, рынку працы і, у выніку, усяму грамадству функцыянаваць найлепшым чынам.

Для сацыял-дэмакратыі дэмакратыя павінна таксама абараняць грамадзян ад моцных эканамічных груп інтарэсаў, на якія самі грамадзяне не маюць уплыву і дзе розніца ў эка-

намічнай моцы інакш вяла б да вялікай няроўнасці. Працоўнае заканадаўства і заканадаўства пра працоўнае асяроддзе — прыклады такіх выраўноўвальных мер, як і сістэма сацыяльнага забеспячэння. Яны абараняюць ад такой эканамічнай залежнасці, якая змушала б людзей, проста каб выжыць, згаджацца на працу на вельмі дрэнных умовах.

Кансерватыўныя і ліберальныя партыі традыцыйна маюць важныя групы выбаршчыкаў з камерцыйнымі і прадпрымальніцкімі інтарэсамі. Таму яны крытычна ставяцца да мер, якія ўспрымаюць як рэгуляванне прадпрымальніцтва і, адпаведна, выраўноўванне розніцы ў эканамічнай моцы. Часта гэта датычыць мер палітыкі на рынку працы, а часам і экалагічнай палітыкі. Што да экалагічнай палітыкі, сённяшняя крытыка выяўляецца перадусім у барацьбе за тое, каб змякчыць пэўныя віды заканадаўства або абмежаваць пэўныя эканамічныя інструменты рэгулявання, а не каб наўпрост перашкодзіць ім ці скасаваць іх. Але з палітыкай на рынку працы — наадварот: апошнія дзесяцігоддзі ў многім былі часам яе паступовага падрыву, які ў шэрагу адносін узмацніў ціск на работнікаў і іх уразлівасць у працоўным жыцці.

У палітыцы дабрабыту сацыял-лібералы традыцыйна выступалі за даволі шырокія грамадскія абавязацельствы, тады як кансерватыўныя партыі схільныя да больш абмежаваных. Аднак прарыў рынкавага лібералізму ў канцы XX стагоддзя — як ужо адзначалася — адцясніў сацыяльны лібералізм, і ліберальныя партыі сёння ў цэлым глядзяць на меры размеркавальнай палітыкі — перадусім на сацыяльнае забеспячэнне — больш вузка, чым некалькі дзесяцігоддзяў таму.

Рынкавы лібералізм прывёў і да таго, што фінансаваная з падаткаў сфера дабрабыту — ахова здароўя, школьная адукацыя, сацыяльная апека — цяпер адкрытая для прыватных прадп-

рыемстваў, у тым ліку камерцыйных, што працуюць дзеля прыбытку. Гэтыя прадпрыемствы маюць поўную свабоду вырашаць, дзе адкрываць справу і на якія групы арыентавацца. Прынцып размеркавання паводле патрэбаў грамадзян на практыцы змяніўся на рынкавы прынцып размеркавання паводле разлікаў прыбытковасці вытворцы, што відавочна дае перавагу адным групам за кошт іншых. Кіраванне паводле інтарэсаў, што стаіць за гэтым, відавочнае. Мы вернемся да гэтага пытання ў раздзеле пра палітыку дабрабыту.

Легітымнасць дэмакратыі залежыць ад яе дзейснасці

Сфера ўплыву дэмакратыі за апошнія дзесяцігоддзі звузілася, у некаторых адносінах істотна. Часткова гэта звязана з тым, што палітычная аснова дэмакратыі — нацыянальная дзяржаўная ўлада — у перыяд эканамічнай глабалізацыі сапраўды мае менш прасторы для манеўру, чым раней. Але гэта звязана і з тым, што рэальныя паўнамоцтвы прымаць рашэнні ў той ці іншай форме былі перададзеныя наўпрост ад палітычна выбраных органаў так званаму «рынку».

На пытанне, якія задачы павінны вырашацца ў межах палітычнай дэмакратыі, няма канкрэтных і адназначных адказаў; гэта хутчэй пытанне, якое патрабуе пастаяннай праверкі. У розныя часы дамінуюць розныя праблемы, якія, у сваю чаргу, могуць патрабаваць рознага маштабу — і рознага ўладкавання — палітыкі. Палітычнае кіраванне можа зайсці занадта далёка і павесці нас у няправільным кірунку адносна яго першапачатковых намераў. Яно можа быць і занадта слабым — і таксама павесці нас не туды.

Аднак апошнія дзесяцігоддзі паказалі нам, што найбольш распаўсюджаны аргумент на абарону скарачэння палітычнага і дэмакратычнага кіравання — нібыта гэта павялічвае ўплыў

асобы — на справе азначае толькі пераразмеркаванне ўлады паміж рознымі групамі ў грамадстве. Эканамічна мацнейшыя групы атрымалі больш прасторы для манеўру, што само па сабе азначае больш свабоды для людзей з гэтых груп. Эканамічна слабейшыя групы праваліліся ў шчыліну, і ў выніку людзі з гэтых груп маюць менш свабоды.

У недэмакратычных тэндэнцыях, якія звычайна называюць агульным тэрмінам «правы папулізм», выразна відаць незадаволенасць і бяссілле перад развіццём грамадства, адчуванне, што назіраеш за ім збоку. Гэтая незадаволенасць у значнай ступені звязаная з недахопамі ў працы грамадскіх інстытутаў, магчыма, асабліва ў палітыцы дабрабыту. Таму, каб абараніць дэмакратыю, недастаткова праводзіць меры або фармаваць грамадскую думку на абарону такіх прынцыпаў, як свабода слова і свабода думкі. Легітымнасць дэмакратыі — адзіная сапраўдная і моцная абарона гэтых прынцыпаў, а гэтая легітымнасць патрабуе, каб дэмакратыя мела дастаткова сілы падтрымліваць грамадства, у якім людзі адчуваюць, што маюць уплыў.

Праўда, дэмакратыя ніколі не можа даць кожнаму магчымасць мець у грамадстве ўсё так, як хочацца. Але дэмакратыя павінна даць кожнаму магчымасць — словамі пісьменніка Фольке Фрыдэля — «удзельнічаць у тым, каб дзяліць і вырашаць» на роўных умовах з усімі іншымі. Калі такія магчымасці ёсць, лягчэй зразумець і прыняць абмежаванні, якія накладаюць наяўныя рэсурсы, а значыць, і тое, што не ўсе пажаданні могуць быць выкананыя і што адны патрэбы могуць насамрэч важыць больш за іншыя.

Неліберальная дэмакратыя

Дэмакратыя не бясспрэчная — нават у краінах, якія сёння маюць даўнія традыцыі дэмакратычнага кіравання. Ёсць сведчанні таго, што развіццё ў бок дэмакратыі ў шэрагу краін пачало паварочваць назад, а іншыя краіны адкрыта ўсталявалі недэмакратычнае кіраванне.

Гэты крах дэмакратыі ў многіх выпадках можна растлумачыць даволі проста: пэўныя групы, якія ўзялі пад кантроль важныя грамадскія інстытуты, такія як медыя, войска і паліцыя, відаць, здольныя ўтрымліваць гэтую ўладу, перашкаджаючы апазіцыі і не дапускаючы яе, кантралюючы грамадскую думку і кантралюючы фармальныя выбары. У іншых выпадках крах звязаны з тым, што пэўная ідэалогія — рэлігійная ці палітычная, — якую лічаць адзінай праўдай і ісцінай, становіцца самім падмуркам кіравання. Іншадумства тады адмаўляе гэтую праўду і ісціну, і таму яго нельга дапускаць. Дэмакратыя з яе патрабаваннем плюралізму поглядаў ужо немагчымая. Марксізм-ленінізм, фашызм і рэлігійная артадоксія як аснова палітыкі — усё гэта розныя варыяцыі на адну тэму.

У апошнія гады з'явілася новая форма недэмакратычнай ідэалогіі — так званая «неліберальная дэмакратыя». Гэта «дэмакратыя» без свабоды думкі, свабоды друку і незалежнай судовай сістэмы. Гэтая ідэя заснаваная на асаблівым тлумачэнні паняцця «дэмас», народ: слова «народ» ужываецца тут не так, як у класічным разуменні дэмакратыі, дзе яно азначае «усіх грамадзян» у процівагу кіруючай эліце, а як назва этнічнай і/або культурнай супольнасці ў нацыянальных межах. Таму палітычны спосаб кіравання, які называецца «дэмакратыяй», павінен быць уладкаваны так, каб выяўляць і ўмацоўваць гэтую супольнасць і яе аснову — агульную народную нацыянальную ідэнтычнасць. Неліберальная дэмакратыя не прызнае кла-

савых падзелаў і таму варожа ставіцца да прафсаюзаў і выступае супраць іміграцыі, якую ўспрымае як пагрозу нацыянальнай культуры краіны. Яна таксама вельмі кансерватыўная ў поглядах на сям'ю і на розныя ролі, што павінны адводзіцца мужчынам і жанчынам.



Публічнае спальванне «ненямецкіх» кніг і твораў студэнтамі берлінскіх універсітэтаў на Опернплац у Берліне, у ноч з 10 на 11 мая 1933 года

Аднак, хоць сам тэрмін «неліберальная дэмакратыя» адносна новы, сам светапогляд — нацыя як культурная/этнічная цэласнасць — старэйшы. Яго цалкам ці часткова можна знайсці ў нацыянальных і кансерватыўных рухах пачатку XX стагоддзя; адзін з прыкладаў — ідэалогія Шведскіх дэмакратаў з яе выразнымі элементамі ўяўлення пра «нацыю» як пра вынік спрадвечных гістарычных працэсаў, што стварылі асаблівую

нацыянальную ідэнтычнасць, адрозную ад той, што склалася ў іншых народаў.

Гэтая «неліберальная дэмакратыя» цесна звязаная з іншымі таталітарнымі ідэалогіямі, заснаванымі на ўяўленні пра адну пэўную праўду, агульнае вышэйшае вучэнне пра каштоўнасці, якое нібыта выяўляе інтарэсы ўсіх, якое нельга ставіць пад сумнеў і, адпаведна, ставіць пад сумнеў якое забаронена. Гэтая пэўная праўда, як ужо было паказана, можа мець розныя формы: палітычнай ідэалогіі, як у камуністычных дзяржавах, асаблівай рэлігіі, як у сучасным Іране, або пэўнай уяўнай нацыянальнай культуры адзінства і больш ці менш містычнай агульнай «сутнасці». Тыя, хто аспрэчвае гэтую праўду, — ворагі народа, і ўлада мае і права, і абавязак іх спыніць.

Яшчэ адна агульная рыса гэтых ідэалагічных недэмакратый — уяўленне, што гэтую агульную праўду нельга абмяркоўваць разам або ставіць на галасаванне, а тлумачыць яе можа толькі невялікая эліта, якая — зусім выпадкова — і ёсць група, што трымае палітычную ўладу. Нягледзячы на ўвесь націск на «народ», гэтыя ідэалогіі моцна іерархічныя, з выразнай стаўкай на моцнае і ўладнае кіраўніцтва, якое нібыта лепш за саміх людзей разумее, што ім насамрэч трэба. Гэта агульны назоўнік усіх таталітарных ідэалогій, незалежна ад палітычных ці рэлігійных перакананняў, на якіх яны грунтуюцца: яны аддаюць уладу невялікай групе, якую лічаць носьбітам правільнага тлумачэння, а людзям, чыё жыццё павінна рэгулявацца гэтымі ідэалагічнымі нормамі, не дазваляюць ніяк удзельнічаць у фармаванні гэтых нормаў.

Такія групы — правы папулізм, нацыянал-кансерватызм, неліберальная дэмакратыя ці як іх ні называй — у 2010-я гады дасягнулі значных поспехаў у многіх краінах: яны прыцягваюць усё больш выбаршчыкаў і ўплываюць на палітыку ў краінах

з даўняй палітычнай гісторыяй — у тым ліку ў ЗША і былых камуністычных дзяржавах. Тое, што недэмакратычныя рухі здольныя заваёўваць шмат галасоў на дэмакратычных выбарах, выклікае трывогу і мае выразныя паралелі з тым, што адбывалася ў 1930-я гады.

Прычыны з'яўлення такіх палітычных рухаў складаныя. У расслоеным грамадстве кіруючыя групы маюць высокі ўзровень свядомых ідэалагічных — недэмакратычных — памкненняў. Многія ж іх выбаршчыкі робяць свой выбар хутчэй з занепакоенасці развіццём грамадства, якое здаецца пагрозлівым і на якое яны не маюць уплыву, і з недаверу да волі і здольнасці палітычнага істэблішменту змяніць гэтае развіццё. Гэта не абавязкова азначае, што выбаршчыкі ведаюць і падзяляюць ідэалогію, што стаіць за гэтым.

Таму, каб абараніць дэмакратыю, трэба адначасова выкрываць недэмакратычныя ідэалогіі, што стаяць за гэтымі рухамі, і рашуча фармаваць грамадскую думку супраць іх, і паказваць, што ёсць палітычна паспяховыя адказы на тыя фактары грамадскага развіцця, якія выклікалі занепакоенасць і недавер, што выкарыстоўваюць гэтыя ідэолагі. Каб людзі давяралі дэмакратыі — як паказана вышэй, — у рэшце рэшт патрэбна здольнасць падтрымліваць грамадства, якое добра функцыянуе не толькі для пэўных груп, а для ўсіх.

Досвед Швецыі 1930-х гадоў гэта пацвярджае. Недэмакратычныя рухі ў тагачаснай Еўропе знаходзілі спрыяльную глебу ў эканамічнай няпэўнасці і недаверы да дэмакратычных інстытутаў; падобную заканамернасць можна ўбачыць і ў сённяшнім правым папулізме. Аднак у Швецыі, як і ў Даніі і Нарвегіі, нацызм/фашызм так і не здолеў па-сапраўднаму замацавацца, хоць такія рухі ў гэтых краінах былі. Адна з галоўных прычын гэтага — сацыял-дэмакратычная рэфармісцкая палі-

тыка, пабудаваная паводле агульных патрэбаў вялікіх груп насельніцтва, — такая як палітыка на рынку працы, сямейная палітыка і жыллёвае будаўніцтва. Гэта была палітыка, якая давала надзею на лепшую будучыню і на больш справядлівае грамадства.

Рэальныя і значныя вынікі рэформаў выявіліся толькі ў 1950-я і 1960-я гады. Тое, што адбывалася нешта новае, развіццё, на якое людзі адчувалі, што могуць уплываць, стварыла давер да дэмакратыі, які не пакінуў урадлівай глебы для аўтарытарных і недэмакратычных рухаў.

Гэта важныя ўрокі і арыенціры на будучыню.

Нялёгкая дэмакратыя

Дэмакратыя — няпростая форма кіравання і, магчыма, не такая эфектная, як некаторыя іншыя. Працэсы прыняцця рашэнняў могуць быць доўгімі і павольнымі, паміж процілеглымі патрэбамі і інтарэсамі заўсёды неабходныя кампрамісы і ўзаемныя саступкі, вынікаў можна чакаць доўга, на шляху заўсёды стаяць эканамічныя абмежаванні і знешнія фактары, на якія нацыянальная дэмакратыя не мае ўплыву. Можа вабіць і ўяўленне пра больш просты і хуткі шлях да вынікаў — пра мацнейшых лідараў, якія, здаецца, умеюць даводзіць справу да канца, або пра кампетэнтных экспертаў, якія без шматлікіх зацяжных дыскусій праводзяць тыя меры, што аб'ектыўна найбольш мэтазгодныя.

Аднак грамадскія змены, якімі б выдатнымі яны ні здаваліся, нельга ажыццявіць зверху. Грамадскія змены нельга навязаць грамадзянам — іх павінны падтрымліваць самі грамадзяне, інакш яны не будуць ні легітымнымі, ні трывалымі. Значная частка таго недаверу да дэмакратыі, з якім мы сёння сутыкаемся ў заходнім свеце, звязаная са зменамі, якія ў прынцыпе

праводзіліся зверху і пры якіх тыя, чый голас не быў належна пачуты, цяпер выбіраюць бунт. Паводле слоў Улафа Пальме ў праграме Сацыял-дэмакратычнай партыі 1975 года, грамадскія змены павінны:

> «абапірацца на волю і намаганні народа. (...) Іх трэба ажыццяўляць шляхам дэмакратычнага пераконвання, у адкрытай дыскусіі, з увагай і павагай да поглядаў іншых, як таго патрабуе дэмакратыя. Гэты шлях можа здавацца цяжкім і доўгім. Але ён вядзе да абсалютна вырашальнай перавагі: грамадскія змены можна ажыццяўляць пры актыўным удзеле грамадзян, і іх вынікі пускаюць моцныя карані сярод грамадзян».

Ідэйнае развіццё сацыял-дэмакратыі: свет вытворчасці

Марксізм

КАРЛ МАРКС (1818–1883) быў цэнтральнай фігурай у развіцці сацыялістычнай тэорыі, якое пачалося прыблізна ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Большасць сваіх прац ён напісаў у цесным супрацоўніцтве з Фрыдрыхам Энгельсам (1820–1895). Рабочы рух, які тады зараджаўся ў Еўропе, знаходзіўся пад моцным уплывам Маркса і Энгельса, аднак, хутчэй за ўсё, з адлегласці часу гэтыя постаці здаюцца больш значнымі, чым былі ў вачах сучаснікаў. Трэба згадаць і іншых важных тэарэтыкаў: напрыклад, Аўгуста Бебеля (1840–1913), Фердынанда Ласаля (1825–1864) і нямецкую групу, вядомую як «катэдэр-сацыялісты» (*Kathedersozialisten*), — гістарычную школу эканамічнай навукі, прадстаўнікі якой выступалі за сацыяльную палітыку.

Усіх іх аб'ядноўвала асноўная ідэя — крытыка нерэгуляванага капіталізму іх часу і выкліканых ім сацыяльных разрываў. Адрозніваліся яны часткова поглядамі на тое, як гэтую праблему вырашыць, а часткова — ацэнкамі будучага развіцця грамадства.

Тым не менш тэорыі Маркса і Энгельса пратрымаліся ў дыскусіі даўжэй за іншыя і праз камуністычны Савецкі Саюз, а потым і камуністычны Кітай паўплывалі на ўсю гісторыю XX стагоддзя. Тое, што і савецкі, і кітайскі сацыяльныя пераваротыадбыліся па сутнасці зусім не так, як прадказваў Карл Маркс, — гэта ўжо зусім іншая гісторыя. У Швецыі ранніх сацыял-дэмакратаў натхнялі тэорыі Маркса, хоць для многіх важнай крыніцай натхнення быў асабліва Ласаль. Заснавальнікі сацыял-дэмакратыі ўнеслі ў свае тэорыі і спецыфічна шведскія рысы, якія адрознівалішведскую сацыял-дэмакратыю ад кантынентальнай. Вельмі пазітыўнае стаўленне да прафсаюзаў, якое склалася вельмі рана, не адпавядала арта-

даксальнаму прачытанню Маркса; затое тут выразна адчуваецца ўплыў ранніх шведскіх народных рухаў, што выраслі са структур самакіравання старых сялянскіх абшчын.

Сацыял-дэмакраты прыстасоўвалі або пераасэнсоўвалі тэорыі Маркса ў святле ўласнага досведу, дадаючы або адкідаючы тое, што лічылі патрэбным. Гэта датычыць большасці таго, што называюць марксізмам: існуюць інтэрпрэтацыі і пераклады, на якія паўплывалі і грамадства, і час, калі былі зробленыя першыя інтэрпрэтацыі. Усе палітычныя групы, якія пераймалі марксісцкі лад мыслення, рабілі ўласны адбор і ўласныя пераклады.

Маркс быў адначасова гісторыкам, сацыёлагам і эканамістам і стаў важным каталізатарам як для гістарычнай навукі, так і для сацыялогіі. Часткі яго даследаванняў капіталізму, напрыклад пра ўласцівую яму схільнасць да канцэнтрацыі, застаюцца актуальнымі і сёння, тады як іншыя часткі, такія як яго тэорыя дадатковай вартасці, даўно састарэлі.

Маркс актыўна ўдзельнічаў у палітычных дыскусіях свайго часу, але яго сацыяльная тэорыя не была ні палітычнай ідэалогіяй, ні палітычнай праграмай дзеянняў. Ён адпрэчваў усе спробы ператварыць свае тэорыі ў ідэалогію, і, як кажуць, аднойчы ў роспачы ўсклікнуў: «Я не марксіст». У супрацоўніцтве з Фрыдрыхам Энгельсам ён распрацаваў гісторыка-філасофскую тэорыю заканамерных этапаў грамадскага развіцця. Абапіраючыся на эканамічную гісторыю Еўропы, ён зрабіў шэраг высноў пра будучае развіццё.

Класавая барацьба і крах капіталізму

У *«Маніфесце Камуністычнай партыі»* 1848 года сцвярджаецца: «Гісторыя ўсіх дагэтуль існаваўшых грамадстваў была гісто-

рыяй барацьбы класаў». Тэрмін «класавая барацьба» абазначае канфлікты за ўладу над сродкамі вытворчасці і за размеркаванне вынікаў вытворчасці, дзе лінія гэтага канфлікту праходзіць паміж класам (класамі), што кантралююць асноўныя сродкі вытворчасці — такія як зямля, прыродныя рэсурсы, капітал, — і класам (класамі), якія ў прынцыпе такой улады не маюць. Такім чынам, «клас» вызначаецца становішчам у свеце вытворчасці, а не якімі-небудзь іншымі сацыяльнымі прыкметамі.

Паміж гэтымі класамі існуюць вялікія канфлікты інтарэсаў у тым, што датычыць арганізацыі вытворчасці, размеркавання яе вынікаў і грамадскіх інстытутаў, адказных за заканадаўства і забеспячэнне выканання законаў. Клас, які валодае асноўнымі фактарамі вытворчасці або кантралюе іх, па самой сваёй сутнасці можа кіраваць светам вытворчасці ў адпаведнасці са сваімі інтарэсамі і выкарыстоўваць дзеля той самай мэты заканадаўчую ўладу.

Тэрмін «клас» у гэтым сэнсе ніколі не быў простым і адназначным для вызначэння — не быў ён такім і ў часы Маркса. Унутры групы «ўласнікаў» таксама ёсць розніца ва ўладзе і ўплыве паміж тымі, хто валодае многім, і тымі, хто валодае няшмат, і гэта таксама дае розны рэальны ўплыў на эканоміку. Унутры групы «няўласнікаў» была і застаецца розніца ў прафесійнай кваліфікацыі і ў тым, наколькі лёгка замяніць чалавека на працы, а гэта таксама дае розныя пазіцыі сілы ў працоўным жыцці.

Таму Маркс увёў у свой аналіз тагачаснага грамадства тэрмін «сярэднія класы», каб абазначыць групы — напрыклад, рамеснікаў, чыноўнікаў, лекараў і настаўнікаў, — якія не былі такімі падначаленымі, як рабочы клас, але і не мелі такой улады і ўплыву, як капіталісты і прамысловыя прадпрымальнікі.

Тым не менш Маркс лічыў, што сярэднія класы павінны далучыцца да пралетарыяту, апусціцца да рабочага класа. Такое развіццё прывяло б да таго, што застанецца толькі два класы — пралетарыят і буржуазія, — якія сутыкнуцца адзін з адным, каб скончыць класавую барацьбу ў «апошнім баі».

Маркс і Энгельс лічылі, што грамадскае развіццё рухае барацьба за сродкі вытворчасці; такім чынам, «класавая барацьба» — гэта барацьба за ўладу над вытворчасцю. Аднак змяніць структуры ўлады толькі палітычнымі сродкамі немагчыма. Спачатку патрэбныя новая тэхналогія або іншыя эканамічныя змены, якія зробяць новы вытворчы лад неабходным і магчымым. Клас, які кантралюе ключавыя фактары вытворчасці пры гэтым новым ладзе, зможа тады перахапіць уладу ў класа, што пануе пры старым ладзе.

Паводле прагнозу Маркса, класавая барацьба скончыцца тады, калі сацыялістычнае грамадства — бясклассавае грамадства — будзе сумесна валодаць сродкамі вытворчасці. Аднак такая развязка павінна была стаць вынікам развіцця прадукцыйных сіл: вынікаў вытворчасці мусіла стаць так шмат, каб іх хапала для дабрабыту ўсіх, — і тым самым зніклі б канфлікты інтарэсаў вакол свету вытворчасці і размеркавання рэсурсаў, а любыя канфлікты за ўладу і размеркаванне рэсурсаў — класавая барацьба — страцілі б сэнс.

І менавіта капіталізм, паводле Маркса, павінен быў запусціць гэтае развіццё прадукцыйных сіл; капіталізм быў, проста кажучы, неабходнай перадумовай сацыялістычнага грамадства. Аднак няздольнасць капіталізму справіцца з магутнымі эканамічнымі сіламі, якія ён сам жа і развіў, і справядліва размеркаваць вынікі вытворчасці непазбежна выклікала б такую сацыяльную напружанасць і такія эканамічныя крызісы, што грамадства непазбежна абрынулася б. Вось тады і адбыўся

б апошні бой паміж класамі — буржуазіяй і пралетарыятам. Пралетарская рэвалюцыя перамагла б, сродкі вытворчасці сталі б калектыўнымі, і ўзнікла б бясклясавае грамадства.

Каб карціна была поўнай, трэба таксама дадаць, што тэорыя Маркса не апісвае дакладна, як павінны былі б адбыцца рэвалюцыйныя — гэта значыць поўныя і рэзкія — змены і як выглядаў бы будучы свет вытворчасці. Тэорыя Маркса апісвае (уяўны) гістарычны працэс і, як ужо гаварылася, не з'яўляецца ні палітычнай, ні эканамічнай праграмай дзеянняў.

Спадчына Маркса

ТАКІМ ЧЫНАМ, ТЭОРЫІ Маркса і Энгельса трэба разглядаць як (уяўную) навуковую сістэму развіцця, мэта якой — даць схемы развіцця свету і чалавечага грамадства, схемы, якія, згодна з гэтымі тэорыямі, падпарадкоўваюцца пэўнай заканамернасці.

Гэтае амбіцыйнае імкненне растлумачыць усё наша існаванне адной цэласнай мадэллю тыповае для XIX стагоддзя. Вера ў тое, што грамадства падпарадкоўваецца нейкаму закону, які можна адкрыць і даказаць навуковымі метадамі, была пашыраная ў многіх галінах. Яе выразна натхнялі вялікія поспехі прыродазнаўчых навук у XVIII і XIX стагоддзях, якія выявілі цэласныя і вытлумачальныя структуры ў з'явах, што раней лічыліся праявамі дзеянняў звышнатуральных сіл. У той час было натуральна лічыць, што падобныя заканамернасці можна знайсці і ў грамадскім развіцці.

Сёння нават прыродазнаўцы не сцвярджаюць, што могуць растлумачыць чыста фізічныя працэсы як прадказальныя сістэмы, цалкам падпарадкаваныя законам, — а тым больш гэтага не сцвярджаюць грамадазнаўцы. Аднак можна выявіць

сувязі і верагоднасці. Можна вызначыць пэўныя механізмы, якія ўплываюць на эканоміку і грамадскае жыццё, і ў пэўнай ступені прадказаць, як гэтыя механізмы будуць дзейнічаць.

Аднак у эканоміцы і грамадстве, дзе дзейнічаюць мільёны і мільярды людзей, дзе пераплятаецца мноства патрэб і жаданняў і дзе мноства розных узаемадзейных сіл — адны ў супрацоўніцтве, другія ў процідзеянні — увесь час знаходзяцца ў руху, ніколі немагчыма дакладна прадказаць, у якім кірунку пойдзе такое развіццё. Такое развіццё ніколі не прадвызначанае. Эканамічныя і тэхналагічныя перадумовы, што ляжаць у яго аснове, — важныя фактары развіцця, але яно не ідзе механічна за гэтымі перадумовамі; на яго ўплываюць палітычныя і грамадскія рухі, якія, у сваю чаргу, нараджаюць контррухі ў бесперапынным працэсе змен.

Сацыял-дэмакратыя ў Швецыі даўно адмовілася ад уяўленняў пра заканамернае развіццё да пэўнага тыпу грамадства. Адзінае са спадчыны Маркса, што партыя захавала, — гэта інструменты аналізу, якія дае гістарычна-матэрыялістычны падыход, і погляд на ролю эканамічных канфліктаў інтарэсаў. Аднак важна падкрэсліць, што гаворка ідзе пра інструменты, якія выкарыстоўваюцца, каб зразумець рухі і структуры, а таксама грамадства і эканоміку, — а не пра нейкі гатовы чарцёж, дзе можна знайсці гатовыя адказы.

У некаторых левых партыях Маркса і «марксізм» (або ўяўленні пра «марксізм») у пэўныя перыяды ўспрымалі амаль як рэлігійны тэкст, у якім нават самыя цьмяныя словы служаць арыенцірам, які нельга ставіць пад сумнеў. Такія тэндэнцыі, хоць і не такія відавочныя, як раней, можна сустрэць і ў сённяшняй дыскусіі. Такі аднабаковы літаральны падыход надзвычай небяспечны — і гэта датычыць усіх тэорый, палітычных ці рэлігійных, якія ўспрымаюцца як Ісціна з вялікай літары. Гіс-

торыя камунізму паказвае нам, наколькі небяспечнай можа быць такая аднабаковасць і наколькі яна непасрэдна супярэчыць ідэалу свабоды і роўнасці.



Карл Маркс на фотаздымку Джона Мэйала, 1875 год, і тытульны ліст першага тома «Капіталу» (Гамбург, Otto Meissner, 1867)

Грамадскае развіццё і грамадскія змены — бесперапынныя працэсы, і немагчыма вызначыць нейкую канчатковую мэту ў выглядзе сістэмы, якая потым будзе існаваць вечна і ніколі не зменіцца. Тэхналагічнае і эканамічнае развіццё па-новаму ставіць сацыяльныя праблемы і выклікі, а грамадскі лад па самой сваёй сутнасці заўсёды павінен даваць людзям рэальныя магчымасці самім кіраваць сваім жыццёвым выбарам — а ў замкнёных, завершаных сістэмах гэта немагчыма. Уяўленні пра нейкую самарэгулявальную, ідэальна дзейную сі-

стэму ў гэтым кантэксце гэтак жа памылковыя і гэтак жа небяспечныя — незалежна ад таго, левыя яны ці правыя.

Магчымасць наблізіцца да ўвасаблення такіх ідэалаў, як свабода і роўнасць, можна знайсці толькі ў непрадузятым абмеркаванні метадам спроб і памылак тых сродкаў, якія пры пэўных знешніх умовах, што пастаянна мяняюцца з часам, ствараюць найлепшыя перадумовы для дасягнення жаданага выніку. І гэтага немагчыма дасягнуць літаральным прачытаннем таго ці іншага настаўніка, які дзейнічаў у іншую эпоху і ў іншым свеце.

Рэвалюцыя ці рэформа?

У ПРАЦЫ «ДА КРЫТЫКІ палітычнай эканоміі» (1859), папярэдняй да яго галоўнага твора *«Капітал»*, Маркс сцвярджаў, што ніводная сістэма вытворчасці не сыходзіць са сцэны, пакуль не разгорне ўвесь свой патэнцыял. Іншымі словамі, грамадскія змены разглядаюцца як вынік тэхналагічнага, эканамічнага і сацыяльнага развіцця, а не палітычна кіраваных дзеянняў. Па сутнасці, гэтая тэорыя выключае палітыку як сродак вырашальных грамадскіх змен, бо яны залежаць ад пэўных эканамічных працэсаў, якія непазбежна падпарадкоўваюцца ўласнай унутранай логіцы.

Аднак проста сядзець склаўшы рукі і чакаць развіцця — асабліва калі яго чакаюць толькі ў нявызначанай будучыні — даволі слабая палітычная праграма. Тым больш слабая, калі штодзённыя ўмовы жыцця многіх людзей невыносна цяжкія, а патрабаванне змен становіцца амаль выбухова моцным. Таму ў канцы XIX стагоддзя, калі сацыялістычныя групы пачалі ўсё больш набіраць сілу, было распрацавана некалькі розных стратэгій, каб, так бы мовіць, паскорыць развіццё. Не-

каторыя з іх можна назваць пераасэнсаваннем Карла Маркса, а іншыя паступова азначалі больш свабодны і пошукавы падыход, які вёў да новых палітычных высноў.

Гэтыя дыскусіі прывялі да таго, што сацыялістычныя партыі ў Еўропе і Расіі пачалі падзяляцца: адны рушылі ў рэфармісцкім кірунку, другія — у рэвалюцыйным. Гэты працэс расцягнуўся ў часе, і ні рэфармісцкая, ні рэвалюцыйная ідэалогія не склаліся канчаткова аж да канца 1930-х гадоў.

Пачаткам падзелу сталі дыскусіі пра гвалт як метад наблізіць чаканы крах капіталізму, але спачатку ніхто не меркаваў, што сам крах можна апярэдзіць. Абодва кірункі прымалі асноўны тэзіс, што сапраўднае, вялікае ператварэнне можа адбыцца толькі тады, калі ўмовы вытворчасці паспеюць. Па сутнасці, спрэчка ішла пра тое, як выкарыстаць час да гэтага, каб як мага лепш падрыхтавацца і падштурхнуць чаканае развіццё. Іншымі словамі, на пачатку XX стагоддзя панавала перакананне, што свет набліжаецца да вялікага пераваротy.

Многія сацыялісты бачылі ў Першай сусветнай вайне, у якой ваявалі паміж сабой старыя вялікія еўрапейскія дзяржавы пад уладай вышэйшых класаў, прэлюдыю да гэтага пераваротy. Царскае самаўладдзе ў Расіі было скінута буржуазнай рэвалюцыяй у сакавіку 1917 года. Позняй восенню таго ж года гэты рэжым скінулі бальшавікі на чале з Уладзімірам Леніным. Бальшавікі ў духу Карла Маркса абвясцілі дыктатуру пралетарыяту, хоць Расія не была ні сталай, ні нават нясталай капіталістычнай індустрыяльнай краінай, гатовай да сацыяльных змен; наадварот, Расія была феадальным аграрным грамадствам.

Аднак тады верылі, што сусветная вайна прывядзе да рэвалюцыі і ў больш сталых капіталістычных краінах, такіх як Германія, Францыя і Вялікабрытанія, і гэта падтрымае новую ра-

сійскую сацыялістычную дзяржаву. Гэтага не адбылося. У выніку Ленін і расійская Камуністычная партыя распрацавалі тэорыю, паводле якой рэвалюцыя магчымая, так бы мовіць, датэрмінова: калі ўжо вядома, чым усё скончыцца, навошта адразу не прыйсці да пэўнага выніку, не марнуючы часу на чаканне?

Рэфармісцкія ж групы, наадварот, хацелі пачаць мяняць і паляпшаць жыццё тут і цяпер. Замест аднаго адзінага і гвалтоўнага пераўтварэння яны бачылі магчымасць паступова набліжацца да больш роўнага і справядлівага грамадства. Калі капіталізм ужо стварыў такія магутныя прадукцыйныя сілы, навошта чакаць яго краху, каб пачаць уводзіць больш справядлівае размеркаванне вынікаў вытворчасці? Чаму не пачаць адразу?

Абодва кірункі ўтрымліваюць у сабе выразнае разыходжанне ў поглядах на дэмакратыю.

Для рэвалюцыйных груп задача палягала ў тым, каб ажыццявіць гістарычна прадвызначанае развіццё да сацыялістычнага грамадства. Ідэйна вышкаленыя марксісты ў Камуністычнай партыі адказвалі за правільнае тлумачэнне таго, чаго патрабуе такое развіццё, і гэты падыход не дапускаў ніякай апазіцыі, бо апазіцыя па азначэнні была памылковай. Дапусціць хоць якую-небудзь апазіцыю азначала б рызыкаваць тым, што прадвызначанае развіццё запаволіцца або сапсуецца. Гэта таксама азначала, што дэмакратычнае патрабаванне свабоды слова і думкі было немагчымым.

Па той самай прычыне сяброўства ў Камуністычнай партыі не было адкрытым. У сябры толькі выбіралі, і толькі пасля таго, як чалавек даказваў, што адпавядае шэрагу ўстаноўленых існуючай партыйнай арганізацыяй патрабаванняў для прыёму, у тым ліку разуменню асаблівай савецкай марксісцкай інтэрп-

рэтацыі, вядомай як марксізм-ленінізм. Іншымі словамі, наватарства не віталася.

Для рэфармісцкіх партый, наадварот, дэмакратыя была і канчатковай мэтай, і сродкам яе дасягнення. Асноўная ідэя — палепшыць умовы жыцця работнікаў — патрабавала, каб яны зыходзілі ў сваіх дзеяннях з патрабаванняў і патрэб гэтых людзей, а не з тэорый, створаных без сувязі з рэальнай праблемай. Такі погляд, у сваю чаргу, патрабаваў шырокага палітычнага працэсу, каб аб'яднаць вялікія групы людзей; таму сяброўства ў партыі было адкрытае для ўсіх, хто выяўляў цікавасць, а партыі імкнуліся да масавага сяброўства, каб стаць народнымі рухамі.

Партыі, якія выбралі рэвалюцыйную стратэгію, з часам сталі называцца камуністамі. Тыя, што выбралі рэфармісцкую стратэгію, называлі сябе сацыял-дэмакратамі.

Рэфармісцкая мадэль развівалася перадусім у Паўночных краінах, Германіі, Нідэрландах і Вялікабрытаніі. Рэвалюцыйная мадэль мела сваю апору ў Расіі, або, пасля 1917 года, у Савецкім Саюзе, а потым у Кітаі (з 1949 года).

Рэфармісцкія партыі, вядома, развіваліся не аднолькава: сваю ролю адыгрывалі нацыянальныя абставіны. Аднак у палітыцы, за якую выступаюць гэтыя партыі, можна знайсці шэраг асноўных падабенстваў: фінансаванне з падаткаў такіх сацыяльных паслуг, як адукацыя і ахова здароўя, і матэрыяльная забяспечанасць на выпадак хваробы і беспрацоўя. Эканоміка грунтуецца на прыватным прадпрымальніцтве, але заробкі і ўмовы працы вызначаюцца сумесна ў пагадненнях паміж наймальнікамі і прафсаюзамі — у некаторых краінах пры падтрымцы заканадаўства пра мінімальную зарплату. Правілы эканамічнай гульні ўстанаўліваюцца палітычнымі рашэннямі, якія абараняюць інтарэсы грамадства і работнікаў.

Міжнародныя даследаванні часта прыводзяць асабліва Паўночныя краіны, дзе сацыял-дэмакратыя мае найбольш трывалыя пазіцыі, як прыклад таго, як паспяхова спалучаць палітыку дабрабыту з эканамічнай эфектыўнасцю і дзе палітычная дэмакратыя вельмі моцная. Да 1990-х гадоў падтрымка паўночнай сацыял-дэмакратыі выбаршчыкамі таксама была вельмі моцнай.

Аднак бальшавіцкая рэвалюцыя 1917 года вырасла не з масавых народных пратэстаў супраць прыгнёту царскага самаўладдзя: гэта была невялікая група рэвалюцыянераў, якая захапіла палітычную ўладу сілай. Новы рэжым нацыяналізаваў усю вытворчасць, але так і не ўвёў у дзеянне ніякіх прынцыпаў уплыву работнікаў на працоўнае жыццё і грамадства. На практыцы адзіным вынікам рэвалюцыі стала замена эліты пры ўладзе — старой арыстакратыі — новай элітай, кіруючай наменклатурай Камуністычнай партыі. Былі ўведзеныя некаторыя асноўныя сацыяльныя рэформы, такія як права на адукацыю і медыцынскую дапамогу. Аднак палітычны прыгнёт не змяніўся і дзесяцігоддзямі заставаўся надзвычай бязлітасным.

Рэжым рабіў вялікую стаўку на меркаванне, што індустрыялізацыя краіны і індустрыялізацыя наогул азначаюць, як і ў іншых частках свету, эканамічны рост. Цэнтралізаванае кіраванне эканомікай давала пазітыўны эфект у гэтыя дзесяцігоддзі, бо гаворка ішла перадусім пра мабілізацыю рэсурсаў для асноўных інвестыцый у базавыя галіны прамысловасці і фактары вытворчасці, такія як будынкі, машыны і інфраструктура. «Касмічная гонка» паміж Савецкім Саюзам і ЗША, якая пачалася ў сярэдзіне 1950-х і працягвалася да сярэдзіны 1970-х гадоў, паказала, што ў некалькіх адносінах Савецкі Саюз быў тэхналагічна добра развіты.

Аднак пасля першых этапаў індустрыялізацыі пачалі расці патрабаванні да дыферэнцыяцыі, гнуткасці і спецыялізацыі. Гэтыя патрабаванні цяжка сумясціць з жорсткім цэнтралізаваным кіраваннем. Негнуткасць і эканамічнай, і палітычнай сістэмы ў Савецкім Саюзе перашкаджала любому далейшаму эканамічнаму развіццю, і калі ў 1980-я гады пачаўся новы, больш адкрыты палітычны курс, было ўжо позна. Сістэма абрынулася пад цяжарам уласных унутраных супярэчнасцяў — як нейкае іранічнае перакуленне тэзіса Маркса пра крах капіталізму.

Апошняя заўвага да старой спрэчкі пра рэформу ці рэвалюцыю: ідэя датэрміновай рэвалюцыі не вытрымала праверкі. Рэфармізм даказальна з'яўляецца больш устойлівай альтэрнатывай. Прычына гэтага, па сутнасці, простая: незалежна ад таго, ці прыходзіць партыя да ўлады праз перамогу на выбарах, ці праз дзяржаўны пераварот, рэальная праца па далейшым практычным ажыццяўленні рэформ патрабуе вырашэння дзясяткаў тысяч дэталёвых пытанняў — і гэты працэс да таго ж заўсёды залежыць ад эканамічных рэалій. Вялікай змены сістэмы, пра якую марылі старыя рэвалюцыянеры, — каб адным махам стварыць зусім іншае грамадства і іншую эканоміку, — проста не існуе.

Сведчаць пра гэта не толькі падзеі ў камуністычным Савецкім Саюзе, але і досвед шматлікіх пазнейшых пераваротаў, якія называлі «рэвалюцыямі». Яны скідалі старыя рэжымы і неслі надзею на нешта зусім іншае і лепшае — але хутка траплялі ў рукі новых кіруючых груп, гэтак жа недэмакратычных, як і старыя.

Грамадскія змены — заўсёды доўгі працэс. І такія працэсы ніколі не могуць вызначацца грамадзянамі з ліку кіруючай эліты насуперак тым, каго гэтыя змены датычаць. З гэтага

пункту гледжання рэфармізм — адзіны магчымы шлях наперад.

Класавая барацьба ці дзяржава дабрабыту?

ПРАГРАМА, ЯКУЮ ВЫПРАЦАВАЎ ранні рабочы рух, грунтавалася на марксавым прагнозе развіцця: лічылася, што мы жывём напярэдадні «апошняй бітвы» за ўладу над светам вытворчасці. У гэтай бітве супраць адзін аднаго павінны былі стаць толькі два класы — пралетарыят і буржуазія. Маркс лічыў, што сярэдні клас пралетарызуецца і апусціцца да ўзроўню рабочага класа.

Гэтага не адбылося. Наадварот, статыстыка часоў мінулага рубяжа стагоддзяў паказвае, што сярэдні клас і вырас, і разбагацеў, а ўмовы жыцця рабочага класа таксама палепшыліся, хоць і заставаліся на нізкім узроўні. Так узнікла так званая барацьба вакол рэвізіянізму, дзе тэрмін «рэвізіянізм» азначаў перагляд тэорый Маркса пра будучае развіццё грамадства.

Пасля такога перагляду ідэя гістарычна наканаванай рэвалюцыі ўжо не здавалася такой відавочнай: стала ясна, што грамадства можа змяняцца і без яе. Гэта ўзмацніла тагачасную дыскусію пра стратэгію ўнутры рабочага руху, якая ў рэшце рэшт прывяла да падзелу на рэфармісцкія і рэвалюцыйныя партыі (гл. раздзел «Рэвалюцыя ці рэформа?»).

Дыскусія вакол рэвізіянізму ўскосна паспрыяла і развіццю ідэі дзяржавы дабрабыту.

Уяўная рэвалюцыя павінна была стаць рэвалюцыяй большасці: адзіны рабочы клас супраць адзінага класа капіталістаў. Ці, іншымі словамі, паўстаннем вялікай большасці супраць нешматлікай меншасці.

Гэтак жа і рэфармісцкая палітыка, каб быць здзяйсняльнай, патрабуе падтрымкі большасці народа. Аднаго толькі рабочага класа ў традыцыйным сэнсе, без пралетарызаванага сярэдняга класа, для большасці не хапала. Таму, калі тагачасны сярэдні клас мусіў не толькі захавацца, але нават расці, трэба было знайсці іншыя спосабы зламаць пануючае становішча інтарэсаў капіталу ў грамадстве і схіліць сярэдні клас да падтрымкі палітыкі рэформаў і тых сацыяльных пераменаў, якіх яна патрабавала.

У 1920-я гады ў сацыял-дэмакратыі вялася пэўная дыскусія пра змену назвы партыі: «Сацыял-дэмакратычная народная партыя» замест «Сацыял-дэмакратычная рабочая партыя». Адным з галоўных прыхільнікаў змены назвы быў старшыня партыі Пер Альбін Хансан. Ён даводзіў, што новая назва павінна выразна паказваць: сацыяльныя пераўтварэнні, якіх дамагаюцца сацыял-дэмакраты, не служаць асобным інтарэсам пэўных груп насельніцтва, а вядуць да грамадства з роўнымі і справядлівымі ўмовамі для ўсіх.

Скарыстаўшы як метафару вобраз добрага дома, або «народнага дома» (*folkhemmet*), — пазней гэта стане вядома як дзяржава дабрабыту, — які ён прадставіў у славутай прамове ў Рыксдагу ў 1928 годзе, Хансан развіваў гэтую тэму: грамадства павінна стаць больш падобным да «добрага дома», дзе пануюць роўнасць, дабрыня і гатоўнасць дапамагчы. У добрым доме людзі не глядзяць адно на аднаго звысоку, не прыгнятаюць адно аднаго і не здабываюць выгоды за кошт іншых. Далей ён звязаў гэта з грамадствам у цэлым:

> «Калі перанесці гэта на вялікі дом народа і грамадзян, гэта азначала б ліквідацыю ўсіх сацыяльных і эканамічных бед, якія цяпер раздзяляюць грамадзян на прывілеяваных і прыгнечаных, на тых, хто пануе, і тых, кім пануюць, на рабаўнікоў і абрабаваных. Шведскае грамадства яшчэ не стала такім добрым домам для народа. Тут, праўда, можна знайсці пэўную фармальную роўнасць, роўнасць палітычных правоў, але сацыяльна класавыя падзелы захоўваюцца, а эканамічна пануе дыктатура нешматлікіх. (...) Калі шведскі народ хоча дасягнуць гэтага добрага народнага дома, трэба ліквідаваць класавыя падзелы, пашырыць сацыяльную апеку, арганізаваць роўнае эканамічнае перараспределение, даць работнікам большы голас у эканамічным кіраванні краінай, ажыццявіць дэмакратыю і пашырыць яе як на сацыяльнае, так і на эканамічнае жыццё».

Такім чынам, прамова пра «народны дом» датычыць роўнасці, не ў апошнюю чаргу роўнага размеркавання ўлады і ў эканоміцы, і ў грамадстве, і ў ёй выразна — калі хочаце, па-сацыялістычнаму — праведзена мяжа супраць капіталізму і ўлады меншасці. Аднак камуністы крытыкавалі ідэю «народнага дома» як здраду рабочаму класу, г. зн. як «несацыялістычную». Іх уласным лозунгам у 1930-я гады было «клас супраць класа», а «класавая барацьба» вызначалася як барацьба за інтарэсы рабочых.

Такім чынам, «клас» у гэтым кантэксце вызначаўся ў сацыялагічных катэгорыях: «рабочы клас» быў сацыяльна акрэсленым паняццем у адрозненне ад «сярэдняга класа». Ідэя «народнага дома», наадварот, грунтавалася на шырэйшым разуменні класа — паводле становішча розных сацыяльных груп адносна буйных капіталістычных інтарэсаў, — і, калі заставацца вернымі марксісцкай тэрміналогіі, гэта насамрэч адпавядае марксаваму вызначэнню класа. «Народны дом» быў спосабам сфа-

рмуляваць і абгрунтаваць палітыку роўнасці, якая аб'ядноўвала інтарэсы розных груп, што не валодалі эканамічнай уладай, у імкненні да іншага размеркавання вынікаў вытворчасці і новых умоў працы.

Ідэі «народнага дома» былі адным з некалькіх складнікаў рэфармізму, які паступова развіваўся ў сацыял-дэмакратыі на працягу 1920-х і 1930-х гадоў і ўключаў, напрыклад, ідэі актыўнай эканамічнай палітыкі (з часам названай кейнсіянствам) і ідэі Нільса Карлебю пра змену правоў, звязаных з уласнасцю, а не самой формы ўласнасці. У цэлым гэта быў рух да больш уключальнага, чым раней, погляду на грамадства і дэмакратыю, у якім супрацоўніцтва, перазмеркаванне і перамовы сталі важнейшымі інструментамі пераменаў, чым уяўленні пра канфрантацыю і рэвалюцыю.

Аднак у той самы час тэрмін «народны дом» ужывалі — хоць і нячаста — і кансерватыўныя публіцысты, але ў зусім іншым сэнсе. Для кансерватараў «народны дом» — і ўвогуле выкарыстанне слова «народ» — азначаў нацыянальную супольнасць з біялагічна-культурнай асновай, якая стаіць вышэй за ўсе іншыя чыннікі, звязаныя з класавым падзелам. Адпаведна, кансерватыўныя мадэлі бачылі ў любых ідэях класавых падзелаў і разыходжання класавых інтарэсаў прамую пагрозу нацыянальнай супольнасці. Гэта азначала, што такая мадэль была і недэмакратычнай, бо дэмакратыя патрабуе плюралізму меркаванняў, а плюралізм меркаванняў мог пагражаць найвышэйшай каштоўнасці — нацыянальнаму адзінству.

Сёння Шведскія дэмакраты зноў ухапіліся за тэрмін «народны дом», якім цяпер называюць дзяржаву дабрабыту, і спрабуюць сцвярджаць, што яны — сапраўдныя спадкаемцы Пера Альбіна. Гэта лухта і яскравы доказ таго, што яны нават не чыталі яго прамовы пра «народны дом». Яго прамова, якая абвяш-

чала, што «добры дом не ведае ні любімчыкаў, ні пасынкаў», несумяшчальная з асноўным прынцыпам Шведскіх дэмакратаў — што паміж людзьмі насамрэч ёсць розніца. Не галасавалі яны ў Рыксдагу і ў падтрымку патрабавання Пера Альбіна пра «ліквідацыю ўсіх сацыяльных і эканамічных бед» — хутчэй наадварот.



Пер Альбін Хансан, прэм'ер-міністр Швецыі ў 1932–1946 гадах; партрэт з кнігі «Svenska folket genom tiderna» (1940)

«Народны дом» Пера Альбіна Хансана грунтаваўся на ідэалогіі роўнасці і ліквідацыі класавых падзелаў. Шведскія дэмакраты грунтуюць сваё ўяўленне на нацыянальнай супольнасці інтарэсаў культурна-біялагічнага характару, якая стаіць над адрозненнямі ў эканамічных умовах і эканамічнай уладзе і якую нельга ставіць пад сумнеў, бо такія канфлікты пагражаюць нацыянальнаму пачуццю. Негатыўнае стаўленне Швед-

скіх дэмакратаў да прафсаюзаў звязана з тым, што канфлікты інтарэсаў на рынку працы, якія адлюстроўваюцца ў прафсаюзнай арганізацыі, супярэчаць уяўленням пра гарманічную нацыянальную супольнасць.

Увогуле нацыяналізм — ці, мабыць, правільней сказаць нацыяналістычны рамантызм, — які ўзнік у апошнія дзесяцігоддзі і які можна сустрэць, напрыклад, у Шведскіх дэмакратаў, грунтуецца на ўяўленнях пра гістарычную сацыяльную гармонію, якой ніколі не было. Гісторыя Швецыі, як і многіх іншых краін, поўная сялянскіх паўстанняў, бунтаў і выступленняў супраць каралеўскай улады і шляхты. Канфлікты інтарэсаў былі ў мінулым, як ёсць і цяпер.

Капітал, уласнасць і права вырашаць

Уласнасць і ўлада

ІДЭЯ КАЛЕКТЫЎНАЙ уласнасці на сродкі вытворчасці была цэнтральнай для ранняга рабочага руху. Зыходзілі пры гэтым з тэорый Маркса і Энгельса, паводле якіх капіталізм рухаецца да краху з-за ўласцівай яму ўнутранай супярэчнасці, пасля чаго прыродныя рэсурсы, капітал і фабрыкі пяройдуць у тую ці іншую форму калектыўнай уласнасці.

Іншымі словамі, новыя формы ўласнасці павінны былі стаць вынікам сацыяльна-эканамічных пераменаў, якія ўжо адбыліся, а не насаджацца палітычнымі ініцыятывамі задоўга да таго, як для іх наспее час. Каля мінулага рубяжа стагоддзяў паступова пачаў фармавацца рух, у якім пэўныя групы сталі бачыць у сацыялізацыі важных вытворчых рэсурсаў не вынік сацыяльных пераменаў, а сродак іх ажыццявіць. Гэта вызначыла арыенціры для тых груп, што рухаліся ў рэвалюцыйным

кірунку і пасля бальшавіцкай рэвалюцыі ў Расіі пачалі называць сябе камуністамі.

Рэфармісцкія партыі, сацыял-дэмакраты, заставаліся вернымі тэорыі, паводле якой змена эканамічнай сістэмы павінна вынікаць з унутранай логікі развіцця і не можа быць прадказаная загадзя. Аднак з'явілася і іншая тэорыя: развіццё ідзе ў розных галінах з рознай хуткасцю, і некаторыя галіны «саспеюць» для калектывізацыі раней за іншыя. Таму пытанне пра змену ўласнасці яшчэ да канчатковага пераваротy можна сустрэць і ў рэфармісцкай дыскусіі.

Адначасова існавалі вялікія рознагалоссі і блытаніна наконт формы гэтай калектыўнай уласнасці: нацыяналізацыя, прафсаюзная ўласнасць і кааператывы — усё гэта былі альтэрнатывы. Яшчэ больш цьмянай была дыскусія пра тое, як такая калектыўная ўласнасць мусіць функцыянаваць з улікам пажаданняў спажыўцоў. Больш ці менш выразна выказвалася ўяўленне, што вытворчасць павінна грунтавацца на эканамічным планаванні, г. зн. на розных формах вытворчых квот, якія мусяць выконваць прадпрыемствы. Але як устанаўліваць такія квоты і як прадбачыць у такіх планах тэхналагічнае развіццё і змены ў попыце спажыўцоў — гэтыя пытанні амаль не абмяркоўваліся, не кажучы ўжо пра адказы на іх. Па сутнасці, ніколі не існавала ніякай сацыялістычнай тэорыі кіравання прадпрыемствам і эканомікі менеджменту.

Па сваёй сутнасці патрабаванне сацыялізацыі датычыла не прадпрымальніцтва, а адносін улады. Крытыка капіталізму была скіраваная супраць вельмі скажонага размеркавання ўлады ў эканоміцы, а значыць, і ў працоўным жыцці — размеркавання, пры якім інтарэсы капіталістаў у іх уласных прыбытках маглі дамінаваць над усімі іншымі інтарэсамі ў грамадстве. Даволі часта гэта азначала, што прыбыткі здабываліся

праз жорсткую эксплуатацыю або прамое падаўленне інтарэсаў іншых.

Таму калектывізацыя сродкаў вытворчасці, такіх як прыродныя рэсурсы, фабрыкі і банкі, лічылася неабходным спосабам змяніць гэтае скажонае размеркаванне ўлады. Аднак калі дыскусія перайшла ад тэорыі да канкрэтных пытанняў — як павінна адбывацца змена ўласніка і як потым прадпрыемствы будуць фінансавацца і кіравацца, — цяжкасці сталі відавочнымі. Гэта паказала *Камісія па сацыялізацыі*, створаная ў 1920 годзе. Фармальна яна існавала да 1937 года, але не выпрацавала нічога больш рэвалюцыйнага за некалькі асцярожных прапаноў адносна абутковай прамысловасці і шматлікіх тады прыватных мясцовых чыгунак. Цяжкасці, якія выявіла Камісія, падштурхоўвалі да таго, каб па-новаму сфармуляваць пытанні пра права ўласнасці і ролю ўласнасці.

Гэтыя цяжкасці былі прызнаныя і ў 1930-я гады, калі з'явіўся новы досвед таго, што функцыянаванне эканомікі можна змяняць дэмакратычным шляхам. У той жа час прыйшло больш ведаў і разумення таго, што і дэмакратыя, і эканоміка патрабуюць разнастайнасці: людзям трэба даць магчымасць уплываць у розных формах — як грамадзянам, як работнікам і як спажыўцам, — а гэта немагчыма пры маналітнай і цэнтралізаванай сістэме дзяржаўнага кіравання. Жахлівыя прыклады Савецкага Саюза паказалі, што канцэнтрацыя ўласнасці ў руках дзяржавы нясе — прынамсі — не меншую рызыку, чым у прыватных руках: у абодвух выпадках узнікаюць вялікія адрозненні ва ўладзе паміж тымі, хто кантралюе сродкі вытворчасці, і тымі, каго кантралююць носьбіты ўлады.

«Сацыялізм перад тварам рэчаіснасці»

Такім чынам, адказам на цэнтральнае сацыялістычнае пытанне пра кантроль над сродкамі вытворчасці аказалася не калектывізацыя як такая. Новая дыскусія, якая разгарнулася з канца 1920-х гадоў, засяродзілася на праве вырашаць, а не на праве ўласнасці на сродкі вытворчасці і на размеркаванні вынікаў вытворчасці. Ідэалогія эканамічнай дэмакратыі цяпер датычыла размеркавання ўлады, а не нацыяналізацыі. Гэта вызначае сацыял-дэмакратычную палітыку з часу перамогі на парламенцкіх выбарах 1932 года.

Інструментаў, з дапамогай якіх можна было перадаць — ці, іншымі словамі, дэмакратызаваць — права вырашаць, было шмат.

- Эканамічная палітыка была скіраваная на тое, каб згладжваць эканамічныя ваганні і тым самым мінімізаваць рызыку беспрацоўя.
- Заканадаўства стварала рамкі для дзейнасці прадпрыемстваў, якія павінны былі адпавядаць агульным патрабаванням да бяспекі прадукцыі, выкарыстання прыродных рэсурсаў і землекарыстання.
- Заробкі, умовы працы і працоўны час сталі прадметам перамоваў, а не тым, што вызначае адзін наймальнік, а высокі ўзровень аб'яднання ў прафсаюзы даў прафсаюзам дастаткова сілы, каб выступаць другім бокам у адносінах з інтарэсамі ўласнікаў.
- Падаткі і сацыяльнае забеспячэнне размяркоўвалі вынікі вытворчасці і давалі ўсім базавы сацыяльны дабрабыт — доступ да школьнай адукацыі і аховы здароўя, а таксама эканамічную бяспеку на выпадак хваробы і беспрацоўя.

Усё гэта азначала, што грамадства — «сацыяльная надбудова» — змянілася. Гэта датычыла доступу да сацыяльнага дабрабыту, гэта датычыла ўплыву ў працоўным жыцці, але не ў апошнюю чаргу гэта датычыла поглядаў на роўныя правы людзей як грамадзян незалежна ад класа.

Галоўным тэарэтыкам мадэлі, якая дазволіла перайсці ад права ўласнасці да права вырашаць, быў Нільс Карлебю (1892–1926). Яго ідэалогія сфармулявана ў працы, выдадзенай пасмяротна, — *Socialismen inför verkligheten* («Сацыялізм перад тварам рэчаіснасці»). Асноўны аргумент Карлебю — што інтарэсы капіталістаў у прыбытку не могуць быць галоўнай мэтай вытворчасці — адлюстроўвае самую сутнасць сацыялістычнага погляду на грамадства, але Карлебю фармулюе яго інакш:

> «Такія ўмяшанні павінны адбывацца ў форме матэрыяльнай вытворчасці, каб яна служыла паляпшэнню, а не разбурэнню жыцця работнікаў. Сродкамі былі сацыяльная палітыка, адукацыйная палітыка, прафсаюзная дзейнасць і г. д. (...) Чалавецтва не павінна стаць рабом матэрыяльнай вытворчасці».

> «Узяць хоць бы гарадское планаванне, санітарныя правілы, сацыяльнае заканадаўства, падатковае заканадаўства для мэтаў сацыяльнай палітыкі — што гэта, як не яшчэ адзін шэраг формаў уласнасці паводле нормаў грамадскага дабрабыту?»

Гэтыя цытаты з Карлебю пералічваюць шэраг пытанняў, у якіх сацыял-дэмакратыя ў наступныя дзесяцігоддзі з дапамогай заканадаўчай улады перанесла акцэнт на права вырашаць. Заканадаўства пра рынак працы развівалася асабліва ў 1970-я гады і пашырала права работнікаў на самавызначэнне. А па меры таго як мацнела дыскусія пра навакольнае асяроддзе, развівалася заканадаўства, якое ахоплівае розныя формы ўздзеяння на клімат і экалагічныя наступствы для прыродных рэсу-

рсаў, — напрыклад, абмежаванні выкідаў у паветра і ваду, выкарыстання хімікатаў і спажывання энергіі.

Працоўнае і экалагічнае заканадаўства можна разглядаць як паралельныя з'явы: абодва ўскосна азначаюць, што зыходным пунктам для спосабу вытворчасці не можа быць максімальна магчымая аддача ад капіталу незалежна ад таго, як яна атрымана. Прыбытак капіталістаў не стварае карысці для грамадства, калі ён атрымліваецца так, што спараджае выдаткі для іншых груп або проста знішчае іншыя рэсурсы, акрамя капіталу. Уздзеянне на іншыя чыннікі вытворчасці — такія як рабочая сіла, прыродныя рэсурсы і клімат — павінна ўлічвацца ў тых рашэннях, якія ў сукупнасці вызначаюць свет вытворчасці. Для гэтага трэба даць прадстаўнікам іншых інтарэсаў, акрамя капіталістычных, — грамадзянам і работнікам — магчымасць уплываць на прыняцце рашэнняў праз заканадаўства або праз прафсаюзныя арганізацыі.

І наадварот, значэнне інтарэсаў капіталу адмаўляць нельга: выкарыстоўваць капітал неэфектыўна гэтак жа неразумна, як і шкодзіць навакольнаму асяроддзю або рабочай сіле. Досвед савецкай сістэмы эканамічнага планавання выразна паказвае, што неэфектыўнае выкарыстанне капіталу вядзе і да ўцечкі сродкаў, і да горшых вынікаў вытворчасці. Інтарэсы капіталу таксама патрабуюць увагі, але на ўзроўні, раўнапраўным з іншымі інтарэсамі, а не вышэйшым за іх. Ці, іншымі словамі, «капітал — небяспечны гаспадар, але добры слуга».

Дынаміка, якая ўзнікае ва ўзаемадзеянні розных вытворчых інтарэсаў, калі ім дазволена дзейнічаць на роўных умовах, карысная для эканомікі. Тое, што называюць шведскай мадэллю і што ў сваёй першапачатковай форме азначала супрацоўніцтва прафсаюзаў і наймальнікаў праз перамовы, грунтавалася менавіта на гэтым разуменні: да свету вытворчасці ставяцца

некалькі розных патрабаванняў, і ўсе яны абгрунтаваныя. Больш за тое, усе яны павінны ўлічвацца ў рашэннях пра тое, як арганізаваць свет вытворчасці.

Але ці дастаткова гэтага?

Гэта не значыць, што мадэль заўсёды працуе бездакорна. Можа здацца, што яе недастаткова, бо яна не цалкам ажыццяўляе ўтопіі ранніх гадоў рабочага руху — і бо ніколі няма гарантый, што баланс сіл не схіліцца на карысць капіталістаў. У апошнія дзесяцігоддзі так, бясспрэчна, і здарылася.

Ці не сведчыць гэта пра тое, што заканадаўства і ўплыву прафсаюзаў недастаткова, калі капіталісты могуць знаходзіць новыя шляхі, а новыя палітычныя групы — аслабляць нарматыўныя рамкі?

Гэта выклікае і некалькі сустрэчных пытанняў. Хіба ўвесь мінулы досвед не паказаў нам, што такіх гарантый ніколі не было? Хіба рызыка не ёсць у сістэмах любога тыпу, а розніца толькі ў тым, што сама ўладная эліта можа выглядаць парознаму?

Мінулае стагоддзе выразна паказала нам, што ўсе спробы ажыццявіць сацыялістычныя ўтопіі праз старыя ідэалогіі поўнай нацыяналізацыі былі вельмі далёкія ад дасягнення мэт свабоды і роўнасці — а таксама і ўдзелу. Уяўленні пра самарэгулюемыя сістэмы, сістэмы, якія аўтаматычна дадуць шэраг добрых і карысных вынікаў для ўсіх, трэба, папросту кажучы, успрымаць менавіта як уяўленні. Гэта так незалежна ад таго, як гэтыя ўяўленні падаюцца ў дачыненні да таго, каму павінна належаць уласнасць.

Сацыялістычныя ўтопіі ў гэтым сэнсе дыяметральна процілеглыя рынкава-ліберальным утопіям. Аднак калі іх пераносілі

ў рэчаіснасць, вынікам у абодвух выпадках было вельмі няроўнае размеркаванне і ўлады, і эканамічных рэсурсаў. Мадэль падзелу ўплыву — дзе ролю адыгрываюць і грамадскія інтарэсы, і інтарэсы работнікаў, і інтарэсы капіталу — аказалася найбольш паспяховай, хоць і не дасканалай, і сацыяльна, і эканамічна. І не ў апошнюю чаргу — дэмакратычна.

Эканомікі і грамадствы ёсць і павінны быць рухомымі сістэмамі, сістэмамі ў пастаяннай змене. Ва ўсіх грамадствах, у тым ліку ў роўных, у людзей будуць розныя інтарэсы і розныя памкненні, якія часам спалучаюцца, а часам цягнуць у розныя бакі. Дэмакратычнае грамадства павінна даваць сваім грамадзянам прастору фармуляваць уласныя інтарэсы і памкненні, у тым ліку ў эканамічным жыцці, — хоць і з законамі і правіламі, якія забараняюць мацнейшым групам эксплуатаваць слабейшых і шкодзіць ім.

Мары пра ідэальныя сістэмы, якія, калі іх цалкам усталяваць, аўтаматычна і назаўсёды гарантуюць выдатныя каштоўнасці, ёсць і застаюцца менавіта марамі. Больш за тое, гэта мары, якія рызыкуюць прывесці да зусім іншых вынікаў, чым задумвалася. Адзіная сапраўдная гарантыя сістэмы з хоць якім роўным размеркаваннем уплыву і балансам паміж рознымі тыпамі эканамічных інтарэсаў — гэта бесперапынны працэс збірання груп вакол вылучаных патрабаванняў, прычым такіх вялікіх груп, каб гэтыя патрабаванні можна было і ўтрымаць.

У гэтым па сутнасці і заключаецца заўсёды паўторная задача сацыял-дэмакратыі і прафсаюзнага руху. Адзіная сапраўдная гарантыя ажыццяўлення сказанага вышэй — выразная падтрымка гэтых прынцыпаў сярод грамадзян.

Рынак і палітыка

ТАКІМ ЧЫНАМ, У ЦЭНТРЫ ўвагі замест пытанняў уласнасці апынуліся пытанні пра тое, хто мае права ўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў. Гэта азначае прыняцце прыватнага прадпрымальніцтва і прызнанне таго, што інтарэсы капіталу ўваходзяць у лік інтарэсаў, вартых абароны, — але не як адзіны інтарэс і не як інтарэс, які павінен стаяць над усімі астатнімі.

Гэта не значыць, што канфлікт паміж раннім рабочым рухам і тагачаснымі правымі вакол правоў прыватнай уласнасці скончыўся. Ён працягваецца і ў апошнія дзесяцігоддзі, наадварот, узмацніўся — у пытанні пра права ўласніка вырашаць у дачыненні да грамадскіх інтарэсаў (напрыклад, рэгулявання землекарыстання) або правоў работнікаў (напрыклад, Закона аб абароне занятасці, статусу прафсаюзных упаўнаважаных па ахове працы або патрабавання калектыўных дамоў пры дзяржаўных закупках).

Гэты канфлікт адлюстроўваецца ў дыскусіях пра рынкавую эканоміку, ці, дакладней, пра такія пытанні, як: якія правілы павінны дзейнічаць для прадпрыемстваў, як абкладаць падаткамі прадпрыемствы і прыбыткі ад капіталу, колькі прасторы даваць рынкавым механізмам і інтарэсам прыбытку ў дзейнасці, якая фінансуецца з падаткаў, і ўвогуле як размежаваць ролі «рынку» і «палітыкі». Звярніце ўвагу: у сённяшняй дыскусіі слова «рынак» часта ўжываецца як сінонім «карпаратыўных інтарэсаў» або «інтарэсаў капіталу».

Тэорыя рынку

Рынак — гэта, папросту кажучы, месца гандлю. У старых аграрных грамадствах гэта была фізічна акрэсленая прастора, куды розныя вытворцы прывозілі прадаваць свае тавары

і куды прыходзіла шмат пакупнікоў паглядзець, ці не знойдуць яны чаго-небудзь, што хацелі б купіць.

Калі пакупнік знаходзіў нешта цікавае па цане, якую і пакупнік, і прадавец лічылі разумнай, адбывалася здзелка. Калі цана была занадта высокай у параўнанні з тым, што пакупнік хацеў ці мог заплаціць, прадавец не мог прадаць свой тавар. Калі ж, наадварот, цэны былі занадта нізкімі, прадаўцы збіралі свае тавары і больш на рынак не вярталіся.



ГЁТЭБОРГ · 1890-Я · ГАНДАЛЬ НА ГАРОДНІННЫМ РЫНКУ

РЫНАК —

■ Гандаль на Грэнсакстурьет (Grönsakstorget, гароднінны рынак) у Гётэборгу, 1890-я гады; фота Арона Ёнасана

Менавіта гэтыя старадаўнія месцы гандлю далі назву таму, што мы сёння называем рынкавай эканомікай, — гандлёвым здзелкам паміж асобнымі прадаўцамі і асобнымі пакупнікамі, дзе прапанову і продаж вызначае цэнавы механізм. Ён падтрымлівае баланс паміж тым, колькі спажыўцы гатовыя запла-

ціць, і тым, што вытворца патрабуе як кампенсацыю за сваю працу і інвестыцыі. Такім чынам, мяркуецца, што цэнавы механізм вядзе да вытворчасці, прыстасаванай да плацежаздольнага попыту. Гэта, у сваю чаргу, нібыта выключае марнаванне рэсурсаў на лішнюю вытворчасць, а спажыўцы вымушаныя ашчадна ставіцца да пакупак, каб не выходзіць за межы таго, што яны могуць сабе дазволіць. Канчатковым вынікам, як мяркуецца, павінна быць аптымальна эфектыўнае размеркаванне і вытворчых рэсурсаў, і вынікаў вытворчасці.

Рынкавая мадэль грунтуецца на шэрагу дапушчэнняў: што доступ на рынак свабодны і для вытворцаў, і для спажыўцоў, што ўсе, хто хоча вырабляць і прадаваць тавары, маюць на гэта права і што тыя, у каго ёсць грошы, каб заплаціць за тавары, могуць свабодна выбіраць сярод тавараў і паслуг у межах таго, што яны могуць сабе дазволіць. Гэтая мадэль выходзіць таксама з таго, што вытворцы незалежныя адзін ад аднаго і канкуруюць за продаж сваіх тавараў пакупнікам, а гэта не дае завышаць цэны, бо ніводзін пакупнік не купіць тавар у вытворцы, які просіць больш за іншых. Паколькі ў розных спажыўцоў розныя перавагі і больш ці менш грошай на пакупкі, мяркуецца, што вытворцы імкнуцца вырабляць розныя прадукты і прадукты рознай якасці, забяспечваючы шырокі асартымент і разнастайнасць і больш магчымасцяў выбару для спажыўца — зноў жа ў межах таго, што спажывец можа сабе дазволіць.

Карацей кажучы, лічыцца, што гэта забяспечвае эканамічна эфектыўную і разнастайную вытворчасць, арыентаваную на патрэбы спажыўцоў і з разумнай аддачай для вытворцаў. Гэта, у сваю чаргу, эканамічныя і ідэалагічныя аргументы на карысць мадэлі рынкавай эканомікі. Найбольш пурыстычныя тэарэтыкі рынку бачаць у ім цалкам самарэгулюемую сі-

стэму, якая заўсёды дае найбольш аптымальныя рашэнні, калі толькі яе пакінуць у спакоі. Гэты погляд неаднаразова крытыкавалі з таго часу, як у XVIII стагоддзі пачалі з'яўляцца рынкавыя тэорыі, але ён заўсёды вяртаецца. Апошнім часам ён набраў сілу з 1980-х гадоў і некалькі дзесяцігоддзяў, да канца 2010-х, меў пануючы ўплыў, калі зноў мусіў адступіць пад націскам крытыкі і патрабаванняў новага сацыяльнага рэгулявання.

Факт у тым, што рэальныя рынкі моцна адрозніваюцца ад тых, што апісваюцца ў тэорыях. Пытанне не ў тым, ці патрабуюць «рынкі» палітычнага рэгулявання, а ў тым, як іх рэгуляваць.

Рэальныя рынкі і тое, чаго рынак не можа

Як ужо гаварылася, рынкавая мадэль грунтуецца на тым, каб ніводзін удзельнік рынку не мог дзякуючы сваёй большай сіле кіраваць вынікамі рынку на карысць уласных асобных эканамічных інтарэсаў.

У рэчаіснасці сумы, якія спажыўцы могуць сабе дазволіць заплаціць, вельмі розняцца ў залежнасці ад адрозненняў у даходах і ад таго, каго ім даводзіцца ўтрымліваць. Вялікія групы спажыўцоў з падобным попытам больш цікавыя вытворцам, чым малыя, калі толькі гаворка не ідзе пра эксклюзіўныя тавары для невялікіх і вельмі заможных груп. Спажыўцы рэдка маюць поўнае ўяўленне пра прапанову: прайсціся па мясцовым рынку і праверыць тавары і цэны — зусім не тое, што арыентавацца ва ўсіх крамах сучаснага горада або ў велізарнай прапанове на лічбавых платформах.

Эканамісты звычайна апісваюць адносіны паміж спажыўцом і вытворцам як асіметрычныя: вытворцы/прадаўцы ведаюць значна больш, чым спажыўцы/пакупнікі, пра ўмовы рынку, су-

адносіны цэн і склад прадукцыі. Выключэнне — рынак працы, дзе суадносіны сіл часта адваротныя. На рынку працы пакупнікі, г. зн. наймальнікі, часта маюць выразна мацнейшае становішча ў параўнанні з прадаўцамі, г. зн. работнікамі і кандыдатамі на працу.

Не роўныя і пазіцыі вытворцаў. Ёсць буйныя карпарацыі і ёсць малыя прадпрыемствы, прычым першыя дзякуючы сваёй вялікай эканамічнай моцы заўсёды могуць канкураваць з другімі. Нават калі доступ на рынак для новых прадпрыемстваў фармальна свабодны, існуюць абмежаванні — напрыклад, доступ да капіталу або да прыдатных памяшканняў; чым больш капіталаёмістая галіна, тым больш перашкод для новых прадпрыемстваў. Кампаніі таксама стараюцца пазбегнуць канкурэнцыі, прасоўваючы сваю марку як нешта асаблівае і як каштоўнасць саму па сабе. Большасць марак джынсаў, напрыклад, аднолькавыя па якасці, але некаторыя маркі маюць такі статус, што іх можна прадаваць даражэй, чым канкурэнтныя, але слабейшыя маркі.

Таму рэальныя рынкі рэдка функцыянуюць у адпаведнасці з тымі перадумовамі, на якіх грунтуецца мадэль рынкавай эканомікі. Аднак такія рынкі — недасканалыя рынкі — усё ж застаюцца рынкамі ў сэнсе сустрэчы спажыўцоў, якія выбіраюць, што яны хочуць ці могуць купіць, і вытворцаў, якія вырашаюць, што яны хочуць вырабляць. Але такія рынкі не размяркоўваюць вытворчыя рэсурсы і вынікі вытворчасці так эфектыўна і так у адпаведнасці з попытам, як прадказвае мадэль. На практыцы размеркаванне на рынку заўсёды на карысць наймацнейшых груп, калі толькі гэтыя суадносіны сіл не змяняюцца мерамі, якія дапаўняюць цэнавы механізм.

Таму сацыял-дэмакратычная крытыка — гэта не адмаўленне асноўных складнікаў рынкавай мадэлі, свабоднага прадпры-

мальніцтва і свабоднага выбару спажыўцоў, а крытыка дысбалансу, які ўзнікае з-за няроўных суадносін сіл на рынках. Значная частка сацыял-дэмакратычнай палітыкі на практыцы імкнецца стварыць больш балансу паміж рознымі ўдзельнікамі рынку ці, папросту кажучы, дамагчыся, каб рынкі больш адпавядалі прынцыпу балансу паміж рознымі ўдзельнікамі. Так, заканадаўства пра рынак працы ў спалучэнні з моцнымі прафсаюзнымі арганізацыямі ўраўнаважвае розніцу ў сіле паміж прадпрыемствамі і работнікамі. Заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў абараняе важныя інтарэсы спажыўцоў, напрыклад у пытаннях бяспекі прадукцыі, а сацыяльныя трансферты змяншаюць частку адрозненняў у пакупніцкай здольнасці.

Гэтыя меры, вядома, абмяжоўваюць магчымасці эканамічна мацнейшых груп кіраваць рынкамі на сваю карысць, асабліва калі гаворка ідзе пра рынак працы. І менавіта ў дачыненні да рынку працы такія меры — накіраваныя на тое, каб палепшыць баланс паміж інтарэсамі наймальнікаў і работнікаў, — апісвалі як напад на рынкавую эканоміку. У апошнія дзесяцігоддзі слова «рынак» усё часцей ужываюць для абазначэння «прыватнага прадпрымальніцтва» і «прыватных інтарэсаў прыбытку»: чым больш свабоды і выгод для гэтых інтарэсаў, тым лепшая «рынкавая эканоміка».

Аднак рынкавая эканоміка — гэта не тое самае, што ўлада мацнейшых удзельнікаў; рынкавая эканоміка, як ужо гаварылася, прадугледжвае баланс паміж рознымі зацікаўленымі бакамі. Таму стварэнне лепшага балансу паміж рознымі ўдзельнікамі рынку азначае не разбурэнне рынкаў, а тое, каб яны працавалі больш у адпаведнасці з тымі тэорыямі, на якіх яны грунтуюцца.

Такім чынам, умяшанне ў «рынак» у пэўных адносінах датычыць стварэння таго балансу паміж рознымі эканамічнымі інтарэсамі, якога патрабуе сама рынкавая мадэль. Аднак крытыка тэорый рынкавага лібералізму сцвярджае таксама, што «рынкі», г. зн. гандлёвыя здзелкі паміж пакупніком і прадаўцом, нават калі іх рэгуляваць, не здольныя ствараць пэўныя важныя грамадскія рэсурсы — і што гэтыя рэсурсы заўсёды даводзіцца ствараць іншымі спосабамі.

Недахопы цэнавага механізму і тое, з чым рынак не спраўляецца

Рынкі дзейнічаюць, як ужо гаварылася, праз цэнавы механізм. Ён грунтуецца, па-першае, на дапушчэнні, што для пэўнага тавару, паслугі ці карысці ёсць і пакупнікі, і прадаўцы. Для некаторых прыродных рэсурсаў, такіх як паветра, акіяны або клімат увогуле, прадаўцы не могуць устанавіць цану, якая гарантавала б, што бізнес і яго кліенты будуць выкарыстоўваць гэтыя рэсурсы ашчадна, не знішчаючы іх. Аднак такога ашчаднага выкарыстання ніколі не будзе, калі рэсурсы лічацца свабоднымі для эксплуатацыі, без усякіх выдаткаў.

Таму ашчаднага выкарыстання трэба дамагацца іншымі спосабамі — а для гэтага патрэбныя палітычныя рашэнні. Адзін з такіх спосабаў — заканадаўства з правіламі, якія рэгулююць выкарыстанне прыродных рэсурсаў, хімікатаў і г. д. Іншы варыянт — падаткаабкладанне, напрыклад, паліва: паводле прынцыпаў рынкавай эканомікі, больш высокія выдаткі павінны весці да меншага спажывання.

Па-другое, цэнавы механізм не ўлічвае, што існуюць прадукты і паслугі, жыццёва важныя для спажыўца, але сабекошт адзінкі якіх такі высокі, што нямногія спажыўцы могуць заплаціць за іх са сваіх даходаў. Прыклады гэтага — ахова зда-

роўя і адукацыя. Калі гэтыя такія важныя для чалавека рэсурсы павінны быць даступныя ўсім, іх нельга размяркоўваць праз рынкавыя здзелкі паводле таго, што спажывец можа сабе дазволіць.

Тут для кіравання і вытворчасцю, і размеркаваннем патрэбны іншы механізм, а не цана. Гістарычна выйсце знаходзілі ў тым, каб адказнасць за такія паслугі, як лячэнне і апека над беднымі і старымі, бралі на сябе ўдзельнікі па-за рынкавай сістэмай — Царква або дабрачынныя арганізацыі. У сучасных дзяржавах дабрабыту ахова здароўя, адукацыя і сацыяльная апека фінансуюцца пераважна з падаткаў.

Па-трэцяе, ёсць шэраг калектыўных рэсурсаў, такіх як судова-прававая сістэма і інфраструктура, якія ўяўляюць агульны інтарэс для ўсіх грамадзян, але індывідуальную карысць ад якіх нельга купіць ці прадаць праз рынкавыя здзелкі.

Яны патрабуюць іншага спосабу фінансавання — калектыўнага і абавязковага, праз падаткі.

Агульнае ва ўсім пералічаным вышэй — тое, што ўсе гэтыя складнікі патрабуюць мер, прынятых праз палітычныя рашэнні, ці, іншымі словамі, па-за самімі рынкамі. Такія меры патрэбныя таму, што рынкавая мадэль не здольная вырашыць усе задачы, неабходныя для таго, каб падтрымліваць стабільнае грамадства, не дапускаць празмернай эксплуатацыі прыродных рэсурсаў і забяспечваць, каб усе людзі сапраўды мелі доступ да такіх паслуг, як адукацыя і ахова здароўя. Грамадства, папросту кажучы, не можа грунтавацца толькі на гандлёвых здзелках.

IV

Ідэйнае развіццё сацыял-дэмакраты: размеркаванне вынікаў вытворчасці

МАГЧЫМАСЦЬ КАРЫСТАЦЦА такімі паслугамі, як адукацыя, ахова здароўя і догляд пажылых людзей, мае вырашальнае значэнне для жыцця людзей і для іх свабоды выбару, але ўсе такія паслугі патрабуюць вялікіх рэсурсаў. Вельмі нямногія работнікі змаглі б аплаціць рэальны кошт такіх паслуг са свайго ўласнага даходу. Таму ва ўсіх краінах, у тым ліку ў бяднейшых, існуе ў той ці іншай форме грамадская адказнасць за іх, асабліва за адукацыю і ахову здароўя. Як правіла, маштаб гэтых абавязацельстваў павялічваецца па меры развіцця эканомікі, і ў гэтым адлюстроўваюцца патрабаванні грамадзян: сацыяльныя паслугі — і, магчыма, асабліва ахова здароўя — для грамадзян з'яўляюцца адным з галоўных прыярытэтаў, калі гаворка ідзе пра лепшы дабрабыт. Шведская палітыка дабрабыту, якую спачатку называлі сацыяльнай палітыкай, пачала складвацца ўжо ў 1930-я гады. Аднак галоўныя рэформы адбыліся ў дзесяцігоддзі пасля Другой сусветнай вайны: дзіцячая дапамога, пашырэнне дзяржаўнай пенсіі, сістэма агульнай дадатковай пенсіі (АТР), страхаванне па хваробе, абавязковая базавая школа, пашырэнне старэйшай сярэдняй адукацыі, бацькоўскае страхаванне, дзіцячыя садкі, адукацыя дарослых, догляд пажылых людзей.

У большасці краін Заходняй Еўропы абавязацельствы ў галіне сацыяльнага дабрабыту пачалі па-сапраўднаму развівацца пасля Другой сусветнай вайны. Аднак формы сацыяльнага дабрабыту ў розных краінах розныя — з-за ідэалагічных разыходжанняў. Паўночныя краіны, дзе ў перыяд станаўлення дзяржавы дабрабыту ўладу трывала трымалі сацыял-дэмакраты, усе выбралі мадэль, якую называюць усеагульнай палітыкай дабрабыту: выплаты і паслугі даступныя ўсім на роўных умовах, без праверкі даходаў, і фінансуюцца пераважна з падаткаў. У іншых краінах моцныя элементы праверкі даходаў

ці патрэбы, а фінансаванне — розныя спалучэнні падаткаў і платы.

Сацыял-дэмакратычная мадэль

АСНОЎНЫ ПРЫНЦЫП сацыял-дэмакратычнай мадэлі дабрабыту можна выказаць старым дэвізам ранняга рабочага руху: «Кожнаму паводле патрэбы, ад кожнага паводле магчымасцяў». Тое, што дае палітыка дабрабыту, павінна размяркоўвацца ў адпаведнасці з патрэбамі грамадзян — у адукацыі, ахове здароўя і сацыяльнай апецы, а таксама ў эканамічнай абароне, калі людзі больш не могуць сябе забяспечваць. За ўсё гэта плацяць разам, праз падаткі, і тыя, у каго больш рэсурсаў, плацяць больш, чым тыя, у каго іх менш.

Сацыял-дэмакратычная мадэль палітыкі дабрабыту мае дзве асноўныя складовыя часткі: па-першае, сацыяльныя паслугі — ахова здароўя, адукацыя і сацыяльная апека, — і, па-другое, сацыяльнае забеспячэнне, якое кампенсуе страту даходу ў выпадку хваробы, нараджэння дзіцяці або страты працы. Сацыяльныя паслугі фінансуюцца з падаткаў, а сацыяльнае забеспячэнне — з адлічэнняў наймальнікаў, якія ідуць у кошт магчымага росту заробкаў. Дзяржаўная пенсія таксама фінансуецца з адлічэнняў наймальнікаў, якія плацяцца дзяржаве, а прафесійныя пенсіі, што рэгулююцца дамовамі паміж бакамі рынку працы, фінансуюцца з унёскаў у спецыяльныя пенсійныя фонды.

Такім чынам, абавязацельствы ў галіне дабрабыту аплачваюцца з каштоўнасцяў, створаных у вытворчасці, і палітыка дабрабыту ёсць, такім чынам, пераразмеркаванне вынікаў вытворчасці. Замест таго каб размяркоўвацца выключна як прыбытак акцыянерам і заробак работнікам — прычым размерка-

ванне тады вызначаецца суадносінамі сіл на рынку працы, — частка прыбыткаў паступае дзяржаве і муніцыпалітэтам і вяртаецца грамадзянам у выглядзе паслуг або сацыяльных выплат. Такое размеркаванне вызначаецца патрэбай, а не эканамічнай сілай таго, хто атрымлівае.

Сацыяльныя паслугі павінны размяркоўвацца на роўных умовах: ні іх даступнасць, ні якасць не павінны залежаць ад уласных эканамічных рэсурсаў чалавека. Магчымасць атрымаць адукацыю, права на медыцынскую дапамогу ў выпадку хваробы, гарантыя, што чалавек не апынецца ў эканамічнай бядзе з-за змен у працоўным жыцці, на якія ён не мае ўплыву, або калі прыйдзе час выходзіць на пенсію па ўзросце, — усё гэта мае вырашальнае значэнне для здольнасці чалавека кіраваць уласным жыццём. Мець такія магчымасці кіраваць сваім жыццём — значыць мець свабоду. Мець роўныя магчымасці для ўсіх — значыць мець роўнасць. Такая свабода і роўнасць былі б немагчымыя, калі б мы ўсе як грамадзяне не неслі выдаткі разам і салідарна.

Салідарнасць датычыць і ўзаемнай увагі адно да аднаго, і ўзаемнай залежнасці ў грамадстве. Палітыка дабрабыту абапіраецца на гэты двайны падыход: яна ахоплівае жыццёвыя магчымасці чалавека, але таксама і магчымасці грамадства. Тое, што ўсе людзі маюць магчымасць атрымаць якасную адукацыю і што ўсе атрымліваюць патрэбную дапамогу ў выпадку траўмы ці хваробы, важна для жыцця гэтых людзей, але добра адукаваныя і здаровыя людзі азначаюць і большую сілу эканомікі і працоўнага жыцця. Эканамічнае страхаванне на выпадак беспрацоўя дае абароненасць чалавеку, але таксама і грамадству: яно стабілізуе эканоміку падчас спадаў і памяншае рызыку тых сацыяльных праблем, якія заўсёды ўзнікаюць з-за беднасці і ўразлівасці.

Калі дзякуючы палітыцы дабрабыту рэсурсы пераразмяркоўваюцца так, каб людзі маглі кіраваць уласным жыццём, пераразмяркоўваецца і ўлада. Добра развітая сістэма дзіцячых садкоў і догляду пажылых людзей неабходная, каб зламаць старую няроўнасць паміж поламі, калі жанчыны былі замкнёныя ў ролі хатняй даглядчыцы. Страхаванне па беспрацоўі, якое дазваляе атрымальнікам забяспечваць сябе і свае сем'і, азначае, што чалавек не вымушаны пагаджацца на працу на жахлівых умовах. Гэта, у сваю чаргу, перашкаджае ўзнікненню працоўных месцаў, на якіх работнікам не дазваляецца выстаўляць ніякіх патрабаванняў ні да ўмоў працы, ні да заробку, — каб назваць толькі некалькі прыкладаў.

Ці павінны мільянеры атрымліваць дзіцячую дапамогу?

ПРЫНЦЫП УСЕАГУЛЬНАСЦІ азначае, што доступ да сацыяльных паслуг не павінен залежаць ад праверкі даходаў ці патрэбы, а павінен быць адкрыты для ўсіх на роўных умовах. Мільянеры не плацяць за прыём у лекара больш, чым работнікі з нізкімі даходамі, адукацыя бясплатная для ўсіх, кожны можа бясплатна браць кнігі ў бібліятэцы незалежна ад даходу.

Ідэя, паводле якой доступ да сацыяльных паслуг не залежыць ад даходу чалавека, па сутнасці мае на ўвазе дзве рэчы: што людзі з невялікімі эканамічнымі рэсурсамі не павінны быць адрэзаныя ад адукацыі і аховы здароўя і што людзі з высокімі даходамі не павінны плаціць за гэтыя паслугі яшчэ раз — у дадатак да падаткаў, якія яны ўжо заплацілі.

Часам гэта крытыкуюць. Асабліва часта пад сумнеў ставіцца дзіцячая дапамога: чаму людзі з высокімі даходамі павінны атрымліваць ад дзяржавы дадатковую эканамічную падтрымку?

Тады, натуральна, узнікае пытанне, чаму дзеці мільянераў павінны атрымліваць бясплатнае харчаванне ў школе, бясплатныя падручнікі і бясплатнае лячэнне зубоў. І чаму людзям з высокімі даходамі дазваляецца бясплатна браць кнігі ў бібліятэцы і ездзіць у грамадскім транспарце па тым жа датаваным тарыфе? Хіба не было б справядлівей, каб яны самі плацілі за гэтыя паслугі?

Справа ў тым, што людзі з высокімі даходамі сапраўды плацяць — праз падаткі! Прынцып сацыял-дэмакратычнай падатковай палітыкі — «падатак паводле плацежаздольнасці». Тыя, хто атрымлівае большыя даходы і мае больш маёмасці, павінны плаціць больш, чым тыя, у каго нізкія даходы і няма багацця. Таму нелагічна патрабаваць, каб гэтыя людзі яшчэ і самі плацілі за доступ да паслуг, якія фінансуюцца з падаткаў, або каб іх выключалі з некаторых выплат, напрыклад з дзіцячай дапамогі.

Не адпавядае рэчаіснасці і ўяўленне, нібыта сістэма з праверкай патрэбы была б справядлівейшай з пункту гледжання размеркавальнай палітыкі, чым усеагульныя сістэмы. Паўночная ўсеагульная сістэма дабрабыту забяспечвае больш роўны баланс, чым англасаксонская сістэма з праверкай патрэбы. Прычына ў тым, што калі ўсе маюць доступ да розных выгод, якія дае сістэма, што фінансуецца з падаткаў, тады і ўсе гатовыя ўдзельнічаць у іх аплаце. Гэта значыць, што сістэма мацнейшая і можа прапанаваць лепшую якасць і шырэйшы набор паслуг — на карысць тым, у каго найменш рэсурсаў.

Сістэмы з праверкай патрэбы заўсёды схільныя быць ашчаднымі, скупымі сістэмамі. Калі частка грамадзян мусіць удзельнічаць у аплаце чагосьці, нічога асаблівага не атрымліваючы наўзамен, яны, зразумела, будуць зацікаўленыя ў тым,

каб трымаць фінансаванне на нізкім узроўні і абмяжоўваць тое, што сістэма можа даваць.



■ Кухаркі народнай школы ў Оўлу (Фінляндыя) гатуюць ежу для школьнікаў, 28 кастрычніка 1953 года

Гэта можна назваць аргументам карыснасці на карысць усеагульных сістэм. Гэты аргумент азначае таксама, што рынак працы мацнейшы, а грамадства стабільнейшае, калі ўсе маюць доступ да аховы здароўя, адукацыі, дзіцячых садкоў і догляду пажылых людзей. Аднак ёсць і ідэалагічныя аргументы на карысць усеагульных сістэм, і яны датычаць роўнага стаўлення і раўнацэннасці. Грамадзянскія правы — ці то права голасу, ці права на адукацыю, ці на дзіцячую дапамогу — павінны быць роўнымі для ўсіх; яны звязаныя з чалавекам і яго жыццёвым становішчам, а не з даходам.

Сістэма з праверкай патрэбы або даходаў — гэта зусім іншае: тут ужо гаворка ідзе не пра правы, якія ўсе грамадзяне салідарна гарантуюць адно аднаму, а пра дапамогу, якую больш заможныя даюць менш забяспечаным. Па сваёй сутнасці гэта сістэма, дзе адны даюць, а другія атрымліваюць, і, як следства, сістэма пераваг і падпарадкавання. Яна наўпрост супярэчыць роўнасці, на якой грунтуецца сама ідэя грамадзянства, — і можа паўплываць на тое, як розныя сацыяльныя групы глядзяць і на сябе, і адна на адну.

Правая мадэль — іншы падыход

РОЗНЫЯ РЭФОРМЫ ПАЛІТЫКІ дабрабыту ў XX стагоддзі, за некаторымі выключэннямі, удавалася праводзіць пры шырокай палітычнай згодзе, нават калі супраціў адной ці некалькіх правых партый спачатку быў моцны. Галоўнай крыніцай частай крытыкі тады была Правая партыя, якая, напрыклад, галасавала супраць дзяржаўнага страхавання па хваробе. Правыя таксама паслядоўна выступалі супраць павышэння падаткаў, патрэбнага для фінансавання развіцця і сацыяльных паслуг, і сацыяльнага забеспячэння.

Рост неаліберальных партый з сярэдзіны 1980-х гадоў паступова прывёў да ўсё большага негатыўнага стаўлення правых да сістэмы сацыяльнага забеспячэння. Мадэраты, якія так і не пазбавіліся старога кансерватыўнага скепсісу і падазравалі, што эканамічная падтрымка бедных падштурхне іх да рашэння не працаваць, усё больш адкрыта выступалі супраць прынцыпу кампенсацыі страчанага даходу ў сацыяльным забеспячэнні. Сістэму ўсё часцей і ўсё больш рэзка крытыкавалі як «занадта шчодрую» і такую, што спараджае «залежнасць ад дапамогі»; пра тых, хто захварэў, меркавалі, што яны па-

сіўныя і занадта доўга сядзяць на бальнічным, а пра беспрацоўных — што яны недастаткова стараюцца знайсці новую працу.

Адпаведна, правы ўрад, які кіраваў з 2006 па 2014 год, увёў новыя правілы кампенсацыі ў страхаванні па хваробе і па беспрацоўі: кампенсацыя памяншалася тым больш, чым даўжэй цягнуліся хвароба або беспрацоўе, і спынялася прыблізна праз паўтара года. Меркавалася, што такі паступовы рост эканамічнага ціску прымусіць тых, хто на бальнічным, і беспрацоўных больш старацца вярнуцца на працу; мадэраты адкрыта заяўлялі, што мэта ў тым, каб беспрацоўныя таксама «знізілі свой рэзервацыйны заробак», гэта значыць пагаджаліся на нізкааплатную працу.

Гэтыя скарачэнні часткова абапіраліся на распаўсюджаныя тэорыі стымулаў, паводле якіх паводзінамі чалавека ў вялікай ступені можна кіраваць з дапамогай фінансавых узнагарод і пакаранняў. Паводле тых жа тэорый змянілі і правілы падаткаабкладання: зароблены даходы сталі абкладацца па нізкай стаўцы, чым пенсіі, дапамога па хваробе і дапамога па беспрацоўі; і зноў меркавалася, што вышэйшы падатак павялічыць верагоднасць таго, што тыя, хто на бальнічным, і беспрацоўныя вернуцца на працу.

Аднак палітыку ў сферы сацыяльных паслуг не змянялі. Наадварот, скарачэнне страхавання па хваробе і па беспрацоўі абгрунтоўвалі сцверджаннем, што такія выплаты забіраюць рэсурсы ў «самага ядра дабрабыту», то бок у такіх паслуг, як ахова здароўя, адукацыя і сацыяльная апека, і таму меркавалася, што скарачэнні ў сістэме выплат умацуюць гэтыя рэсурсы двума спосабамі: зменшаць выдаткі на выплаты, бо больш людзей вернецца на працу, і павялічаць падатковыя паступленні, бо больш людзей будзе працаваць.

Тут можна выразна разгледзець інтарэсы тых груп, якія галасавалі за партыі «Альянсу»: цікавасць да зніжэння падаткаў, то бок да скарачэння дзяржаўных выдаткаў, у спалучэнні з цікавасцю да захавання доступу да адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнай апекі без высокай платы. А вось такой жа асабістай зацікаўленасці ў моцным сацыяльным забеспячэнні не было відаць, бо гэтыя групы ў вялікай ступені могуць — або лічаць, што могуць, — задаволіць гэтую патрэбу праз страхаванне на рынку працы[1].

Палітыка ўрада «Альянсу», як ужо адзначалася, азначала скасаванне і прынцыпу падатку паводле плацежаздольнасці, і прынцыпу кампенсацыі страчанага даходу ў сацыяльным забеспячэнні. Карацей кажучы, гэта азначала, што пераразмеркаванне праз падатковую палітыку і палітыку дабрабыту скарацілася. Гэтую тэндэнцыю ўзмацнілі пашыраныя магчымасці падатковых вылікаў за прыватныя хатнія паслугі: магчымасці купляць прыватныя паслугі раслі адначасова з пагаршэннем доступу да дзяржаўных паслуг.

Ідэалогія, што за гэтым стаіць

ЭКАНАМІЧНЫЯ АРГУМЕНТЫ маюць і выразную ідэалагічную аснову, на якую паўплывалі і неалібералізм, і кансерватызм. Абодва, з ідэалагічных меркаванняў, імкнуцца звесці да мінімуму і размеркавальную палітыку, і абавязацельствы

1 Заўвага перакладчыка: у Швецыі большасць работнікаў, апроч дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, мае дадатковае страхаванне, прадугледжанае калектыўнымі дамовамі паміж прафсаюзамі і наймальнікамі (*avtalsförsäkringar*); яно дапаўняе выплаты па хваробе, беспрацоўі і пенсіі.

дзяржавы ў галіне сацыяльнага дабрабыту. Абодва разглядаюць эканамічныя разрывы ў грамадстве як нешта ў асноўным пазітыўнае; эканамічнае пераразмеркаванне праз падаткі і палітыку дабрабыту лічыцца шкодным, скажальным умяшаннем у рынкавыя механізмы, якія лепш за ўсё спрыяюць росту і развіццю.

І абодва заплюшчваюць вочы на розніцу ў рынкавай сіле паміж вытворцамі і спажыўцамі і паміж рознымі групамі спажыўцоў — розніцу, якая, у сваю чаргу, скажальна ўплывае на грамадства і эканоміку. Агульная рыса кансерватызму і неалібералізму — увогуле, неўспрымальнасць да таго, якое значэнне для жыцця і рэальнага выбару людзей маюць знешнія фактары, фактары, над якімі чалавек не ўладны.

Фактары працоўнага жыцця ўплываюць на фізічнае і псіхічнае здароўе; да таго ж рызыка негатыўнага ўплыву тым большая, чым менш уплыву работнікі маюць на ўмовы сваёй працы. Беспрацоўе звязанае з эканамічнымі спадамі, зменамі ў міжнароднай канкурэнцыі і тэхналагічным развіццём, якое можа знішчаць прадпрыемствы, а часам і цэлыя галіны, так што ранейшых прафесійных ведаў ужо не хапае. Аднак у сённяшнім кансерватыўна-неалібэральным поглядзе на грамадства беспрацоўе і доўгая непрацаздольнасць тлумачацца перадусім (недастатковымі) намаганнямі самога чалавека знайсці працу, а ў некаторых выпадках — нежаданнем пагаджацца на працу на дрэнных умовах, — а не адсутнасцю магчымасці знайсці працу. Беспрацоўе і хвароба вызначаюцца як індывідуальныя праблемы, і таму ўся адказнасць за тое, каб нешта з імі зрабіць, ускладаецца на самога чалавека.

Парадаксальна, але ўрад «Альянсу» адначасова скараціў адукацыю дарослых і праграмы навучання для рынку працы. У выніку беспрацоўны чалавек меў менш магчымасцяў палеп-

шыць свае шанцы знайсці працу. Непаслядоўна выстаўляць людзям патрабаванні і адначасова абмяжоўваць іх магчымасці гэтыя патрабаванні выканаць, але жорсткія ўмовы сацыяльнага страхавання ўключаюць шматлікія дысцыплінарныя патрабаванні — і скепсіс да тых, каму патрэбная дапамога сацыяльнага страхавання.

Дзеля яснасці трэба падкрэсліць, што сацыял-дэмакраты ніколі не лічылі, што сацыяльнае забеспячэнне павінна быць безумоўным. Такія правы павінны быць звязаныя з абавязкамі. Аднак гэтыя абавязкі павінны быць такімі, каб чалавек сапраўды мог іх выканаць, — і таму палітыка дабрабыту можа ўключаць і меры, якія даюць чалавеку больш магчымасцяў адказваць за сябе.

Сённяшнія адрозненні паміж сацыял-дэмакратычным і правым поглядамі на сацыяльнае забеспячэнне адчувальныя. Ёсць адрозненні і ў тым, што датычыць сацыяльных паслуг — адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнай апекі, — але яны праяўляюцца крыху інакш.

Правыя партыі прымаюць прынцып роўнага доступу для ўсіх і тое, што паслугі павінны фінансавацца пераважна з падаткаў. Аднак зніжэнне падаткаў, праведзенае правым урадам, падарвала рэсурсы сферы дабрабыту, і гэта ўсё больш відаць па яе рэальных магчымасцях і рэальнай даступнасці паслуг. Праблемы, якія гэта выклікала, найперш закранаюць эканамічна слабейшыя групы; мацнейшыя групы могуць кампенсаваць іх за ўласны кошт.

Ёсць таксама выразныя рознагалоссі паміж сацыял-дэмакратамі і правымі партыямі адносна таго, якія правілы павінны дзейнічаць для прыватных прадпрыемстваў у сектары, што фінансуецца з падаткаў. Гэта датычыць і права на дывідэнды, і ўмоў заснавання — а значыць, і атрымання падатковых сро-

дкаў. Правыя партыі імкнуцца да большай свабоды для інтарэсаў вытворцаў, гэта значыць кампаній. Сацыял-дэмакраты выступаюць за рэгуляванне і дывідэндаў, і свабоды заснавання. Неабмежаваная свабода, якую дапускаюць цяперашнія правілы (2019), як высветлілася, прыводзіць да відавочна няправільнага размеркавання рэсурсаў, ад якога выйграюць перадусім сацыяльна-эканамічна мацнейшыя групы і эканамічныя інтарэсы, што стаяць за кампаніямі ў сферы дабрабыту.

Кантроль, адказнасць і стымулы

САМО САБОЙ ЗРАЗУМЕЛА, што ва ўсіх дзяржаўных і муніцыпальных сістэмах, якія распараджаюцца падатковымі сродкамі, патрэбныя механізмы кантролю. Патрэбныя правілы, каб прадухіляць і злоўжыванні, і празмернае выкарыстанне, і патрэбны кантроль, каб правілы выконваліся, а прафілактычныя меры працавалі.

У гэтым прынцыповым пытанні паміж сацыял-дэмакратыяй і правымі няма адрозненняў. Аднак для сацыял-дэмакратаў гэты падыход датычыць як эканамічнай падтрымкі людзей, напрыклад дапамогі па беспрацоўі або па хваробе, так і эканамічнай падтрымкі або фінансавай кампенсацыі для кампаній.

Правыя ж выразна адрозніваюць жорсткія патрабаванні кантролю, якія яны ставяць да сістэм сацыяльнага забеспячэння, і слабыя механізмы кантролю, якія яны прапануюць для прыватных прадпрыемстваў у сферы паслуг дабрабыту. Хворых і беспрацоўных падазраюць калі не ў ашуканстве, то прынамсі ў тым, што яны недастаткова стараюцца вярнуцца на працу, і з гэтым трэба змагацца з дапамогай жорсткіх умоў атрымання выплат. Ад прадпрымальнікаў жа заўсёды чакаюць, што ўсе субсідыі яны будуць выкарыстоўваць правільна; дастатковы

кантроль забяспечвае рынкавая канкурэнцыя, таму ніякі дадатковы кантроль з боку грамадства не патрэбны і толькі нясе рызыку парушыць работу рынку.

У такіх перакананнях можна разгледзець схаваны падзел людзей на адказных і менш адказных, у якім выразна адлюстроўваюцца адрозненні, што іх кансерватызм XIX стагоддзя бачыў паміж адукаванымі і маёмаснымі класамі, з аднаго боку, і менш адукаваным рабочым класам, мала хто з прадстаўнікоў якога меў уласнасць, — з другога. Апошніх лічылі менш здольнымі, менш разважлівымі і, адпаведна, значна менш здатнымі браць на сябе адказнасць. На такіх перакананнях грунтаваўся супраціў усеагульнаму выбарчаму праву.

Сёння на практыцы раздзяляльная лінія праходзіць паміж тымі, хто мае працу, і тымі, хто яе не мае. Калі казаць больш агульна, правыя партыі гавораць пра грамадзянскае права на свабоду выбару без палітычнага кіравання, калі справа датычыць паслуг, аплачаных або датаваных з падаткаў, але такія гаворкі спыняюцца, калі справа даходзіць да страхавання па хваробе і па беспрацоўі. Людзей без працы падазраюць у тым, што яны менш сумленна ставяцца да сваіх абавязкаў, і таму кантраляваць іх значна больш неабходна, чым людзей, якія працуюць.

Два паняцці ключавыя ў спрэчцы пра гэтыя адрозненні: адказнасць і стымулы. Яны заслугоўваюць больш уважлівага разгляду.

Сацыял-дэмакратычная мадэль дабрабыту абапіраецца і на абавязкі, і на правы: абавязак плаціць падаткі і выконваць правілы і права атрымліваць частку падатковых паступленняў паводле дзеючых правілаў. Адказнасць за ўласнае жыццё выяўляецца ў класічным ідэале добрапрыстойнага чалавека: чалавека, які працуе і сам вядзе сваю гаспадарку, набывае веды,

клапоціцца пра сваіх дзяцей, з'яўляецца добрым сябрам і добрым грамадзянінам.

Іншымі словамі, людзі адказваюць за тое, як яны распараджаюцца тымі бакамі свайго жыцця, якія сапраўды ім падуладныя. Аднак нельга ўскладаць на людзей выключную адказнасць за тое, на што яны не маюць магчымасці ўплываць. Часам грамадства можа даць для гэтага інструменты. Гэта можа быць, напрыклад, магчымасць для дарослых папоўніць недастатковую адукацыю, якая перашкаджае ім знайсці працу, — і тады на чалавеку ляжыць адказнасць гэтай магчымасцю скарыстацца. Але калі эканамічны спад або фінансавы крызіс выклікае банкруцтва вялікай колькасці кампаній і працы проста няма — у параўнанні з колькасцю тых, хто яе шукае, — тады несправядліва тлумачыць беспрацоўе адсутнасцю імкнення ў саміх беспрацоўных.

Для сацыял-дэмакратыі гэты двайны погляд асноватворны: правы, звязаныя з абавязкамі, адказнасць за тое, што падуладнае чалавеку, і права на падтрымку або абарону ў тым, што яму не падуладнае.

Эканамічныя стымулы, безумоўна, уплываюць на паводзіны людзей, і цалкам разумна, каб дапамога па хваробе і па беспрацоўі была крыху ніжэйшая за ранейшы даход чалавека. Аднак эканоміка — не адзіны вырашальны фактар таго, як чалавек вырашае дзейнічаць, нават у сітуацыях, якія яму падуладныя, і тым больш — калі не.

Адна з мэтаў працоўнага падатковага выліку[2], напрыклад, была ў тым, каб «павялічыць прапанову працы», гэта значыць:

2 Заўвага перакладчыка: працоўны падатковы вылік (*jobbskatteavdrag*) — зніжэнне падатку толькі на зароблены даходы, уведзенае ўрадам «Альянсу» з 2007 года; пенсіі і сацыяльныя выплаты ён не закранаў.

калі людзям дазваляюць пакідаць сабе больш ад прыросту даходу, больш людзей вырашаць працаваць больш. Аднак рашэнні пра тое, колькі гадзін працаваць, — гэта найперш пошук балансу паміж часам і грашыма. Калі дэфіцытны рэсурс — час, зніжэнне падаткаў памяншае чыста эканамічны ціск, які штурхае павялічваць колькасць працоўных гадзін. Яно нават можа заахвоціць людзей скараціць працоўны час, калі заробак «на рукі» застаецца прыкладна такім жа, як раней.

Па-другое, далёка не відавочна, што людзі сапраўды маюць выбар, колькі працаваць. Сённяшні рынак працы ў значнай ступені абапіраецца на пасады з няпоўным працоўным днём і розныя формы часовай працы, і праца на няпоўную стаўку далёка не заўсёды добраахвотная: часам нічога іншага проста не прапануюць. У іншых сітуацыях ад працоўнага жыцця патрабуецца гнуткасць, і яе звычайна лічаць важнай для эфектыўнасці эканомікі — не ў апошнюю чаргу бізнес і правыя. Калі ўсхваляць такую гнуткасць, то дзеля паслядоўнасці трэба прызнаць і тое, што ў выніку многія не могуць мець / не могуць знайсці працу на поўны дзень.

Акрыянне пасля хваробы — справа не толькі сілы волі. Гэта перадусім доступ да той медыцынскай дапамогі, якая патрэбная, каб хваробу лячыць і вылечыць, — а ён вызначаецца тым, колькі рэсурсаў укладваецца ў ахову здароўя. Па-другое, гэта магчымасць рэабілітацыі і/або прафесійнай перападрыхтоўкі для тых, хто пакутуе ад хвароб ці траўмаў, якія ўплываюць на іх рэальную працаздольнасць. Па-трэцяе, гэта патрабаванні да кампаній прыстасоўваць працоўныя месцы і праводзіць рэабілітацыйныя меры для работнікаў, якія хварэлі, — што таксама можа патрабаваць пэўнай фінансавай падтрымкі з боку грамадства.

Або, калі падсумаваць: патрабаванні да чалавека павінны спалучацца і з магчымасцямі гэтыя патрабаванні выканаць, і з мерамі, накіраванымі на тыя фактары эканамічнага і сацыяльнага жыцця, якія ўплываюць на беспрацоўе і здароўе. Зыходны пункт у тым, што ніхто не жыве сваім жыццём незалежна ад грамадства і што ўмовы ў гэтым грамадстве вызначаюць рэальныя магчымасці, якія мае чалавек, — незалежна ад хваробы і беспрацоўя!

Як заключную заўвагу да гэтага агляду палітыкі дабрабыту мы можам канстатаваць, што пагаршэнне страхавання па беспрацоўі не скараціла доўгатэрміновага беспрацоўя, не заахвоціла людзей, якія доўга знаходзяцца на бальнічным, вяртацца на працу часцей, чым раней, а павелічэнне долі прыватных пастаўшчыкоў паслуг дабрабыту не прывяло, як абяцалася, ні да зніжэння выдаткаў, ні да павышэння якасці.

Натуральна, вынікі палітыкі дабрабыту маюць вырашальнае значэнне для таго, якой павінна быць гэтая палітыка і якім — яе маштаб: у якой ступені яна забяспечвае дасягненне пастаўленых мэтаў і ці не мае яна непажаданых пабочных эфектаў?

Ніякая палітыка, вядома, не бывае зусім без ускладненняў або без супярэчлівых мэтаў. Тым не менш тры рэчы можна выразна канстатаваць. Дзякуючы паўночнай мадэлі дабрабыту ў Паўночных краінах найменшыя сацыяльныя і эканамічныя разрывы. У Паўночных краінах таксама найбольшыя асабістыя свабоды і найвышэйшая мабільнасць. І ў Паўночных краінах моцныя і стабільныя эканомікі, а прамысловасць і гандаль вельмі канкурэнтаздольныя на міжнародным узроўні.

Рынкавыя рашэнні ў сферы дабрабыту

ЗА АПОШНІЯ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ рынкавая мадэль усё глыбей пранікала ў тое, як працуюць палітыкі. У дзяржаўны сектар былі ўведзеныя механізмы кіравання, запазычаныя з прыватнага бізнесу, гэта значыць з рынкавага сектара, а прыватным кампаніям дазволілі адкрываць прадпрыемствы ў сферы дабрабыту і атрымліваць прыбытак ад сваёй дзейнасці.

Большая эканамічная эфектыўнасць — захаванне высокай якасці пры меншых выдатках вытворчасці, — большая разнастайнасць прапановы і большая свабода выбару для грамадзян былі палітычнымі аргументамі на карысць гэтых змен. Паводле пануючых у той час рынкава-эканамічных тэорый, прыватныя ўдзельнікі ўвогуле былі больш эфектыўныя, чым дзяржаўныя, і для многіх муніцыпалітэтаў вырашальнымі былі надзеі на адчувальную эканомію без страты якасці.

Аднак вынікі прыватызацыі гэтых надзей не апраўдалі, і ніводнае з праведзеных даследаванняў не дае ніякага пацвярджэння тэорыі, што прыватныя ўдзельнікі павінны быць больш эфектыўныя, чым дзяржаўныя. Ёсць, вядома, шмат прыкладаў добра кіраваных прыватных прадпрыемстваў у сферы дабрабыту з высокай якасцю працы, але на агульным, сістэмным, узроўні праблем шмат.

У шэрагу адносін прыватызацыя павялічыла выдаткі. Гэтыя прыватныя кампаніі неаднаразова атрымлівалі прыбытак, скарачаючы персанал і пагаршаючы ўмовы для работнікаў: у незалежных школах, якія працуюць дзеля прыбытку, у сярэднім менш настаўнікаў на колькасць вучняў, а ў прыватным доглядзе пажылых людзей вышэйшая доля персаналу з пагадзіннай аплатай, і гэтак далей. Асабліва ў ахове здароўя вынікам стала таксама няправільнае размеркаванне рэсурсаў.

Свабода заснавання для прыватных медыцынскіх устаноў прывяла да таго, што ў больш прывабных частках гарадоў адкрылася залішне шмат клінік, з адпаведным ростам выдаткаў, у той час як бальніцы сутыкаюцца з вялікімі праблемамі з рэсурсамі, што вядзе да чэргаў і доўгага чакання. У адукацыі прыватныя альтэрнатывы прывялі да адбору вучняў, што яшчэ больш узмацняе сегрэгацыю, выкліканую жыллёвай сегрэгацыяй.



■ Атэ Мерыканта па мянушцы «Атэ з Амерыкі» частуе кавай жыхароў дома для састарэлых у Оўлу, 7 лютага 1949 года

Найчасцейшая крытыка дывідэндаў зводзіцца да таго, што яны азначаюць выманне падатковых грошай з саміх прадпрыемстваў, і гэтыя грошы становяцца даходам прыватных асоб. Дывідэнды ў сферы дабрабыту нельга апраўдаць, як на камерцыйных рынках, неабходнай цаной за магчымасць весці дзей-

насць. Сумнеўна таксама, ці можна абгрунтавана сцвярджаць, што дывідэнды даюць грамадзянам такія якасці, якіх інакш дасягнуць было б немагчыма. Разнастайнасць прапановы і свабода выбару паміж рознымі альтэрнатывамі, якія звычайна называюць «дадатковымі» якасцямі, не патрабуюць удзельнікаў, што працуюць дзеля прыбытку: гэтыя якасці можна забяспечыць і праз спалучэнне дзяржаўных і прыватных некамерцыйных удзельнікаў, і праз цалкам дзяржаўныя сістэмы з шырэйшай і больш разнастайнай прапановай.

Гэтая дыскусія — што грамадства і грамадзяне атрымліваюць ад выплаты дывідэндаў са сферы дабрабыту — вельмі актуальная. Іншае не менш актуальнае пытанне — што адбываецца, калі інтарэсы прыбытку становяцца інструментам кіравання прадпрыемствамі, якія па вызначэнні не павінны кіравацца патрабаваннямі прыватнай эканамічнай прыбытковасці. Значную частку праблем з прыватызацыяй, або, іншымі словамі, з рынкавай эканомікай, можна растлумачыць тым, што рынкавая логіка і логіка дабрабыту — зусім розныя.

Такім чынам, ключ размеркавання на рынку — цэнавы механізм — не працуе ні з боку спажыўца, ні з боку вытворцы. Мэта была ў тым, каб увесці свабоду выбару, якую рынак дае спажыўцу, і свабоду вытворцы атрымліваць дывідэнды з прыбытку кампаніі, але без рынкавых механізмаў, неабходных для падтрымання балансу паміж попытам і прапановай і для адпаведнага развіцця выдаткаў і выкарыстання рэсурсаў. Акрамя таго, ігнаравалася і тое, што рынкі заўсёды скажаюць размеркаванне на карысць наймацнейшых груп.

На камерцыйным рынку вытворца вызначае цану так, каб пакрыць выдаткі і атрымаць маржу прыбытку, а пакупнік вырашае, ці хоча ён / ці можа ён заплаціць гэтую цану. Аднак калі гаворка ідзе пра паслугі, якія фінансуюцца з падаткаў, доступ

да іх не павінен залежаць ад таго, колькі чалавек можа заплаціць, — нават калі паслугі аказваюць прыватныя кампаніі. Плата за ахову здароўя і сацыяльную апеку аднолькавая незалежна ад таго, ці аказваюць іх муніцыпальныя ці прыватныя прадпрыемствы, а адукацыя бясплатная незалежна ад таго, хто адказвае за яе забеспячэнне.

Іншымі словамі, грамадзянам не трэба несці ніякіх эканамічных наступстваў уласнага выбару, як на камерцыйных рынках: паміж адной альтэрнатывай і другой не павінна быць розніцы ў кошце. Выдаткі нясуць муніцыпалітэты і рэгіёны, і з пункту гледжання рынкавай эканомікі менавіта яны — сапраўдныя пакупнікі. Аднак, у адрозненне ад звычайных рынкаў, яны не маюць магчымасці адмовіцца, калі цана занадта высокая.

Устаноўлены эканамічны факт: так званае фінансаванне трэцім бокам — калі плаціць не спажывец, а нехта іншы — заўсёды схільнае павялічваць попыт і, як следства, выдаткі. Выдаткі растуць і з-за раздробленасці арганізацыі дзейнасці. Абедзве гэтыя з'явы сёння відавочныя ў сферы дабрабыту.

На камерцыйных рынках вытворца вольны вызначаць цэны. Аднак у сектары, што фінансуецца з падаткаў, дзейнічае фіксаваная цана на аднаго вучня або на аднаго пацыента; цана вызначаецца на аснове выдаткаў на адпаведную паслугу, якую аказвае муніцыпалітэт. Іншымі словамі, маржа прыбытку ў яе не ўключаная: муніцыпалітэт не атрымлівае прыбытку ад сваёй дзейнасці.

Тэарэтычна прыватная кампанія ў межах гэтай фіксаванай цаны павінна атрымліваць прыбытак, распрацоўваючы новыя і больш эфектыўныя метады працы. На практыцы ж сітуацыя зусім іншая.

У першаснай медыцынскай дапамозе кампаніі могуць атрымліваць прыбытак, павялічваючы попыт, гэта значыць знаходзячы розныя спосабы павялічыць колькасць пацыентаў. У адукацыі і сацыяльнай апецы ёсць магчымасць атрымліваць прыбытак перадусім за кошт таго, каб трымаць выдаткі — на персанал, памяшканні ці матэрыялы — ніжэй за фіксаваную аплату. Найбольш распаўсюджаны спосаб — скарачаць колькасць персаналу і наймаць работнікаў з крыху ніжэйшай кваліфікацыяй.

Гэта не павінна здзіўляць: гэта натуральнае следства рынкавай логікі. Аднак канчатковы вынік — скажэнне палітыкі дабрабыту. І просты вывад такі: дзейнасць, задача якой — задавальняць патрэбы грамадзян паводле іншых прынцыпаў, чым рынкавыя, нельга ні арганізоўваць, ні размяркоўваць паводле рынкавай логікі. Калі прыватным удзельнікам дазваляецца працаваць у сферы дабрабыту, што фінансуецца з падаткаў, гэта павінна быць звязана з умовамі, якія гарантуюць, што дзейнасць вядзецца паводле логікі сферы дабрабыту. Наяўныя рэсурсы павінны размяркоўвацца паводле прыярытэтаў, якія адказваюць патрэбам грамадзян, — а не паводле таго, наколькі выгадна вытворцу іх задавальняць.

А як жа свабода выбару?

«СВАБОДА ВЫБАРУ» ў значнай ступені стала аргументам, якім прыватныя вытворцы, што працуюць дзеля прыбытку, абараняюць сваё права заснавання і права выплачваць дывідэнды з прыбытку, атрыманага ў сектары, што фінансуецца з падаткаў. Аднак гаворка тут ідзе хутчэй пра свабоду выбару вытворцы, чым спажыўца. Кампаніі, што працуюць дзеля прыбытку, рэдка цікавяцца свабодай выбару людзей у менш пры-

бытковых частках краіны, а прыватныя кампаніі, якія не могуць дасягнуць сваіх мэтаў па прыбытковасці, закрываюцца — нават калі гэта закранае свабоду выбару тых вучняў ці пацыентаў, што выбралі іх. На практыцы «свабода выбару», нават там, дзе вытворцаў шмат, — гэта магчымасць стаць у чаргу на прыём у пэўную школу ці пэўны дом састарэлых без відавочнага права на месца там, бо колькасць месцаў заўсёды абмежаваная.

Неабмежаванай свабоды выбару не бывае. Выбар прадуктаў і паслуг заўсёды вызначаецца эканамічнымі магчымасцямі. Гэта аднолькава датычыць і сферы дабрабыту, і рынку. Вырашальнае пытанне — хто адказвае за абмежаванні: прыватныя вытворцы, якія ацэньваюць, што найбольш прыбыткова, ці агульныя грамадзянскія, гэта значыць палітычныя, ацэнкі таго, што лепш за ўсё адказвае патрабаванню справядлівага размеркавання і роўнага доступу.

На рынку гэтыя межы вызначаюць уласныя фінансавыя рэсурсы кампаніі. У гэтых межах кожны, вядома, мае «свабодны» выбар, але гэта азначае і неабходнасць адмаўляцца ад нейкіх варыянтаў, каб пакінуць месца для тых, якім аддаеш перавагу. Аб'ём вытворчасці, як ужо гаварылася, вызначаецца цэнавым механізмам, і ён на практыцы абмяжоўвае і прапанову, і попыт — нягледзячы на нібыта свабоду заснавання для вытворцаў і нібыта свабоду выбару для спажыўцоў.

У сектары, што фінансуецца з падаткаў, гэтыя межы вызначаюцца падатковымі паступленнямі. У гэтых межах кожны павінен мець роўныя правы на паслугі, аплачаныя з падаткаў, і паслугі павінны быць аднолькавай якасці. Таму размеркаванне рэсурсаў, патрэбнае для дасягнення асноўных мэтаў, нельга забяспечыць павышэннем або зніжэннем цэн для асобных карыстальнікаў. Для гэтага патрэбнае палітычнае рэгуляванне таго,

як грошы размяркоўваюцца паміж рознымі прадпрыемствамі і дзе тыя павінны размяшчацца, — а гэта азначае, што свабода заснавання для вытворцаў, што працуюць дзеля прыбытку, немагчымая. Як выразна паказвае ўвесь досвед, патрабаванні прыбытковасці прыводзяць да залішняй колькасці прадпрыемстваў у адных месцах і недастатковай — у іншых. Рэсурсы накіроўваюцца да адных груп і адводзяцца ад іншых, і сродкі ўвогуле размяркоўваюцца не паводле найбольш тэрміновых сацыяльных, медыцынскіх ці адукацыйных патрэб.

Такім чынам, эканамічныя абмежаванні і свабоды заснавання, і свабоды выбару існуюць і на рынку, і ў сектары, што фінансуецца з падаткаў. Розніца ў тым, што сектар, які фінансуецца з падаткаў, павінен размяркоўваць тое, што ён вырабляе, паводле прынцыпаў патрэбы і справядлівасці, а рынак размяркоўвае сваю прадукцыю паводле плацежаздольнасці асобнага пакупніка, не зважаючы на справядлівасць. Каб захаваць прынцып справядлівасці, патрэбнае палітычнае рэгуляванне аб'ёму вытворчасці — такое, якога на камерцыйных рынках няма.

Такое рэгуляванне датычыць аб'ёму — а не таго, каб прапанова ў межах гэтага аб'ёму была аднолькавай. І палітыка не павінна прадпісваць асобным грамадзянам, у якую школу ці ў які медыцынскі цэнтр ім ісці. Свабода выбару ў межах аб'ёму паслуг, вызначанага палітычна-дэмакратычна, і магчымая, і пажаданая, і ў гэтых рамках можна мець і дзяржаўныя, і прыватныя прадпрыемствы. Аднак умовы для заснавання прыватных прадпрыемстваў павінны вызначаць тыя органы, якія адказваюць за выдаткаванне падатковых грошай ад імя выбаршчыкаў, і яны павінны зыходзіць з таго, што ўвогуле дае грамадзянам найлепшы вынік, — а не з таго, што выгадна прыватным інтарэсам прыбытку. Гэтыя дзве рэчы рэдка супадаюць.

V

Сацыял-дэмакратыя — састарэлая ідэалогія?

БЯССПРЭЧНА, ЗА АПОШНІЯ дзесяцігоддзі сацыял-дэмакратыя страціла сілу і была адцесненая амаль у кожнай краіне, дзе партыя раней мела вельмі моцныя пазіцыі. Гэтая страта пазіцый у цэлым тычыцца і іншых левых груп, тады як правапапулісцкія рухі ўсё больш набіраюць сілу. Палітолагі сцвярджаюць, што старая шкала «левыя — правыя» састарэла і што выбаршчыкі цяпер схільныя рабіць выбар паводле іншай шкалы, на якой аўтарытарныя і нацыянальныя каштоўнасці процістаяць лібертарыянскім і інтэрнацыяналісцкім. І кансерватыўныя, і ліберальныя групы сцвярджаюць, што сацыял-дэмакратычныя ідэалогіі састарэлі, і заклікаюць сацыял-дэмакратаў мадэрнізавацца, гэта значыць цалкам прыняць рынкавы лібералізм.

У гэтай частцы мы абмяркоўваем такія тэзісы і лініі развіцця. Таму яна адрозніваецца ад папярэдніх частак, у якіх сацыял-дэмакратычныя погляды на грамадства выкладзеныя так, як яны прадстаўленыя ў праграме партыі. Погляды, якія мы выкладаем далей, не замацаваныя падобным чынам у афіцыйных дакументах, — гэта нашы ўласныя развагі, што абапіраюцца на традыцыйны сацыял-дэмакратычны аналіз грамадства і на наш уласны досвед сацыял-дэмакратычнай палітыкі.

Новая шкала?

НОВУЮ ШКАЛУ НАЗЫВАЮЦЬ няўклюднай абрэвіятурай GAL-TAN. GAL азначае Green, Alternative, Libertarian — зялёныя, альтэрнатыўныя, лібертарыянскія (ліберальныя), а TAN — Traditional, Authoritarian, National — традыцыйныя, аўтарытарныя, нацыянальныя.

Шкала TAN, відавочна, супадае з кансерватыўнымі поглядамі. Новыя правапапулісцкія партыі, якія ўзнікаюць на гэтай

шкале, падкрэсліваюць хутчэй кансерватыўныя каштоўнасці, такія як сям'я і нацыянальная культура, чым прыватную ўласнасць і прадпрымальніцтва, але ў практычнай палітыцы яны схільныя стаяць на тым жа баку, што і інтарэсы прадпрымальнікаў, і крытычна ставяцца да прафсаюзаў: канфлікты інтарэсаў паміж працай і капіталам супярэчаць іх уяўленням пра нацыянальна-культурную аднастайнасць.

Многія старыя правыя партыі, напрыклад шведскія мадэраты, за апошнія дзесяцігоддзі паступова перайшлі да таго, што самі называюць ліберальным кансерватызмам, які адмаўляецца ад больш культурна-кансерватыўных каштоўнасцяў. Пад ціскам правапапулісцкіх партый, што ўзнікаюць, падобна, адбываецца вяртанне да такіх каштоўнасцяў.

Партыі, якія належаць выключна да шкалы GAL, можна разглядаць як своеасаблівых мадэрнісцкіх левых, бо важную ролю для іх адыгрываюць пытанні роўнасці — фемінізм, антырасізм і крытыка абавязковых сацыяльных нормаў. Аднак паняцце «лібертарыянства» рэдка ўключае праблемы свабоды, якія спараджае эканамічная залежнасць: лібертарыянства скіраванае супраць сацыяльнага і дзяржаўнага прымусу, а не эканамічнага. Зялёныя партыі могуць выстаўляць далёка ідучыя патрабаванні дзяржаўнага кантролю і ўмяшання ў рынкавыя механізмы дзеля аховы навакольнага асяроддзя — пры гэтым без больш грунтоўнага аналізу значэння эканамічнай улады ў грамадстве. Зялёныя партыі могуць таксама падтрымліваць даволі значныя дзяржаўныя меры для кіравання спажывецкімі тэндэнцыямі, спасылаючыся на патрабаванні аховы навакольнага асяроддзя.

Рост партый GAL ніяк не параўнальны з ростам новых праварадыкальных партый. Сумнеўна таксама, што новыя партыі, якія адносяць да шкалы GAL, сапраўды такія ўжо падобныя

адна да адной. «Альтэрнатыўныя» і «лібертарыянскія» партыі не заўсёды «зялёныя». Зялёныя партыі выстаўляюць істотныя патрабаванні палітычнага кіравання і вытворчасцю, і спажываннем, што супярэчыць класічным азначэнням лібертарыянства.

Многія ўсталяваныя партыі адчулі ўплыў тэндэнцый GAL — хоць і па-рознаму. Па абодва бакі лініі падзелу паміж правымі і сацыял-дэмакратамі ўвага да пытанняў грамадзянскіх правоў павялічылася. Гэта ў важных адносінах спрыяла росту роўнасці ў вымярэннях, якія не вызначаюцца класам. Адначасова гэта спрыяла таму, што пытанні несвабоды, вынікам якой з'яўляюцца класавыя падзелы і эканамічная няроўнасць, адсунулі ўбок.

Для правых партый гэтыя тэндэнцыі непасрэдна ўмацавалі ідэі рынкава-ліберальнага лібертарыянства, якое наўпрост падтрымлівае класічныя інтарэсы прадпрымальнікаў. Гэта, у сваю чаргу, азначала палітыку, якая відавочна выгадная інтарэсам прадпрымальнікаў за кошт інтарэсаў работнікаў. Для леварадыкальных партый, якія пасля краху камунізму цяжка шукалі новы профіль, — такіх як Левая партыя, — лібертарыянскія патрабаванні выліліся ў моцны акцэнт на пытаннях ідэнтычнасці: фемінізме, антырасізме і правах ЛГБТК. Нават у сацыял-дэмакратычнай дыскусіі, здаецца, назіраецца тэндэнцыя менеў увагі надаваць эканамічнай уладзе і больш — пытанням грамадзянскіх правоў і ідэнтычнасці.

Няроўнасць мае шмат вымярэнняў, і любая сапраўдная палітыка роўнасці павінна ўлічваць іх усе. Таму праблема не ў тым, што пытанні няроўнасці, якая ўзнікае на падставе іншых вымярэнняў, чым клас, — напрыклад полу, этнічнага паходжання ці сэксуальнай арыентацыі, — сур'ёзна ўвайшлі ў палі-

тычную дыскусію; праблема ў тым, што класавыя пытанні адсунулі на задні план.

Класавыя падзелы сёння і не малыя, і не памяншаюцца. За апошнія дзесяцігоддзі яны павялічыліся — і ў Швецыі, і ў астатнім ЕС. Тое, што партыі левага цэнтру не здолелі як след сфармуляваць адказы на гэтыя пытанні, прывяло да таго, што многія выбаршчыкі, якія апынуліся на «няправільным» баку растучых разрываў, пачалі шукаць адказы ў іншым месцы. І многія знаходзяць іх у правапапулісцкіх партыях.

Правы папулізм

ПРАВЫ ПАПУЛІЗМ ПРЫВАБЛІВАЕ вялікія групы рабочага класа — групы, для якіх на выбарах традыцыйна былі важныя класавая палітыка і палітыка размеркавання. Таму, нават калі тое, што можна назваць культурнымі каштоўнасцямі, адыгрывае ў сучаснай палітычнай дыскусіі большую ролю, застаецца пытанне, ці толькі яны стаяць за ростам правага папулізму — і ці не адыгралі ў гэтым ролю пашырэнне класавых падзелаў і скарачэнне пераразмеркавання. Погляды не ўзнікаюць у сацыяльна-эканамічнай пустэчы — іх фармуе досвед, які людзі атрымліваюць ад навакольнага свету і ад змен у ім.

Ёсць дзве важныя агульныя рысы ўсіх правапапулісцкіх партый. Па-першае, яўная ксенафобія з патрабаваннямі жорсткіх абмежаванняў або наўпроставай забароны ўсякай іміграцыі. Гэта звязана з моцным пачуццём нацыяналізму і вялікім акцэнтам на нацыянальных традыцыях уласнай краіны.

Яшчэ некалькі гадоў таму гэтая рыса пераважала, магчыма засланяючы іншую, гэтак жа цэнтральную рысу правага папулізму — моцны недавер да таго, што лічыцца «грамадскімі элітамі»: да ўсталяваных палітычных партый, СМІ, улад, навукі,

культурнай дыскусіі. Гэты недавер, у сваю чаргу, звязаны са зменамі ў грамадстве і ва ўмовах жыцця, якія былі або ўспрымаюцца як негатыўныя. «Эліту» лічаць абыякавай да гэтых змен або наўпрост датычнай да іх.

Трэнні, якія можа выклікаць рост міграцыйных патокаў, — частка гэтых сацыяльных змен, што ўспрымаюцца як праблемныя. Сюды ж належыць і адчуванне, што «грамадская эліта» не гатовая прызнаць праблему, — а правыя папулісты гатовыя, і гэта дае гэтым партыям магчымасць выдаваць таксама і змены, выкліканыя глабалізацыяй і рынкавым лібералізмам, за праблемы міграцыі. Гэта прыцягнула выбаршчыкаў з груп, якія так ці інакш апынуліся ў становішчы тых, хто адстаў, або адчуваюць пагрозу з боку грамадскага развіцця.



■ Інтэр'ер закінутага дыятамітавага завода з вярчальнай печчу ў Эстра-Енастарпе каля Осбю (Сконе, Швецыя); завод кампаніі Skånska Kiselgur AB працаваў з 1958 па 1982 год

Сцверджанне, што гэтыя сацыяльныя змены адыгрываюць ключавую ролю ў росце правага папулізму, вядома, не азначае, што іншыя чыннікі — нацыяналізм і ксенафобія — не гэтак жа важныя. Мы хочам падкрэсліць неабходнасць вывучаць і тое, і другое і разумець, што паміж негатыўнымі наступствамі глабалізацыі і зрухам поглядаў на карысць процілегласці глабалізацыі — нацыяналізму — ёсць сувязь.

Нельга адмаўляць, што змены ў духу рынкавага лібералізму, якія праводзіліся з 1990-х гадоў, пайшлі на карысць адным групам грамадства і на шкоду іншым. Вялікія гарадскія рэгіёны выйгралі, тады як сельскія рэгіёны, старыя прамысловыя рэгіёны і малазаселеныя мясцовасці спыніліся ў развіцці або прыйшлі ў заняпад. Сталічныя рэгіёны сёння больш сацыяльна расслоеныя, а сацыяльныя і эканамічныя праблемы ў слабейшых раёнах часта пагоршыліся. Умовы працы сталі жорсткімі, бо ўлада наймальнікаў вырасла, а ўплыў прафсаюзаў зменшыўся; умовы занятасці сталі больш няўстойлівымі, а людзям з нізкай адукацыяй або іншымі перашкодамі для працы стала цяжэй трапіць на рынак працы.

Частка гэтага — напрыклад, заняпад некаторых старых прамысловых рэгіёнаў і рост урбанізацыі — звязаная з тэхналагічным развіццём. Але іншую частку, і не ў апошнюю чаргу пытанне пра тое, як кіраваць такім тэхналагічным развіццём, можна апісаць у тэрмінах класічнай шкалы «левыя — правыя»: гаворка ідзе пра тое, якія эканамічныя інтарэсы кіруюць развіццём. Умовы працы — вельмі яскравы прыклад.

Шкала «левыя — правыя»

КАНФЛІКТЫ ПАМІЖ левымі і правымі тычацца роўнасці і эканамічнай улады. Гэтыя пытанні не састарэлі і, безумоўна,

не страцілі значэння ў наш час. Аднак палітычна яны сталі больш размытымі.

Як-ніяк, адной з пануючых рыс апошніх дзесяцігоддзяў стаў вялікі прарыў рынкавага лібералізму. Больш за тое, рынкавы лібералізм у значнай ступені перафармуляваў пытанні пра ролю інтарэсаў капіталу: з пытання пра адрозненні ва ўладзе і інтарэсах яно ператварылася ў пытанне выключна эканамічнай эфектыўнасці, дзе інтарэсы прыбытку, паводле пануючых тэорый, заўсёды вядуць да найбольш эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў і найлепш задавальняюць патрэбы спажыўцоў.

Калі ў прынцыпе ўсё вызначаецца аб'ектыўнымі механізмамі рынку, калі поспех ці няўдача залежаць толькі ад уласных намаганняў чалавека, а такія чыннікі, як сацыяльныя структуры і эканамічныя разрывы, не адыгрываюць ніякай ролі, — гэта засланяе пытанне эканамічных канфліктаў інтарэсаў і няроўных адносін улады. Да гэтага дадаліся цяжкасці, з якімі сутыкнуліся сацыял-дэмакратычныя партыі, фармулюючы альтэрнатывы рынкаваму лібералізму ў сітуацыі, калі — як паказана ў папярэднім раздзеле — ранейшыя эканаміка-палітычныя інструменты перасталі дзейнічаць. Адначасова шэраг трывожных дысбалансаў у эканоміцы патрабаваў мер, якія многія выбаршчыкі ўспрынялі як здраду ідэалогіі партый.

У выніку ўсё гэта разам аслабіла левую частку шкалы «левыя — правыя», што адбілася і на галасах. Прычына найперш не ў тым, што выбаршчыкі страцілі цікавасць да гэтых пытанняў, а ў адсутнасці цэласных палітычных ідэй пра тое, як даваць рады новым структурам улады і новым эканамічным разрывам таго часу.

Тое, што ідэі дзяржаўнай уласнасці і эканамічнага планавання зніклі разам з падзеннем камунізму, не мела асаблівага зна-

чэння для сацыял-дэмакратаў, бо яны адмовіліся ад гэтых ідэй за некалькі дзесяцігоддзяў да таго. Галоўная праблема была ў тым, што рэфармісцкая стратэгія перараз мяркавання эканамічнай сілы — такія магчымасці, як супрацьдзеянне ўплыву эканамічных ваганняў на занятасць, сіла прафсаюзаў на працоўных месцах і здольнасць нацыянальнай дзяржавы кантраляваць фінансавыя патокі, — была аслабленая.

Рынкавая ўлада і рынкавы ўплыў, як гаварылася ў раздзеле пра рынкавую эканоміку, заўсёды размеркаваныя няроўна. Размеркаванне паводле рынкавых механізмаў заўсёды выгаднае мацнейшым інтарэсам, калі толькі не ўжываюцца іншыя метады — такія як прафсаюзная арганізацыя або сацыяльная падатковая палітыка і палітыка размеркавання, — каб ураўнаважыць сітуацыю. Рынкавы лібералізм аслабіў гэтую процівагу і даў фінансавым інтарэсам і інтарэсам прыбытку значна больш свабоды дзеянняў і, адпаведна, больш уплыву на развіццё грамадства. Гэта пайшло на карысць адным групам і пашырыла іх свабоду — у лібертарыянскім сэнсе, — але пашкодзіла іншым.

Тэндэнцыя вядзе да росту сацыяльнай і эканамічнай няроўнасці, і гэта звязана з павелічэннем адрозненняў у эканамічнай уладзе і не ў апошнюю чаргу з ростам уплыву, які набылі чыста фінансавыя інтарэсы. Такое развіццё можна цалкам апісаць праз пункты вымярэння на шкале «правыя — левыя». Гэтую тлумачальную мадэль не варта недаацэньваць. Выклік у тым, каб сфармуляваць палітыку на аснове левай перспектывы, якая будзе адпавядаць стану нашай сённяшняй эканомікі.

Састарэлыя ідэалогіі?

КЛЮЧАВЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ сацыял-дэмакратычнай ідэалогіі — ідэал роўнасці, неабходнасць ураўнаважваць інтарэсы капіталу як інтарэсамі іншых груп, так і грамадскім інтарэсам, і разуменне таго, што чалавек залежыць ад свайго сацыяльнага асяроддзя. З самага пачатку ўсе гэтыя элементы супрацькалі крытыку з боку правых і бізнесу.

- Ідэал роўнасці разглядалі як пагрозу росту, як пагрозу свабоднаму выбару чалавека і як шлях да канфармізму і ўраўнілаўкі. Класічны правы аргумент супраць сістэмы сацыяльнага забеспячэння, якая з'яўляецца часткай намаганняў дасягнуць роўнасці, — што яна робіць людзей пасіўнымі і падрывае іх уласную ініцыятыву.
- Абмежаванні для капіталу праз заканадаўства, падаткі ці, проста кажучы, моцныя прафсаюзы разглядаліся як пагроза прынцыпу свабоднага прадпрымальніцтва і як тое, што падрывае эфектыўнасць прадпрыемстваў, а значыць, і ўсёй эканомікі.
- Акцэнт на значэнні сацыяльных структур і, адпаведна, на вялікіх калектыўных, палітычна вызначаных абавязацельствах у падатковай палітыцы і палітыцы дабрабыту — як і, напрыклад, на ўплыве прафсаюзаў — крытыкавалі як тое, што абмяжоўвае свабоды асобы і перашкаджае эканамічнаму развіццю.

Прарыў рынкавага лібералізму можна лічыць перамогай гэтай крытыкі. Эканамічная няроўнасць за апошнія дзесяцігоддзі выросла, інтарэсы капіталу і прыбытку атрымалі больш свабоды дзеянняў, уплыў прафсаюзаў часткова стрымалі, а пераразмеркаванне праз падатковую палітыку і палітыку дабрабыту скарацілася.

Дык што ж паказваюць вынікі — ці апраўдалася гэтая крытыка? Ці стала эканоміка мацнейшай, а свабоды асобы — шырэйшымі?

Роўнасць

У МІЖНАРОДНЫМ ПАРАЎНАННІ роўнасць у Швецыі застаецца высокай, але яна моцна залежыць ад структур, створаных у часы дзяржавы дабрабыту. Гэтыя структуры сёння змяняюцца, а калі казаць прамей — дэмантуюцца; Швецыя — адна з тых краін, дзе разрывы растуць найхутчэй. Шэраг моцных механізмаў падтрымлівае далейшае ўзмацненне гэтай тэндэнцыі, і нават калі б яна спынілася сёння, ужо створаная няроўнасць патрабуе мер. Гаворка ідзе не толькі пра растучыя эканамічныя разрывы, хоць яны і прыцягваюць найбольш увагі, але і пра павелічэнне разрываў у такіх сферах, як школьныя адзнакі, здароўе, умовы працы і жыллё.

Тэндэнцыя тая ж самая ў ЕС і ЗША: самыя высокія даходныя групы атрымалі вялікую выгаду, тады як самыя нізкія даходныя групы зазналі шэраг адначасовых пагаршэнняў. Яшчэ адна агульная рыса — рост рэгіянальных разрываў: развіццё вакол буйных гарадскіх і сталічных рэгіёнаў і застой і заняпад за іх межамі. Існуюць таксама вялікія і растучыя сацыяльна-эканамічныя разрывы паміж групамі з высокімі і нізкімі даходамі ўнутры саміх сталічных рэгіёнаў.

Тлумачэнняў гэтаму шмат. Адны звязаныя са структурнымі зменамі ў эканоміцы і вытворчых тэхналогіях, іншыя — са свядомымі палітычнымі рашэннямі, а яшчэ іншыя — з большай свабодай дзеянняў для чыста рынкавых механізмаў.

Як мы ўжо неаднаразова адзначалі вышэй, рынак заўсёды выгадны мацнейшым групам — гэта факт.

Да структурных тлумачэнняў належыць і пералом у прамысловасці: у многіх невялікіх прамысловых гарадах прадпрыемствы закрываліся, а працоўныя месцы знікалі. Да гэтых структурных тлумачэнняў адносіцца таксама рост фінансавага сектара, які часткова змяніў функцыянаванне эканомікі, а часткова адкрыў больш магчымасцяў для прыросту капіталу — магчымасцяў, якія, натуральна, дасталіся тым, хто мае найвышэйшыя даходы.

Структурным зменам такога кшталту нельга перашкодзіць, але іх больш праблемныя наступствы палітычныя рашэнні могуць як узмацніць, так і змякчыць. І менавіта гэта тычыцца палітычных рашэнняў — а часам і адсутнасці палітычных рашэнняў, — прынятых за апошнія дзесяцігоддзі.

- Змены, якія ўрад «Альянсу» ўнёс у падатковую сістэму, сістэматычна выгадныя групе з крыху вышэйшымі даходамі — праз спалучэнне зніжаных падаткаў на даходы, зніжаных падаткаў на прырост капіталу і новых падатковых ільгот на прыватныя паслугі. З другога боку, скарачэнне выплат па страхаванні па хваробе і па беспрацоўі, больш жорсткія ўмовы ўступлення ў касы страхавання ад беспрацоўя[1] і значна больш строгая ацэнка права на дапамогу па хваробе азначаюць горшыя эканамічныя ўмовы для тых, хто на бальнічным, і для беспрацоўных — і найперш для тых, хто быў далёкі ад месца на рынку працы або меў працяглыя праблемы са здароўем.

1 Заўвага перакладчыка: у Швецыі страхаванне ад беспрацоўя ў асноўным ажыццяўляюць добраахвотныя касы страхавання ад беспрацоўя (*a-kassor*), звычайна звязаныя з прафсаюзамі; права на выплаты залежыць ад сяброўства ў касе і стажу працы.

- Жыллё становіцца ўсё больш сацыяльна расслоеным, бо тое, дзе можна жыць — і ці ўвогуле ўдасца знайсці жыллё, — цяпер вырашаюць уласныя эканамічныя рэсурсы чалавека. Роўнасць у школах змяншаецца, а ўзровень адукацыі бацькоў значыць для школьных адзнак дзіцяці значна больш. Адно з важных тлумачэнняў гэтага — жыллёвая сегрэгацыя, але эфект узмацняюць рынкавыя механізмы ў сістэме свабодных школ[2]. Увогуле, большая прысутнасць рынку ў сферы дабрабыту прывяла да скажонага размеркавання на карысць мацнейшых груп.
- Расце колькасць няўстойлівых працоўных месцаў і так званай самазанятасці, пашыраецца права наймальніка ператвараць пасаду з поўнай занятасцю ў пасаду з няпоўнай, множацца раздробленыя графікі працы і новыя віды перыядычнай, урывачнай працы («SMS-праца»). У выніку многія людзі ўжо не маюць магчымасці планаваць ні свой час, ні свае фінансы. Узмоцнены ціск у працоўным жыцці, які асабліва закранае кваліфікаваных рабочых, хутчэй за ўсё спрыяе павелічэнню розніцы ў працягласці жыцця паміж людзьмі з вышэйшай адукацыяй і людзьмі з нізкай адукацыяй.

Ці дасягнулі мы ў такім разе росту, ці пашырылі свабоду асобы і ці заахвоцілі больш людзей, што на бальнічным, і беспрацоўных вярнуцца на працу? Агульны адказ на ўсе гэтыя пытанні — «не», хоць пытанне свабоды залежыць ад індывідуальнага пункту гледжання.

---

2 Заўвага перакладчыка: „свабодныя школы" (*friskolor*) — незалежныя школы, якія з 1990-х гадоў фінансуюцца з бюджэту праз школьныя ваўчары нароўні з муніцыпальнымі; многімі з іх кіруюць прыватныя кампаніі, што маюць права атрымліваць прыбытак.

Рост

УЖО НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ многія эканамісты, сярод іх і буйныя — і традыцыйна рынкава-ліберальныя — эканамічныя інстытуцыі, такія як АЭСР і Міжнародны валютны фонд, ставяць пад сумнеў стары тэзіс, паводле якога (вялікія) эканамічныя разрывы з'яўляюцца рухаючай сілай росту. Яны лічаць, што гэты тэзіс часта слушны ў перыяд пераходу ад аграрнага грамадства да індустрыяльнага, але ў сённяшняй вытворчасці, усё больш заснаванай на ведах, сацыяльныя і эканамічныя разрывы перашкаджаюць росту, бо стрымліваюць развіццё чалавечага капіталу.

Погляд, быццам вялікі рост даходаў тых, хто і так мае высокія заробкі, будзе «прасочвацца ўніз» у выглядзе большага дабрабыту для груп з ніжэйшымі даходамі — бо людзі з высокімі заробкамі будуць працаваць яшчэ больш і ўкладаць свае грошы ў прадуктыўныя прадпрыемствы, — служыў аргументам на карысць і высокіх заробкаў кіраўніцтва і спецыялістаў, і зніжэння падаткаў для груп з высокімі даходамі. Ніводзін факт з развіцця апошніх дзесяцігоддзяў гэтую тэорыю не пацвярджае. Вялікі рост даходаў і багацця ў групах з найвышэйшымі даходамі не прасочваецца ўніз, а застаецца там. І замест таго каб укладацца ў вытворчасць, грошы ўкладваліся ў нерухомасць і іншыя асноўныя актывы. Тэорыя «прасочвання ўніз» у цэлым страчвае давер.

Свабода асобы

СВАБОДА Ў ЭКАНАМІЧНЫМ сэнсе, відавочна, выгадная падатковая палітыка.

Людзі, якія доўга знаходзяцца на бальнічным, і беспрацоўныя маюць менш свабоды, а гэта, у сваю чаргу, азначае менш свабоды і для іх сем'яў.

Інтарэсы прадпрымальнікаў атрымалі больш свабоды ў вызначэнні ўмоў працы, але свабода руху стала больш абмежаванай — найперш для груп у больш няўстойлівых сегментах рынку працы. Агульныя даходы гэтых груп таксама вымушана скараціліся, бо яны рэдка могуць разлічваць на заробак за поўную занятасць круглы год.

Гендарная роўнасць і, адпаведна, узровень свабоды жанчын выраслі ў тым сэнсе, што сярэдняя розніца паміж заробкамі мужчын і жанчын паменшылася і на кіруючых пасадах як у прыватным, так і ў дзяржаўным сектары стала больш жанчын. Апошняе трэба разумець так, што сёння жанчыны сутыкаюцца з меншымі перашкодамі, чым раней, калі развіваюць увесь свой прафесійны патэнцыял на працы. Аднак адначасова рынак працы для «жанчын LO» (працаўніц рабочых прафесій, якіх аб'ядноўваюць прафсаюзы Шведскай канфедэрацыі прафсаюзаў) пагоршыўся: стала больш няўстойлівай занятасці і больш вымушаных, скоўваючых умоў працы. У гэтым кантэксце агульнаму росту гендарнай роўнасці процідзейнічае рост класавых падзелаў.

Недахоп рэсурсаў у сферы дабрабыту, выкліканы зніжэннем падаткаў, можа азначаць абмежаванне свабоды для тых, каму патрэбныя гэтыя паслугі, але хто не можа атрымаць іх без доўгага чакання або атрымлівае іх недастатковай якасці. Закрануць гэта можа і сваякоў — напрыклад, калі ім даводзіцца скарачаць свой працоўны час, каб кампенсаваць недастатковую дапамогу на даму або недастатковую асістэнцкую паслугу. Недахоп рэсурсаў прывёў таксама да недаўкамплектаванасці штату, што ўзмацняе ціск на работнікаў, бо азначае

для іх менш свабоды на працы. Паралельна расце крытыка выразнага звужэння свабоды выконваць працу паводле ўласных прафесійных меркаванняў работніка. Мадэлі кіравання, уведзеныя паводле ўзору прыватнага сектара з мэтай мінімізаваць бюракратычную няўклюднасць, замест гэтага прывялі да разрастання адміністрацыйных надбудоў з меншай гнуткасцю і меншай прасторай для штодзённага развіцця.

Вяртанне на рынак працы

ДОЛЯ ПРАЦЯГЛАГА беспрацоўя ў агульным беспрацоўі павялічылася. Сёння наўрад ці які-небудзь сур'ёзны аналіз можа сцвярджаць, што эканамічны ціск на беспрацоўных працяглы час — паспяховы спосаб вярнуць людзей на працу. Асноўная праблема — недастатковая кваліфікацыя ў параўнанні з патрабаваннямі наймальніка, а гэтага не выправіш, плацячы беспрацоўным меншую падтрымку.

Выдаткі на страхаванне па хваробе зменшыліся, але гэта вынік больш строгай ацэнкі, а не таго, што людзі сталі здаравейшымі. Захворванні, звязаныя са стрэсам, растуць. Няма і доказаў таго, што людзі, якія доўга былі на бальнічным, вяртаюцца на працу ў большай колькасці, чым раней. Частка такіх людзей трапляе ў бясконцы круг паміж рознымі праграмамі на рынку працы, іншыя выпадаюць з сістэмы, і іх адсылаюць па дапамогу да сваякоў або па муніцыпальную дапамогу на ўтрыманне. Шэраг даследаванняў засведчыў горшае эканамічнае становішча і горшае здароўе ў людзей, якія не маюць страхавання па хваробе.

Або, калі коратка: Чаканыя станоўчыя вынікі росту няроўнасці не наступілі. Для значных груп грамадства наступствы, наадварот, былі негатыўныя, часам бязлітасна негатыўныя.

Жыллёвая і адукацыйная сегрэгацыя выразна ўспрымаюцца як сацыяльныя праблемы, гэтаксама як і рост рэгіянальных разрываў.

У эканамічнай дыскусіі для развітых эканомік ставіцца пад сумнеў слушнасць класічнага тэзіса пра станоўчае значэнне няроўнасці для росту. І, як ужо згадвалася, усё больш даследаванняў паказваюць, што растучая падтрымка правага папулізму звязаная з растучымі разрывамі — з перакананнем, якое яны выклікаюць у многіх, што «эліты» ў грамадстве — тыя, каму развіццё ідзе на карысць, — не цікавяцца тымі, хто атрымлівае ад яго менш (або нічога).

І гэта, магчыма, самае цяжкае з усіх наступстваў, бо яно па самой сваёй сутнасці нясе рызыку для дэмакратыі.



Беспрацоўны бацька дома з сям'ёй у муніцыпальным жылым доме ў Валіле (Хельсінкі), 1931 год

Састарэў не ідэал роўнасці. Састарэлі — калі не сталі небяспечнымі — погляды, і кансерватыўныя, і неаліберальныя, быццам добра функцыянуючае, стабільнае грамадства можна пабудаваць на вялікіх адрозненнях ва ўмовах жыцця паміж грамадзянамі гэтага грамадства.

Роля інтарэсаў капіталу

РАЗВІЦЦЁ АПОШНІХ дзесяцігоддзяў прывяло да таго, што ўплыў інтарэсаў капіталу і на эканоміку, і на грамадства ўзрос.

- Рост глабальных фінансавых рынкаў аслабіў здольнасць нацыянальнай дзяржавы з дапамогай грашова-крэдытнай і фінансавай палітыкі кантраляваць рух капіталу, а значыць, і эканамічную стабільнасць. Часткова гэта кампенсавалася развіццём міжнароднага рэгулявання, але наўрад ці ў дастатковай ступені. Наступствы відавочныя: узрасла нестабільнасць, раз-пораз узнікаюць банкаўскія і фінансавыя крызісы — у асобных краінах або ў цэлых рэгіёнах, — і ў шэрагу выпадкаў яны вельмі негатыўна адбіліся на сацыяльна-эканамічным становішчы і занятасці. Наглядныя прыклады — Азіяцкі крызіс 1997 года і фінансавы крызіс 2008 года, выкліканы ЗША; яны таксама паказваюць, што наступствы могуць доўжыцца вельмі доўга.

Нейкі час з аптымізмам сцвярджалася, што глабальныя фінансавыя рынкі дадуць значна больш хуткі і эфектыўны доступ да капіталу для новых інвестыцый у вытворчасць, якая толькі зараджаецца. Аднак ужо даўно стала ясна, што фінансавыя рынкі растуць не перадусім за кошт інвестыцый у вытворчасць тавараў і паслуг, а проста генеруюць уласныя прыбыткі, не заходзячы для гэтага ў вытворчасць.

Фінансавыя аперацыі з больш ці менш складанымі каштоўнымі паперамі, за якімі не стаіць ні вытворчасць, ні рэальныя актывы, — частка атрымання прыбытку, і яны нясуць у сабе пагрозу паўторных фінансавых крызісаў. Іншы фактар — інвестыцыі ў рэальныя актывы, гэта значыць у нерухомасць, кошт якой, аднак, раздзімаецца пастаянным перапродажам, — пакуль ланцужок не парвецца і кошты не абваляцца, як гэта здарылася падчас шведскага банкаўскага крызісу 1991 года.

Рост глабальных фінансавых рынкаў, наадварот, негатыўна адбіўся на вытворчасці: кампаніі ў канкурэнцыі за неабходны інвестыцыйны капітал былі вымушаныя падымаць дывідэнды акцыянерам да ўзроўню фінансавага сектара — а гэта, на думку многіх, шкодзіць доўгатэрміновому развіццю.

- Свабодны рух тавараў, капіталу і рабочай сілы — краевугольныя камяні супрацоўніцтва ў ЕС, і як прынцыпы яны, вядома, станоўчыя. Але, як заўсёды, няроўныя адносіны сілы паміж працай і капіталам ствараюць праблемы: свабодны рух рабочай сілы на практыцы ператварыўся ў свабоду на ўмовах, якія дыктуе капітал, гэта значыць інтарэсы прыбытку. У будаўніцтве, дзе шмат падрадаў атрымліваюць кампаніі з краін ЕС з нізкімі заробкамі, і ў транспартнай галіне, якая па самой сваёй прыродзе звязаная з перамяшчэннем праз межы, гэта прывяло перадусім да жорсткай эксплуатацыі рабочай сілы, дэмпінгу заробкаў і часам да сур'ёзных небяспек на працы.

Крытыка — і рост супраціву ЕС, які выразна праявіўся ў Brexit (брэксіце), — прывялі да таго, што ў 2018 годзе некаторыя правілы ЕС, якія тычацца так званай камандзіроўкі работнікаў, гэта значыць працы ў іншай краіне ЕС, чым свая, сталі больш строгімі. Узмацнілі таксама шэраг патрабаванняў да працоўнага асяроддзя ў транспартнай галіне. Галоўнай мэтай гэтых

змен было прадухіліць дэмпінг заробкаў і эксплуатацыю персаналу, і іх можна разглядаць як прызнанне таго, што паміж інтарэсамі кампаній і інтарэсамі работнікаў няма раўнавагі.

- Улада наймальнікаў і рынку працы над працоўным жыццём, як ужо было паказана, узрасла. Колькасць няўстойлівых працоўных месцаў павялічылася, і, галоўнае, яны сталі яшчэ больш няўстойлівымі, чым раней, — настолькі, што людзі на гэтым рынку працы атрымалі новую назву: «прэкарыят», ад спалучэння слоў «precarious» (няўстойлівы) і «пралетарыят». Гэта ў значнай ступені датычыць рабочага класа, але не толькі яго: праектная праца і фрыланс у «сектары сярэдняга класа» на рынку працы таксама азначаюць няўстойлівую занятасць і няўстойлівыя ўмовы аплаты. Для пэўных груп з унікальнымі і запатрабаванымі спецыяльнымі ведамі магчымасць працаваць над усё новымі і новымі заданнямі можа, вядома, азначаць вялікую свабоду выбіраць сваю працу — і ўстанаўліваць на яе цану. Аднак для большасці людзей неабходнасць пастаянна шукаць новую працу проста для таго, каб зарабіць на жыццё, азначае абмежаванне магчымасцяў выбару.

Так званая платформавая эканоміка, або гіг-эканоміка, нараджае новыя віды часовай працы. Заданні, паслугі, працу заказчык і выканаўца ўзгадняюць праз лічбавыя платформы без працоўнага дагавора або дагавора падраду ў традыцыйным сэнсе. Можа здацца, што традыцыйныя інтарэсы наймальніка знікаюць з працоўнага жыцця, але за гэтымі платформамі стаяць моцныя інтарэсы капіталу. Платформавая эканоміка на практыцы — гэта новыя спосабы арганізаваць пасярэдніцтва ў часовай працы, дзе тыя, хто бярэцца за працу, маюць такія ж няўстойлівыя ўмовы, як некалі падзёншчыкі. Да таго

ж наймальнікі не нясуць ніякай адказнасці за тыя інтарэсы, якія кіруюць гэтай дзейнасцю.

Няўстойлівая занятасць не толькі абмяжоўвае магчымасці людзей распараджацца ўласным часам і ўласнымі грашыма. Часта яна абмяжоўвае і магчымасць адмовіцца ад дрэнных умоў працы або адрэагаваць на дрэннае працоўнае асяроддзе. Магчымасцяў для павышэння кваліфікацыі і дапамогі пры пераходзе на іншую працу, як правіла, таксама няма.

Дзіўна ў гэтым кантэксце тое, што многія прыхільнікі правых, здаецца, хочуць вырашыць праблему няўпэўненасці тых, хто знаходзіцца ў найбольш няўстойлівых частках рынку працы, распаўсюдзіўшы дрэнныя ўмовы на большую колькасць груп. Кажуць, што «парогі для ўваходу ў працоўнае жыццё занадта высокія» або што працоўнае заканадаўства абараняе тых, хто мае працу, за кошт беспрацоўных. Тады прапануецца знізіць заробкі і павялічыць няўпэўненасць у працы для ўсіх, каб панізіць парог і зменшыць несправядлівасць. Калі працягнуць метафару парога, можна сказаць, што панізіць хочуць парогі для эксплуатацыі рабочай сілы.

Аднолькава дрэнныя ўмовы для ўсіх можна, магчыма, у пэўным сэнсе лічыць справядлівымі. Аднак такая «справядлівасць» не вырашае ні асабістых, ні сацыяльных праблем з усёй іх няўпэўненасцю і агульнай залежнасцю, якую ствараюць няўстойлівыя, часовыя і нізкааплатныя працоўныя месцы.

- Аднак у адным дачыненні ў свеце вытворчасці з'явіліся новыя процівагі інтарэсам капіталу — іншымі словамі, уводзяцца новыя правілы, а менавіта патрабаванні экалагічнай палітыкі. Больш строгія нормы для выкідаў, энергаспажывання і выкарыстання хімікатаў уведзеныя палітычнымі рашэннямі. Ужо адно гэта паказвае, што грамадскія інта-

рэсы — інтарэсы, якія выходзяць за межы чыста камерцыйных, — даводзіцца абараняць іншымі метадамі, чым тыя, што прынятыя ў прамысловасці і гандлі.

Прынамсі часткова гэтыя рашэнні ў экалагічнай палітыцы прымаліся насуперак інтарэсам капіталу і кампаній, але апошнім раз за разам удавалася змякчаць патрабаванні. Выразная заканамернасць: кансерватыўныя партыі, гэта значыць партыі, часта блізкія да камерцыйных інтарэсаў, ставяцца да больш строгіх экалагічных патрабаванняў да вытворчасці з сумневам, а часам і адкрыта супраць іх выступаюць.

Або, калі коратка: Зрух улады на карысць інтарэсаў капіталу за апошнія дзесяцігоддзі меў шэраг праблемных наступстваў, якія дэстабілізавалі і грамадства, і эканоміку. Увогуле развіццё абвяргае рынкава-ліберальныя ідэі пра тое, што большая прастора для «рынку», гэта значыць для інтарэсаў прыбытку кампаній, дае і найлепшыя грамадскія рашэнні. Інтарэсы прыбытку — адзін з многіх фактараў, якія рухаюць эканамічнае, а значыць, і грамадскае развіццё, і калі гэтыя інтарэсы прыбытку адбіраюць прастору ў іншых інтарэсаў, вынік атрымліваецца негатыўны.

Любое сцвярджэнне, што прыватным інтарэсам прыбытку нельга даваць неабмежаванай прасторы, звычайна падштурхоўвае некаторых каментатараў абурана гаварыць пра «камунізм» і «абагульванне». Таму дзеля яснасці хочам падкрэсліць: ніякае абмежаванне гэтай прасторы не азначае забароны ні прыватнага прадпрымальніцтва, ні прыбытку. Гэта, яшчэ раз, усталяваны факт: добра наладжаная эканоміка і добра наладжанае грамадства павінны ўлічваць мноства розных інтарэсаў і патрэб, а значыць, правілы гульні не могуць грунтавацца на інтарэсах аднаго ўдзельніка, гэта значыць капіталу.

Капітал мае сваю ролю, але яму нельга дазваляць захопліваць усю арэну.

Састарэлыя ідэалагічныя ўяўленні выражае не перакананне, што інтарэсам прыбытку патрэбная процівага. Больш за тое, рэальнасць такая, што паміж капіталам і працай, паміж інтарэсамі прыбытку і грамадскім інтарэсам існуюць канфлікты інтарэсаў. Неабгрунтаваным з'яўляецца якраз погляд, быццам добрае грамадства ствараецца тады, калі інтарэсы капіталу дамінуюць над усімі астатнімі.

Калектыўныя рашэнні і дзяржаўныя абавязацельствы

РАЗВІЦЦЁ АПОШНІХ дзесяцігоддзяў прывяло да таго, што прасторы для грамадскага кіравання і сумесных абавязацельстваў у сферы дабрабыту стала менш. А вось прастора для прыватнага спажывання пашырылася. Розным прыватным кампаніям дазволілі ўвайсці ў сацыяльную сферу, і рынкавыя механізмы размеркавання цяпер маюць больш месца ў сферы дабрабыту, якая фінансуецца з падаткаў.

- Сфера дабрабыту, якая фінансуецца з падаткаў, адчыніла дзверы прыватным кампаніям на надзвычай шчодрых умовах.
- Грамадзяне атрымалі права свабодна выбіраць паміж установамі адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнай апекі.
- Шэраг дзяржаўных манаполій або дзяржаўнае рэгуляванне некаторых галін скасаваныя, і гэтыя галіны цяпер адкрытыя для прыватнай канкурэнцыі. Сярод прыкладаў — пошта, тэлекамунікацыі, чыгунка, таксі і энергазабеспячэнне.

- Патрабаванні закона да стварэння і вядзення кампаніі спрошчаныя.
- Сацыяльнае забеспячэнне — калектыўна фінансаваныя ўсеагульныя сістэмы грашовай дапамогі ў выпадку хваробы і беспрацоўя — істотна скарочанае. Затое падатковыя ільготы на прыватныя хатнія паслугі[3] няўхільна растуць.
- Пасля ўвядзення шэрагу падатковых зніжэнняў і новых падатковых ільгот падатковая нагрузка цяпер прыкладна на пяць працэнтных пунктаў ніжэйшая.

Гэтыя канкрэтныя змены выцякаюць з мыслення, якое відавочна зводзіць сацыяльныя, структурныя прычыны шэрагу грамадскіх праблем да пытання сілы волі і амбіцый асобнага чалавека. У гэтым кантэксце ўвага таксама пераносіцца з сацыяльнага на індывідуальнае.

Гэтыя змены трэба бачыць у сувязі з паваротам у эканамічнай дыскусіі, якая падкрэслівала перавагу рынку і эканамічных стымулаў над палітычнымі рашэннямі і кіраваннем праз правілы, але ў іх ёсць і выразныя элементы як класічнага кансерватызму, так і класічнага лібералізму. Варта таксама дадаць, што прыватныя вытворцы вельмі зацікаўленыя ў тым, каб скарыстацца вялікімі магчымасцямі заробку, якія дае сектар, што фінансуецца з падаткаў.

- Традыцыйнае кансерватыўнае мысленне зыходзіць з перакананасці, што падаткі — гэта непрапарцыйнае адбіранне ў чалавека яго даходу; гэты погляд пераняў і неалібералізм. Недавер да розных формаў сацыяльнага забеспячэння — гэтаксама стары кансерватыўны погляд, яшчэ з часоў

3 Заўвага перакладчыка: маецца на ўвазе шведскі падатковы вылік RUT (*RUT-avdrag*, з 2007 года): частку кошту хатніх паслуг — прыбірання, догляду, дапамогі па гаспадарцы — можна вылічыць з падатку на даход.

самых першых прапаноў 1880-х гадоў: лічыцца, што сацыяльнае забеспячэнне адбівае ў людзей ахвоту самім адказваць за свой заробак на жыццё. Гэты недавер можна звязаць з рынкава-ліберальнымі тэорыямі стымулаў, гэта значыць з поглядам, што паводзінамі чалавека — у тым ліку воляй паправіцца пасля хваробы або знайсці працу — можна кіраваць правільным спалучэннем эканамічных узнагарод і пакаранняў.

- Класічнаму лібералізму — XVIII стагоддзя і значнай часткі XIX — уласцівы глыбокі недавер да дзяржавы. Прарыў дэмакратыі дапамог гэты недавер змякчыць, і новы сацыяльны лібералізм бачыў у дзяржаве важны інструмент сацыяльных рэформаў. Аднак з'яўленне неалібералізму ў канцы XX стагоддзя вярнула перакананне, што ролю дзяржавы трэба звесці да мінімуму.
- Ідэі шырокай індывідуальнай свабоды выбару ў сектары паслуг, які фінансуецца з падаткаў, у 1970-я гады выказвалі як левыя, так і правыя партыі. Аднак практычнае ўладкаванне сістэмы свабоды выбару і прыватызацыі было натхнёнае неаліберальнымі мадэлямі.

Дык ці праўда, што гэтыя тэорыі пацвердзіліся, гэта значыць што меншая роля дзяржавы і калектыўных абавязацельстваў у сферы дабрабыту прыводзіць да лепшага функцыянавання, большай эфектыўнасці і большай асабістай свабоды дзеянняў?

Ёсць некалькі аргументаў на карысць змены правілаў для дзяржаўнай камерцыйнай дзейнасці. Тэхналагічнае развіццё зрабіла некаторыя правілы састарэлымі; найбольш выразны прыклад — сфера тэлекамунікацый. У іншых выпадках правілы былі нескладна прадуманыя і занадта жорсткія ў параўнанні з грамадскімі зменамі, якія адбыліся. Так што змены былі пат-

рэбныя, але працэсы дэрэгуляцыі апынуліся пад уладай рынкавых мадэляў, якія тады панавалі.

Рынак тэлекамунікацый можна лічыць удалым прыкладам дэрэгуляцыі, але тут важна заўважыць, што тэхналагічнае развіццё і падштурхнула, і зрабіла магчымай зусім іншую сістэму ў параўнанні са старой манаполіяй. У шэрагу іншых выпадкаў, напрыклад на рынку электраэнергіі, спатрэбілася ўвесці шмат новых правілаў — перадусім для абароны інтарэсаў спажыўцоў.

Адна праблема, якая, магчыма, найбольш выразна відаць на чыгунцы і ў фармацэўтычнай галіне, — тое, што ніхто з удзельнікаў не нясе агульнай адказнасці за тое, каб сістэма працавала як цэлае. А такая агульная грамадская адказнасць неабходная для кампаній, якія выконваюць ключавыя грамадскія функцыі, — напрыклад, у інфраструктуры, энергетыцы або фармацэўтыцы. Фармацэўтыка — добры прыклад: паставкі жыццёва неабходных лекаў не могуць спыніцца толькі таму, што няма нікога, хто адказваў бы за дастатковыя запасы. Пошта і тэлекамунікацыі павінны добра працаваць не толькі ў гарадах, але і ў сельскай мясцовасці, якая для прыватных кампаній недастаткова прыбытковая.

У гэтым і палягае галоўная праблема: ніводзін удзельнік рынку не можа ўзяць на сябе агульную адказнасць, якой патрабуюць патрэбы грамадства. Прыватныя кампаніі дзейнічаюць паводле рынкавых умоў і рынкавай логікі; яны не могуць абараняць інтарэсы грамадства — толькі свае ўласныя — і не могуць браць на сябе больш адказнасці, чым ахоплівае іх уласны баланс.

Цяжка знайсці доказы таго, што дэрэгуляцыя дала абяцаныя станоўчыя вынікі для нацыянальнай эканомікі. У шэрагу аспектаў мы, наадварот, бачым пагаршэнне працы. На пошце і чы-

гунцы, напрыклад, адыгрываюць ролю і іншыя фактары, але нават на гэтых прыкладах відавочна, што ўяўленні пра станоўчыя наступствы канкурэнцыі паміж некалькімі ўдзельнікамі не спраўдзіліся ў рэчаіснасці.

Тое самае тычыцца прыватызацыі ў сферы дабрабыту. Наступствы ў гэтай сферы ўжо вывучаліся ў некалькіх грунтоўных даследаваннях. Ніводнае з іх не знаходзіць доказаў агульнага зніжэння выдаткаў або павышэння якасці. Затое даследаванні паказваюць, што прыватызацыя, насуперак прагнозам, негатыўна паўплывала на заробкі і працоўны час.

Калі адчыніць дзверы кампаніям, якія працуюць дзеля прыбытку, то, па зразумелых прычынах, тое, дзе яны адкрываюцца, вызначаецца крытэрыямі прыбытковасці, гэта значыць прапанова ідзе туды, дзе попыт найвышэйшы. Такім чынам, рэальная свабода выбару для грамадзян на практыцы вызначаецца тым, дзе вытворцы гатовыя адкрываць сваю дзейнасць.

Права выбіраць паміж установамі адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнай апекі ў прынцыпе пажаданае. Аднак гэта паслугі, якія, апроч карысці для асобнага чалавека, маюць шырокае грамадскае і сацыяльнае значэнне, і таму патрэбныя правілы, якія абаранялі б гэтую шырокую карысць ад шкоды. Сённяшнія правілы гэтаму патрабаванню не адпавядаюць. Пашырэнне індывідуальнага права выбару ўвайшло ў канфлікт з агульным грамадзянскім правам размяркоўваць падатковыя сродкі паводле шкалы важнасці.

Ідэя спрасціць правілы стварэння і вядзення кампаній можа быць станоўчай, але менш станоўчы вынік — на які звярнулі ўвагу шэраг дзяржаўных органаў, у тым ліку Шведскае ўпраўленне па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі і Шведскае падатковае ўпраўленне, — у тым, што кампаніі ўсё часцей ста-

новяцца інструментам злачыннай дзейнасці: адмывання грошай, ухілення ад падаткаў і махлярства ў сферы дабрабыту.

Зніжэнне падаткаў прывяло да ўсё большага недафінансавання як паслуг дабрабыту, напрыклад аховы здароўя і сацыяльнай апекі, так і іншых грамадскіх службаў, такіх як судова-прававая сістэма, чыгунка і службы занятасці. У сферы дабрабыту гэтае недафінансаванне выклікала і чэргі, і пагаршэнне абслугоўвання для карыстальнікаў — перадусім у ахове здароўя і доглядзе пажылых людзей, — а таксама недахоп персаналу і павелічэнне нагрузкі на работнікаў. Усё больш пацвярджанняў гэтаму — у росце колькасці работнікаў, якія ідуць на бальнічны і пакідаюць сферу.

Як паказана вышэй, скарачэнне грамадскіх паслуг з-за недахопу рэсурсаў прывяло да таго, што асобныя хатнія гаспадаркі вымушаныя выкарыстоўваць уласныя рэсурсы, каб дапамагаць пажылым сваякам і сваякам з інваліднасцю. Большая адказнасць прыватных асоб — гэта, вядома, адзін з кансерватыўных аргументаў на карысць скарачэння сацыяльных паслуг, але гэтая адказнасць, як паказваюць факты, размеркаваная несправядліва. У групах з вышэйшымі даходамі наступствы часта згладжвае магчымасць карыстацца хатнімі паслугамі з падатковымі ільготамі, тады як у групах з ніжэйшымі даходамі няма грошай на такія паслугі. Такім чынам, правы, заснаваныя на падатковых выліках, часткова замянілі праверку патрэбы; і тое, і другое на практыцы фінансуецца з падаткаў, але наступствы для размеркавання зусім розныя.

Што тычыцца астатняй сацыяльнай сферы, то, магчыма, самыя небяспечныя наступствы відаць у судова-прававой сістэме, якая цяпер горш спраўляецца з новымі відамі злачыннасці, што нараджае грамадскае развіццё, — і з гвалтоўнымі

злачынствамі, і з вытанчаным махлярствам і эканамічнымі злачынствамі.

Распад паслуг дабрабыту і грамадскіх службаў найбольш балюча ўдарыў па рэдка заселеных раёнах краіны: там закрываюцца мясцовыя службы, і па такія паслугі, як медыцынская дапамога або паліцыя, даводзіцца ездзіць далёка. У такіх раёнах недастаткова людзей, каб гэтыя паслугі былі прыбытковымі.



САДАНКЮЛЯ · 1937 · АЎТОБУС НА ПЕЦАМА

ДАЛЁКА

Людзі садзяцца ў аўтобус, які ідзе ў Пецама, Саданкюля (Фінская Лапландыя), 1937 год; фота Самулі Паўлахар'ю

Хутчэй за ўсё, такі ўплыў падатковых зніжэнняў на сферу дабрабыту не быў наўмысным: агульнае меркаванне, здаецца, было такое, што зніжэнні павялічаць занятасць, а значыць, і падатковую базу, неабходную, каб кампенсаваць зніжэнні. Аднак скарачэнні страхавання па хваробе і беспрацоўі былі

наўмыснымі: лічылася, што нізкія выплаты прымусяць беспрацоўных і хворых больш старацца знайсці працу і пагаджацца на працу з горшымі ўмовамі. Іншымі словамі, хваробу і беспрацоўе разглядалі як нешта, што людзі могуць выбраць або не выбраць у залежнасці ад фінансавых пераваг і недахопаў кожнага з варыянтаў.

Гэтыя скарачэнні, як ужо згадвалася, былі спалучэннем рынкава-ліберальнага мыслення ў катэгорыях стымулаў і кансерватыўнага недаверу да сацыяльнага забеспячэння. Гэты недавер, наадварот, здаецца, толькі вырас, калі высветлілася, што тэорыя стымулаў памылковая. Калі б яна была правільнай, доўгатэрміновае беспрацоўе і доўгатэрміновыя бальнічныя павінны былі б скараціцца. Аднак доўгатэрміновае беспрацоўе, наадварот, вырасла, а людзі на доўгім бальнічным вяртаюцца на працу не часцей, чым раней, — доказ таго, што прычыны нельга шукаць у памеры выплат. Нягледзячы на гэта, прынамсі мадэраты выступаюць за далейшае скарачэнне выплат — якраз з аргументам, што яны робяць людзей пасіўнымі.

Скарачэнні ў сістэме сацыяльнага страхавання прывялі да таго, што бакі рынку працы распрацавалі страхаванні ў рамках калектыўных дамоў. Гэта ілюструе, як страта грамадскіх абавязацельстваў часта замяняецца іншымі відамі калектыўных абавязацельстваў — насуперак ідэалагічным уяўленням пра большую індывідуальную адказнасць. Тым не менш гэтыя страхаванні па сваім вызначэнні ахопліваюць толькі работнікаў кампаній, якія падпісалі калектыўныя дамовы, і пакідаюць вялікія групы людзей — некалькі соцень тысяч — без такога дадатковага страхавання.

Доля прыватнага медыцынскага страхавання таксама расце. Зразумела, такое страхаванне даступнае перадусім эканамічна

мацнейшым групам, да таго ж для людзей з праблемамі са здароўем або з небяспечнай працай страхавыя ўзносы вышэйшыя. Узровень пакрыцця ў прыватных страхавых схемах увогуле заўсёды ніжэйшы, чым у дзяржаўным страхаванні. Выраўноўвання рызык, якое ёсць у дзяржаўных сістэмах, у прыватных схемах няма, і многія людзі па эканамічных прычынах будуць мець недастатковае пакрыццё або не будуць мець яго зусім.

Калі коратка: Прыватызацыя, дэрэгуляцыя і свабодная канкурэнцыя не сталі тым зіхатлівым маяком паляпшэнняў у сацыяльнай сферы, якім іх абяцалі, калі абгрунтоўвалі іх увядзенне. Прычына ў тым, што кампаніі, створаныя не толькі дзеля індывідуальнай карысці, але і для задавальнення важных калектыўных патрэб, павінны быць арганізаваныя інакш, чым кампаніі, якія займаюцца толькі індывідуальным продажам тавараў або паслуг.

Таму максімізацыя прыбытку не можа быць галоўным эканамічным механізмам кіравання, як на камерцыйных рынках. І патрабаванне шырокай каардынацыі несумяшчальнае з логікай рынкавай канкурэнцыі. Прыватныя кампаніі, вядома, могуць аказваць добрыя паслугі ў сацыяльнай сферы, але правілы для такіх кампаній павінны грунтавацца на патрэбах грамадства, а не на рынкавай мадэлі.

Што тычыцца правілаў для бізнесу ўвогуле, то само сабой зразумела, што лішніх правілаў трэба пазбягаць. Але гэтак жа бясспрэчна, што некаторыя правілы неабходныя, каб спыняць несумленныя або проста махлярскія кампаніі. Гэта патрэбна і для таго, каб абараніць кліентаў, работнікаў, усе сумленныя кампаніі і грамадства ў цэлым.

Арганізацыя паслуг дабрабыту, у тым ліку ўдзел прыватных удзельнікаў, павінна грунтавацца на патрэбах грамадзян, а не

на патрабаваннях прыбытковасці прыватных удзельнікаў, — бо патрабаванні прыбытковасці не заўсёды адпавядаюць патрэбам грамадзян ні на індывідуальным узроўні, ні для грамадства ў цэлым. Правілы павінны быць сфармуляваныя так, каб абараняць магчымасць размяркоўваць рэсурсы паводле шкалы важнасці і паводле патрабаванняў роўнасці.

Больш за тое, збор падаткаў павінен адпавядаць той дзейнасці, якую з гэтых падаткаў трэба фінансаваць. Тыя партыі, якія хацелі б знізіць падаткі, павінны дзеля сумленнасці і паслядоўнасці таксама сказаць, якія паслугі яны прыбралі б са сферы дабрабыту, каб гэта можна было зрабіць арганізавана. Немагчыма сцвярджаць, што ўсеагульную палітыку дабрабыту паводле мадэлі сацыял-дэмакратаў можна захаваць пры тых зніжэннях падаткаў, якія прапануе мадэль мадэратаў!

Па-шведску грамадства — «samhälle», і прыстаўка «sam» азначае тое, што ў нас ёсць разам і агульнае. Ідэя, што тым, што ў нас агульнае і што датычыць усіх сяброў грамадства, трэба распараджацца паводле нашых агульных патрэб, зусім не састарэла. Неабгрунтаваным з'яўляецца якраз уяўленне, быццам агульныя інтарэсы лепш за ўсё забяспечваюцца тады, калі кіруюцца прыватнымі разлікамі прыбытковасці.

Самыя небяспечныя наступствы — расколіны ў грамадстве

У МІЖНАРОДНАЙ ДЫСКУСІІ — нават ліберальнага кшталту — сёння расце крытыка ўлады інтарэсаў капіталу і сляпой веры ў рынкавыя рашэнні як адказ на патрэбы грамадства і сацыяльныя праблемы. Многія перасцерагаюць ад рызыкі большай сацыяльнай напружанасці і выразна бачаць сувязь паміж ёй і ростам правага папулізму.

З самой прыроды роўнасці вынікае, што негатыўныя наступствы найбольш заўважныя ў тых групах, якія апынуліся — або адчуваюць, што могуць апынуцца, — на няправільным баку новых разрываў. Тыя, хто на правільным баку, не заўважаюць тых, каму горш, і, наадварот, здаецца, лічаць, што грамадства працуе лепш, чым раней. Для многіх Швецыя застаецца вельмі добрай краінай для жыцця.

Аднак усё больш відавочна, што разбурэнне грамадскіх паслуг і большая неабароненасць у працоўным жыцці адбіваюцца і на тых, хто на правільным баку разрыву: у выглядзе больш жорсткага грамадскага клімату з відавочнымі сацыяльнымі праблемамі, дзе палітычныя і рэлігійныя экстрэмісцкія рухі ўплываюць зусім па-новаму. Вядома, важна не перабольшваць негатыўныя тэндэнцыі і ні ў якім разе не лічыць іх нават паловай агульнай карціны, але сам факт, што яны ўвогуле існуюць і ў параўнанні з сітуацыяй некалькі дзесяцігоддзяў таму ўзмацняюцца, безумоўна, трэба ўспрымаць як трывожны сігнал.

Стабільнасць і салідарнасць у грамадстве ці краіне ў вялікай ступені грунтуюцца на ўзаемных абавязках і правах грамадзян, сфармуляваных так, каб усе адчувалі, што маюць разумныя магчымасці ўплываць на грамадскае развіццё, што да іх ставяцца на роўных умовах з усімі астатнімі і што ўсе астатнія паважаюць як свае правы, так і свае абавязкі. Асабістае жаданне выконваць правілы і абавязкі звязанае з упэўненасцю, што іншыя будуць рабіць тое самае. Гэтае жаданне значна слабее, калі ты асабіста адчуваеш, што твае правы скарачаюцца, а абавязкі застаюцца, што іншыя групы атрымліваюць больш пераваг за твой кошт і што ты мала што можаш змяніць, бо тыя, каго лічаць адказнымі, не слухаюць.

Навейшыя даследаванні ў палітычнай навуцы паказалі, што вырашальны фактар грамадскага даверу і грамадскай згурта-

ванасці — якраз давер да грамадскіх інстытутаў, адчуванне, што яны працуюць справядліва і ставяцца да ўсіх аднолькава і што заканадаўства і правілы не ўзнагароджваюць адны групы перад іншымі. З гэтага пункту гледжання давер да грамадскіх паслуг і паслуг дабрабыту вырашальны і для даверу да палітычнай сістэмы, гэта значыць да дэмакратыі.

Відавочна, што развіццё апошніх дзесяцігоддзяў падарвала давер да гэтых грамадскіх інстытутаў і грамадскіх паслуг, бо цяпер яны працуюць горш, чым раней. Яшчэ адна істотная частка тлумачэння — у палітыцы, якая адначасова выклікала недахоп рэсурсаў і няправільнае размеркаванне тых рэсурсаў, што яшчэ ёсць.

Відавочна таксама, што гэта стварае напружанасць паміж рознымі групамі насельніцтва і паміж рознымі часткамі краіны, а гэта, у сваю чаргу, падрывае салідарнасць у краіне. Калі ўсё больш людзей адчуваюць, што да іх ставяцца несправядліва, у пачуцці супольнасці і лаяльнасці да супольнасці пачынаюць з'яўляцца расколіны.

VI

Будучыня?



ХЕЛЬСІНКІ · 1932 · ГАЗЕТНЫЯ КІЁСКІ

ПЛЮРАЛІЗМ

Газетныя кіёскі ў Хельсінкі, 1932 год

СЁННЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЯ можа азірнуцца на больш чым стогадовую гісторыю. Грамадства, у якім узнікла партыя, рэзка адрознівалася ад сучаснага — настолькі, што яго, мабыць, цяжка нават зразумець; тое ж датычыцца і перыяду дзяржавы дабрабыту ў 1950-я і 1960-я гады. З 1889 года, калі была заснаваная партыя, грамадства змянялася некалькі разоў: змяняліся спосабы кіравання, структура гаспадаркі, рынак працы, сацыяльныя правы, дэмаграфія, эканамічны дабрабыт — а таксама нормы і каштоўнасці. Часам гэтае развіццё ішло па прамой лініі, а часам рэзка паварочвала ў новым кірунку. Многія ранейшыя праблемы былі вырашаныя, хоць часам толькі для таго, каб зноў з'явіцца ў новым абліччы, а пастаянныя змены ў грамадстве спарадзілі новыя праблемы.

Аднак некаторыя асноўныя тэндэнцыі застаюцца падобнымі. У любыя часы можна заўважыць барацьбу вакол пытанняў роўнасці, размеркавання эканамічнай улады і ролі і сферы ўплыву палітычнай дэмакратыі. Барацьба за дэмакратыю ахоплівае ключавыя пытанні пра тое, якім сілам і якім інтарэсам належыць кіраваць развіццём грамадства — грамадзянам разам ці рознага кшталту сацыяльным або эканамічным элітам.

З такога пункту гледжання дыскусія заставалася нязменнай праз усю гісторыю партыі, хоць знешнія ўмовы, у якіх гэтыя пытанні ставіліся, змяняліся па-рознаму.

Адрозненні паміж сённяшняй публічнай дыскусіяй і дыскусіяй таго часу, калі ў 1974 годзе выйшла першае выданне гэтай кнігі, безумоўна, вялікія; у пэўных адносінах іх можна нават назваць дыяметральна процілеглымі. Аднак у аснове абедзвюх ляжаць ключавыя пытанні дэмакратыі.

Першае выданне гэтай кнігі, *«Што такое сацыял-дэмакратыя?»*, выйшла ў 1974 годзе. Палітычная дыскусія тады

вялася з левых пазіцый, прычым настолькі левых, што нават сацыял-дэмакратыя ў іх не ўпісвалася. Мы пісалі гэтую кнігу, каб растлумачыць і абгрунтаваць рэфармісцкую сацыял-дэмакратыю ў процівагу дактрынёрскаму сацыялізму рэвалюцыйнага адцення, у якім і палітыка размеркавання, і палітычная дэмакратыя лічыліся толькі маніпуляцыяй, каб прымусіць рабочы клас прыняць капіталізм.

Сёння, праз 45 гадоў, публічная дыскусія вядзецца з правых пазіцый, і яны зрушыліся так далёка ўправа, што многія прыхільнікі правых 1970-х гадоў наўрад ці пазналі б у іх сябе. Сённяшняя правая дыскусія, як і дыскусія левых 1970-х, рэлятывізуе значэнне палітычнай дэмакратыі і ставіць пад сумнеў палітыку размеркавання, хоць і з адваротнага боку: калі левыя 1970-х бачылі ў дэмакратыі і палітыцы размеркавання сродкі падтрымкі капіталізму, то цяпер у іх бачаць перашкоды для ўплыву «рынку», г. зн. на практыцы — інтарэсаў капіталу.

Левым 1970-х гадоў было цяжка зразумець, навошта дэмакратыі патрэбны плюралізм меркаванняў. Гэта вынікала з таго, што камунізм марксісцкага кшталту лічыўся навукова абгрунтаваным кірункам развіцця грамадства; іншыя погляды, заснаваныя на іншых перакананнях, ужо самім гэтым азначэннем былі шкоднымі адхіленнямі, якім не было чаго даваць месца.

Сённяшнія правапапулісцкія і радыкальна-кансерватыўныя дыскусіі, хоць і ў іншых формах, таксама б'юць па плюралізме, на якім трымаецца дэмакратыя, бо і яны патрабуюць вышэйшай ідэалогіі, якая кіравала б усёй палітыкай. Такой вышэйшай ідэалогіяй становяцца «нацыя» і «народ» з іх меркаванай агульнай гісторыяй і культурай і без ніякіх эканамічных канфліктаў інтарэсаў. Адхіленні ад гэтай культуры адзінства,

вызначанай праз народ, лічацца шкоднымі адхіленнямі, якія таксама трэба выключыць з дыскусіі.

Рынкавы лібералізм і ліберальна афарбаваныя плыні ў кансерватызме, безумоўна, не патрабуюць аднолькавасці меркаванняў: лібералізм сапраўды і паслядоўна плюралістычны ў тым, што датычыць свабоды слова і меркаванняў. Аднак рынкавы лібералізм імкнецца звузіць сферу ўплыву дэмакратыі на карысць рынкавых механізмаў — і за апошнія дзесяцігоддзі ў гэтым значна дасягнуў поспеху.

Гэта стварыла для дэмакратыі праблемы і, такім чынам, становіць для яе пагрозу.

Вярнуць дэмакратыю

ТАМУ АДНА З ГАЛОЎНЫХ задач — умацаваць дэмакратыю, або, іншымі словамі, вярнуць яе. Гэтая задача ахоплівае шэраг сфер палітыкі, і далей мы толькі эскізна акрэслім некалькі ключавых пытанняў.

- Вярнуць права вырашаць ад рынку — г. зн. на практыцы ад моцных інтарэсаў капіталу і карпарацый — палітычнай дэмакратыі: гэта трэба разглядаць як істотную задачу сацыял-дэмакратаў. Абарона дэмакратычных свабод і правоў ад дактрынёрскіх рухаў, як палітычных, так і рэлігійных, — таксама ключавая задача, але гэтая абарона можа быць паспяховай толькі тады, калі ўдаецца захаваць давер да дэмакратыі як формы кіравання. І тут бачная выразная сувязь са здольнасцю дэмакратыі дзейнічаць — вырашаць праблемы, якія важныя для жыцця і штодзённых абставін людзей, але якія яны не могуць вырашыць самі.

Вярнуць дэмакратыі прастору — значыць павялічыць магчымасці кіраваць важнымі грамадскімі, агульнымі для грамадзян справамі, якія аслабіла рынкавае мысленне. Патрэбныя новыя правілы для дзейнасці прыватных кампаній у сферы, што фінансуецца з падаткаў. Тут мы маем на ўвазе правілы, якія дазваляюць размяркоўваць выдаткі паводле іх важнасці і знаходзіць найбольш разумныя рашэнні для грамадзян на разумных умовах для работнікаў і ў межах наяўных рэсурсаў. На жаль, на момант напісання кнігі такіх правілаў няма.

Акрамя таго, неабходна ўзмацніць кантроль над фінансавымі рынкамі. Гэта пытанні, якія сацыял-дэмакратыя павінна прасоўваць у сваім міжнародным супрацоўніцтве — як з іншымі сацыялістычнымі партыямі, так і ў міжурадавых органах. Відавочна таксама, што магчымасці кантролю ў шведскай банкаўскай сістэме патрабуюць перагляду.

- Цалкам відавочна, што растучыя разрывы не ідуць на карысць дэмакратыі, і гэта пацвярджаюць як даследаванні палітолагаў, так і наша сённяшняя рэчаіснасць. Вялікія разрывы вядуць да меншага паразумення і даверу паміж рознымі групамі насельніцтва, а дэмакратыі паразуменне і давер патрэбныя, каб узгадняць розныя меркаванні і патрэбы і знаходзіць удалыя рашэнні. Спыніць рух да растучых разрываў і, больш непасрэдна, вярнуцца да палітыкі большай роўнасці — важныя задачы сацыял-дэмакратаў.

Павярнуць тэндэнцыю ад растучых разрываў да змяншальных — задача, мякка кажучы, шырокая, бо разрывы растуць у некалькіх вымярэннях — эканамічным, сацыяльным, рэгіянальным — і ўзаемна ўплываюць адзін на адзін. Таму, каб спыніць гэтае развіццё, патрэбная комплексная праграма. У гэтай сувязі мы хацелі б вылучыць адно пытанне — палітыку большай роўнасці ў школах, бо сённяшняя няроўнасць уплывае

далёка на будучыню праз вялікі разрыў у магчымасцях дзяцей на іх шляху да дарослага жыцця.

- Справядлівае і роўнае стаўленне таксама важнае для легітымнасці дэмакратыі, і гэта датычыцца ўсіх грамадскіх інстытутаў — у тым ліку падатковай сістэмы. Недахопы, каб не сказаць несправядлівасці, гэтай сістэмы паступова нарасталі шмат гадоў, у тым ліку ў формах, якія дазваляюць ухіляцца ад падаткаў. Усю падатковую сістэму трэба перабудаваць, каб яна стала больш справядлівай, выконвала сваю задачу — фінансаваць важныя грамадскія функцыі — і рабіла гэта больш эфектыўна, чым сёння.

Мы павінны аднавіць асноўны прынцып — як з пункту гледжання палітыкі размеркавання, так і з пункту гледжання справядлівасці, — паводле якога падатак спаганяецца паводле плацежаздольнасці. Дапамога па хваробе і па беспрацоўі не павінна абкладацца падаткам па больш высокай стаўцы, чым заробак. Сённяшнюю багатую «флору» асобных правілаў і падатковых ільгот за розныя асабістыя паслугі, якія часта азначаюць схаванае пераразмеркаванне на карысць груп з больш высокімі даходамі, трэба істотна выправіць.

- Прынцыпам дэмакратыі, роўных правоў і ўдзелу работнікаў нельга дазваляць спыняцца на парозе працоўнага месца — ці, дакладней, калі яны там спыняюцца, гэта вядзе палітычную дэмакратыю ў няправільным кірунку. Нельга, каб людзі ў вольны час былі паўнапраўнымі сябрамі грамадства, з правамі і абавязкамі ўдзельнічаць у дыскусіях і рашэннях пра грамадства, а на працы ператвараліся ў падпарадкаваныя «фактары вытворчасці» ў кампаніі, на якую яны не маюць аніякага ўплыву — нават калі гаворка ідзе пра іх уласны заробак ці працоўны час. Адна справа, што сённяшняе працоўнае жыццё ставіць іншыя патрабаванні і да

працоўнага заканадаўства, і да прафсаюзнай арганізацыі, і зусім іншая — адмаўляцца ад такога заканадаўства і перашкаджаць прафсаюзнай арганізацыі і прафсаюзнай дзейнасці. Сацыял-дэмакратыя павінна садзейнічаць развіццю формаў прафсаюзнай арганізацыі ў новых сектарах рынку працы, якія толькі складваюцца, а таксама прасоўваць заканадаўства, якое абараняла б ад анамалій, што існуюць сёння ў гэтых сектарах.

- Дэмакратыя патрабуе дасведчаных грамадзян, здольных разважаць. У сённяшнім лічбавым свеце як ніколі раней шмат магчымасцяў шукаць веды і абменьвацца меркаваннямі, але — як становіцца ўсё больш відавочна — і шмат магчымасцяў маніпуляваць, распаўсюджваць ілжывую інфармацыю, пагражаць і падбухторваць. Распрацоўка новых метадаў таго, што ў Швецыі здаўна называюць «folkbildning» (народная асвета), г. зн. новых спосабаў пошуку ведаў, уменняў крытычна ставіцца да крыніц і ўдумлівай дыскусіі, — усё гэта неабходна і становіць вялікі выклік для дэмакратыі. Не менш важна захоўваць і ўмацоўваць грамадскія СМІ.

Новыя перадумовы

ТАКІМ ЧЫНАМ, ЗАДАЧЫ сацыял-дэмакратыі застаюцца даволі падобнымі і датычаць роўнасці, дэмакратыі, умоў працы і размеркавання эканамічнай улады. Аднак перадумовы і канкрэтныя праблемы, вядома, іншыя, чым у гады прарыву і ў перыяд дзяржавы дабрабыту.

Навакольнае асяроддзе і рост

Сацыяльны дабрабыт азначае справядлівае размеркаванне рэсурсаў грамадства, але ўзровень гэтага дабрабыту, натуральна, залежыць ад таго, колькі ёсць чаго размяркоўваць. Таму эканамічны рост быў ключавым фактарам сацыял-дэмакратычнай палітыкі — не таму, што рост з'яўляецца мэтай сам па сабе, а таму, што ён даваў рэсурсы, неабходныя для дабрабыту.

Доўгі час гэты рост можна было вызначаць проста як павелічэнне вытворчасці тавараў і паслуг. Сёння трэба ўлічваць таксама, як адбываецца рост, якія рэсурсы ён спажывае і як уплывае на клімат і прыроду, — бо цяпер мы ведаем, што эканамічны рост меў і мае сваю цану ў выглядзе вялікіх змен у клімаце і экасістэмах, змен, якія ўплываюць на наша жыццё на гэтай планеце. Гэтая цана можа быць такой высокай, што выйдзе за ўсе межы, якія планета павінна захоўваць, каб чалавечае жыццё было абароненым.

Па-ранейшаму застаецца ў сіле тое, што годны ўзровень жыцця і надзейны сацыяльны дабрабыт патрабуюць добрых эканамічных рэсурсаў. Але гэтак жа праўда і тое, што ствараць гэтыя рэсурсы далей у формах, якія пагражаюць асноўным умовам нашага жыцця, нельга. Развіццё тэхналогій з меншым уздзеяннем на навакольнае асяроддзе, адмова ад выкапнёвай энергіі і пераход да аднаўляльных крыніц энергіі адыгрываюць вырашальную ролю, але не вырашаюць усіх праблем. Патрэбныя таксама змены ў тэндэнцыях вытворчасці і транспарту, а яны, у сваю чаргу, патрабуюць змен у спажыванні, якое ляжыць у аснове вытворчасці.

Усё гэта ставіць новыя палітычныя патрабаванні да рэгулявання, эканамічных інструментаў палітыкі, рэсурсаў на даследаванні і інвестыцыі і, не ў апошнюю чаргу, да палітыкі разме-

ркавання. Гэтыя працэсы павінны ісці паралельна і кіравацца агульнай стратэгіяй, у якой сацыяльныя аспекты павінны быць распрацаваныя лепш, чым сёння. Экалагічная палітыка павінна ўключаць справядлівую палітыку размеркавання і дапаўняцца мерамі ў іншых сферах грамадства, каб быць устойлівай і ў сацыяльным сэнсе. Адзін з вынікаў гэтага — змены, неабходныя, каб скараціць спажыванне прыродных рэсурсаў і хімічных рэчываў, нельга цалкам грунтаваць на рынкавых механізмах, г. зн. на больш высокіх цэнах.

Цэнавы механізм сам па сабе — эфектыўны інструмент і для таго, каб стрымліваць спажыванне, і для таго, каб стымуляваць распрацоўку новых альтэрнатыў, і, натуральна, яго трэба выкарыстоўваць там, дзе ён эфектыўна служыць сваёй мэце, — але адначасова спалучаць з мерамі, якія выпраўляюць скажэнні ў размеркаванні. Павышэнне цэн і падаткаў паўплывае на паводзіны кампаній і асобных людзей, але яго недастаткова, каб забяспечыць прыстасаванне, якога патрабуе шэраг грамадскіх структур. Сучаснае грамадства, напрыклад, у многіх адносінах заснаванае на аўтамабільным руху — скажам, на штодзённых паездках на працу ў межах вялікіх рэгіёнаў рынку працы. Істотнае павышэнне цэн на паліва без адпаведнага паляпшэння грамадскага транспарту можа стварыць праблемы для асобных людзей і парушыць працоўнае жыццё.

Аднак развіццё сістэмы грамадскага транспарту немагчыма забяспечыць рынкавымі механізмамі. Для гэтага патрэбныя палітычныя рашэнні і грамадскія інвестыцыі.

Яшчэ адзін прыклад — вытворчасць і перавозка харчавання, а таксама пытанні сельскай гаспадаркі. Такія змены патрабуюць сумеснага планавання і каардынацыі розных мер, каб не выклікаць вялікіх праблем на этапе пераўтварэння. Іншымі

словамі, яны патрабуюць палітычных рашэнняў, палітычнага кіравання і, хутчэй за ўсё, інвестыцый, якімі кіруе грамадства.

Экалагічныя і кліматычныя пытанні разам з лічбавізацыяй працоўнага жыцця, якая сёння адбываецца, — гэта менавіта той тып змен у прадукцыйных сілах, які, паводле Карла Маркса, вядзе і да змен у грамадскай надбудове. Калі пакінуць такія змены ва ўмовах вытворчасці рынкавым механізмам, іх трэба вызначыць як тое, што Ёзеф Шумпетэр называў «стваральным разбурэннем», — разбурэнне старога дзеля стварэння новага і, як мяркуецца, лепшага. Аднак сёння, калі ўзмацніўся супраціў і з'явілася больш прасторы для папулісцкіх груп з сумнеўнымі ўяўленнямі пра патрабаванні дэмакратыі — а ўсё гэта прыйшло ўслед за рынкавым лібералізмам, — рызыка больш відавочная: гэтае разбурэнне, калі пакінуць яго на волю рынкавых механізмаў, якія пастаянна спараджаюць няроўнасць, будзе больш разбуральным, чым стваральным. Каб гэта вырашыць, трэба вярнуцца да таго, што Карл Палані называў укараненасцю рынкавых сіл, г. зн. да сістэмы правілаў, якая ўкараняе прадпрымальніцтва ў грамадскі кантэкст, заснаваны на агульных, грамадскіх інтарэсах.

Экалагічная і кліматычная палітыка патрабуе змен у спажывецкіх звычках — гэтага не пазбегнуць, бо менавіта спажыванне рухае вытворчасць, якая ўплывае на навакольнае асяроддзе. У доўгатэрміновай перспектыве вельмі верагодна, што ў краінах, якія дасягнулі годнага матэрыяльнага ўзроўню, спатрэбіцца пераход да больш умеранага спажывання тавараў і да спажывання паслуг і так званых уражанняў — напрыклад, адпачынку на прыродзе ці культуры.

Гэта, відавочна, уплывае на магчымы прыбытак на капітал. Адна з прычын у тым, што вытворчасць паслуг сама па сабе і ў эканамічным сэнсе мае ніжэйшую прадукцыйнасць і дае

меншы прыбытак. Другая прычына — скарачэнне спажывання тавараў азначае меншыя даходы для таварных рынкаў. Немагчыма прадказаць, як гэта паўплывае на эканамічную сістэму ў цэлым, але трэба прызнаць, што экалагічная структурная перабудова, якая нас чакае, патрабуе новага мыслення і новых падыходаў да эканамічнага кіравання і эканамічных стымулаў. Для сацыял-дэмакратыі гэта важныя пытанні.

Новы капіталізм

Канфлікты інтарэсаў паміж капіталам і працай, паміж інтарэсамі прыбытку і грамадскімі інтарэсамі сёння такія ж выразныя, як і ў першыя гады рабочага руху. Аднак з канца XIX стагоддзя капіталізм у шэрагу адносін змяніўся.

Канфлікты ў самой вытворчасці — тыя ж, што і цяпер: чым больш пераважаюць інтарэсы капіталу, тым больш узмацняецца эксплуатацыя рабочай сілы, а разам з ёй заніжаная аплата, няўстойлівыя ўмовы працы і дрэннае працоўнае асяроддзе. Чым большы ўплыў маюць інтарэсы работнікаў — дзякуючы заканадаўству ці прафсаюзным арганізацыям, — тым больш разумнымі становяцца ўмовы працы і тым бяспечнейшым — працоўнае асяроддзе.

У XX стагоддзі развіццё ў Швецыі, хоць часам і павольна, ішло ў бок большай раўнавагі паміж інтарэсамі капіталу і інтарэсамі работнікаў у вытворчасці. У апошнія дзесяцігоддзі XX стагоддзя гэтае развіццё спынілася — не цалкам і не па ўсёй лініі, але досыць выразна ў пэўных галінах і для пэўных прафесій. Гэта адлюстроўвае і шэраг змен у рэгуляванні — на нацыянальным узроўні ці на ўзроўні ЕС, — і змены ў працоўным жыцці, якія ўскладнілі працу прафсаюзаў.

Адзін выразны прыклад — так званы «гнуткі рынак працы» (цудоўны эўфемізм), які азначае шэраг новых тыпаў кантрактаў — самазанятасць, фрылансерства, пагадзінная праца, праектная праца, кадравыя агенцтвы, — усе з абмежаванымі ў часе, а часам вельмі кароткімі перыядамі працы або заданнямі для шэрагу наймальнікаў. У так званай платформавай эканоміцы, або гіг-эканоміцы, кантакт паміж зацікаўленымі выканаўцамі і зацікаўленымі заказчыкамі наладжваецца праз электронныя платформы, за якімі стаяць моцныя інтарэсы капіталу: яны атрымліваюць прыбытак ад пасярэдніцтва, але не нясуць ніякай адказнасці ні за работнікаў, ні за працоўнае асяроддзе.

Гэтае развіццё часткова адказвае на рэальную патрэбу ў зменлівай колькасці работнікаў або ў часовых спецыяльных ведах і навыках. Аднак відавочна, што яно азначае значна слабейшае становішча тых, каму так ці інакш даводзіцца ўвесь час шукаць новыя кароткатэрміновыя пасады або заданні, і што гэта адбіваецца на ўмовах працы — як заўсёды, калі работнік падпарадкаваны наймальніку. Відавочна і тое, што магчымасці «гнуткасці» выкарыстоўваюцца, каб абысці звычайную адказнасць наймальніка, і што не любую «гнуткую» занятасць можна апраўдаць простай спасылкай на рэальныя ўмовы дзейнасці.

Працоўнае заканадаўства ў гэтай сферы трэба перагледзець, каб і на гэтых новых рынках працы становішча работнікаў было мацнейшым. Прафсаюзная арганізацыя гэтак жа неабходная, але, хутчэй за ўсё, патрабуе новай формы, адрознай ад традыцыйнай.

Разам з тым не ўвесь капітал звязаны з вытворчасцю. Глабальныя рынкі чыста фінансавых аперацый за апошнія дзесяцігоддзі значна выраслі. Аб'ёмы грошай, якія перамяшчаюцца

на гэтых рынках, значна большыя, чым у вытворчасці. Іх укладаюць у больш ці менш складаныя фінансавыя інструменты, а часта ў аперацыі купля-продажу з асноўнымі сродкамі. І ў адным, і ў другім выпадку часта спекулятыўна раздзьмутыя кошты зноў і зноў выклікалі эканамічныя ўзрушэнні, якія відавочна дэстабілізавалі эканоміку і на мясцовым, і на рэгіянальным узроўні — а ў 2008 годзе практычна ва ўсім свеце.

Глабальныя фінансавыя рынкі змянілі нацыянальную эканамічную палітыку. У грашова-крэдытнай палітыцы ўзніклі супярэчлівыя мэты: працэнтныя стаўкі, якія могуць здавацца пажаданымі з пункту гледжання занятасці, шкодныя з пункту гледжання неабходнасці кантраляваць аб'ём крэдытавання. Рост коштаў на актывы, перш за ўсё на жыллё і нерухомасць, спараджае новы тып праблемы інфляцыі, які патрабуе мер і ў падатковай, і ў працэнтнай палітыцы, але сённяшняя падатковая сістэма хутчэй абвастрае гэтую праблему, чым вырашае яе.

Канцэнтрацыя ўлады і ўласнасці ў транснацыянальным фінансавым сектары высокая. У 2018 годзе даследчыкі вылучылі 30 так званых мегабанкаў — прадпрыемстваў глабальнага ўзроўню, звязаных паміж сабой складанымі формамі перакрыжаванай уласнасці. Гэта робіць іх не толькі буйнымі эканамічнымі гульцамі, каб не сказаць — уладнымі; гэта азначае таксама, што калі ў аднаго ці некалькіх банкаў узнікнуць праблемы, яны перакінуцца на іншыя банкі — з моцным дэстабілізуючым уздзеяннем на сусветную эканоміку.

Нягледзячы на рызыку, якую гэтыя глабальныя фінансавыя рынкі ўяўляюць для нацыянальнай эканомікі, кантраляваць іх цяжка. Рынкі глабальныя і таму не падпарадкоўваюцца нацыянальнаму рэгуляванню. Пасля сусветнага фінансавага крызісу 2008 года міжнароднае рэгуляванне часткова стала

больш строгім, але наўрад ці дастаткова. На фінансавых рынках няма і прафсаюзаў, якія маглі б стаць процівагай; замест канфліктаў паміж працай і капіталам фінансавыя рынкі ілюструюць канфлікты паміж інтарэсамі грамадства і інтарэсамі прыбытку. Таму любую процівагу гэтаму трэба фармуляваць на ўзроўні грамадства, г. зн. палітычна.

Неабходнасць развіваць мацнейшыя міжнародныя механізмы кантролю зусім відавочная і мае істотнае значэнне ва ўсім міжнародным супрацоўніцтве. Гэтыя механізмы кантролю неабходныя і з пункту гледжання экалагічнай палітыкі. Існуе канфлікт паміж патрабаваннем такой вытворчасці, якая не шкодзіць прыродным рэсурсам і клімату, і патрабаваннем пастаяннага прыбытку на капітал. І фінансавыя рынкі моцна падштурхоўваюць менавіта да апошняга.

Фінансаванне дабрабыту

Палітыка дабрабыту карыстаецца моцнай падтрымкай самых розных груп выбаршчыкаў, а ўсё большыя недахопы ў сістэме дабрабыту і ў сацыяльных паслугах наогул стварылі праблемы, якія адчуваюць многія. Таму не павінна быць цяжка заваяваць падтрымку выбаршчыкаў як для выпраўлення гэтых недахопаў, так і для некаторых неабходных новых рэформаў; праблема — у фінансаванні.

Выпраўленне недахопаў, а тым больш новыя рэформы, запатрабуюць павышэння падаткаў. Пры цяперашнім палітычным клімаце гэта не зусім проста. Да таго ж застаецца пытанне, ці ўдасца павысіць падаткі да таго ўзроўню, які, хутчэй за ўсё, спатрэбіцца для такіх рэсурсаў.

Патрэба ў фінансаванні рэсурсаў датычыць перадусім грамадскага сектара, і на тое ёсць некалькі прычын. Колькасць па-

жылых людзей і колькасць дзяцей і падлеткаў, г. зн. тых узроставых груп, якія найбольш карыстаюцца паслугамі дабрабыту, у 2020-я гады расце, і ўжо адно гэта патрабуе павелічэння рэсурсаў. Да таго ж значная частка сферы дабрабыту недафінансаваная — у вялікай ступені праз шматлікія зніжэнні падаткаў, уведзеныя ўрадам «Альянсу», — і гэта пагаршае яе магчымасці задавальняць патрэбы карыстальнікаў. Гэта таксама патрабуе больш рэсурсаў. Тое самае датычыць і судова-прававой сістэмы.

Гаворка ў значнай ступені ідзе пра павелічэнне колькасці работнікаў, што ўжо само па сабе каштуе больш грошай, але і сама неабходнасць набраць патрэбную колькасць персаналу пацягне за сабой павышэнне заробкаў для некалькіх прафесійных груп грамадскага сектара. Страхаванне па хваробе трэба аднавіць, патрэбныя рэсурсы на прафесійнае навучанне для новых імігрантаў з нізкім узроўнем адукацыі, умовы ў сацыяльна ўразлівых жылых раёнах трэба ў шэрагу адносін палепшыць, а ўвесь неабходны экалагічны пераход каштуе грошай.

Насамрэч гэты спіс значна даўжэйшы. І ён вельмі ясна паказвае: калі мы хочам мець добра функцыянуючую сацыяльную сферу з паслугамі дабрабыту, якія адпавядаюць патрабаванням якасці і даступнасці, павышэнне падаткаў непазбежнае.

З чыста эканамічнага пункту гледжання цалкам магчыма павысіць падатковую стаўку на некалькі працэнтных пунктаў ад цяперашняга ўзроўню каля 43 працэнтаў (2019), хоць правыя і сцвярджаюць адваротнае. Аргумент правых адлюстроўвае іх зацікаўленасць у ніжэйшых падатках і служыць апраўданнем для дэмантажу сацыяльнага забеспячэння, якое правым / мадэратам заўсёды было не даспадобы.



Наведвальнікі ў падатковым бюро ў Хельсінкі, 3 кастрычніка 1945 года

Няма ніякіх падстаў сцвярджаць, што вышэйшыя падаткі шкодзяць нацыянальнай эканоміцы; вырашальнае значэнне мае, з аднаго боку, тое, як арганізаваная падатковая сістэма, а з другога — на што падаткі расходуюцца. (Занадта) нізкія падаткі насамрэч могуць быць небяспечнымі, калі яны падрываюць грамадскія функцыі, якія «рынак» можа забяспечыць толькі павярхоўна — або не можа забяспечыць наогул. Падаткі — гэта не грошы, якія проста знікаюць у паветры; падаткі расходуюцца і на хатнія гаспадаркі, і на вытворчасць у выглядзе дабротаў, якія паляпшаюць функцыянаванне грамадства і вытворчасці. Такім чынам, падаткі — вельмі рацыянальны спосаб плаціць за гэтыя даброты.

Аднак вышэйшыя падаткі рэдка бываюць папулярнымі, нават калі папулярныя тыя мэты, дзеля якіх іх уводзяць. Да таго

ж існуе шэраг памылковых уяўленняў — часам, падобна, свядома распаўсюджаных — пра тое, на што насамрэч ідуць падатковыя грошы. Сувязь паміж сацыяльнымі паслугамі, якія патрэбныя ўсім, і падаткамі, якія плацяць усе, ужо не такая відавочная.

Таму першы крок да таго, каб людзі зразумелі неабходнасць вышэйшых падаткаў, — гэта адвакацыя і, не ў апошнюю чаргу, распаўсюджванне ведаў пра значэнне ўсеагульнай палітыкі дабрабыту і пра яе непарыўную сувязь са зборам падаткаў.

Вядома, у магчымага збору падаткаў ёсць мяжа: і хатнім гаспадаркам, і кампаніям патрэбныя сродкі на іншыя выдаткі. Імаверна таксама, што нас чакаюць крыху ніжэйшыя тэмпы росту і, адпаведна, меншы прырост зусім новых рэсурсаў, з якіх можна было б плаціць за ўсё большыя патрабаванні да сферы дабрабыту. Гэта значыць, што нам трэба шукаць іншыя і дадатковыя спосабы і далей адказваць на ўзрослыя патрабаванні да палітыкі дабрабыту.

Як магчымы спосаб часта называюць рацыяналізацыю і павышэнне эфектыўнасці. Безумоўна, важна ўвесь час шукаць найлепшы спосаб арганізацыі работы і, вядома, старанна выпрабоўваць усе магчымасці, якія дае лічбавізацыя. Перагляд умоў для дзейнасці прыватных прадпрыемстваў таксама можа даць больш магчымасцяў для рацыянальнейшага выкарыстання рэсурсаў, асабліва ў ахове здароўя. Ёсць таксама шмат сведчанняў таго, што мадэлі кантролю і ацэнкі, якія былі папулярнымі ў апошнія гады, прывялі да разрастання адміністрацыйнай надбудовы за кошт персаналу, які непасрэдна выконвае працу.

Аднак пасля больш чым трох дзесяцігоддзяў назапашанага досведу і дыскусій пра рост выдаткаў у грамадскім сектары — з мантрай пра павышэнне эфектыўнасці, якая ўвесь час паўта-

раецца, але так і не дала жаданых вынікаў, а хутчэй прывяла да рэзкіх скарачэнняў персаналу, што павялічыла нагрузку і на работнікаў, і на карыстальнікаў, — нам варта прызнаць сумнеў у тым, што магчымасці павышэння эфектыўнасці сапраўды такія фантастычныя, каб вырашыць значную частку праблемы фінансавання.

Улічваючы маштаб праблем, іншыя варыянты фінансавання не варта выключаць проста па азначэнні — іх трэба ўважліва аналізаваць з пункту гледжання іх уздзеяння. І наадварот, значную частку цяперашніх падатковых ільгот на прыватныя бытавыя паслугі трэба скасаваць. Галоўная задача — абараніць усеагульнасць ключавых паслуг дабрабыту, такіх як адукацыя, ахова здароўя і сацыяльная апека. Непрымальныя рашэнні, пры якіх асноўныя базавыя інвестыцыі фінансуюцца з падаткаў, але даступнасць і якасць потым вызначаюцца тым, колькі можа заплаціць прыватная асоба.

Асобнае пытанне — размеркаванне выдаткаў паміж дзяржавай і муніцыпалітэтамі.

На мясцовыя муніцыпалітэты ўскладзена вялікая адказнасць за ключавыя паслугі дабрабыту, такія як адукацыя, ахова здароўя і сацыяльная апека. Гэта дае грамадзянам магчымасць непасрэдна ўплываць на іх і дазваляе арганізоўваць дзейнасць у адпаведнасці са зменлівымі мясцовымі і дэмаграфічнымі ўмовамі. Аднак паміж рознымі муніцыпалітэтамі існуюць вялікія і хутка растучыя адрозненні ў эканамічнай здольнасці падтрымліваць гэтыя паслугі. І гэта, і пытанне пра тое, што можна лічыць рацыянальнай арганізацыяй падатковай сістэмы, даюць падставы абмяркоўваць іншае размеркаванне выдаткаў паміж дзяржавай і муніцыпалітэтамі.

Большасць аналітыкаў згодныя, што неабходна пераразмеркаванне паміж падаткамі на капітал і падаткамі на даход, або,

кажучы простай мовай, вышэйшыя падаткі на капітал і ніякага павышэння падатку на даход для груп з нізкімі даходамі. Аднак падаткі на капітал паступаюць дзяржаве, а не муніцыпалітэтам. Муніцыпалітэты маюць права павышаць толькі муніцыпальныя падаткі, г. зн. прапарцыйны падатак на даход, які спаганяецца і з груп з нізкімі даходамі. Адна простая выснова: неабходнае фінансаванне рэсурсаў для сацыяльных паслуг не павінна забяспечвацца выключна ці нават пераважна за кошт павышэння муніцыпальных падаткаў — частку выдаткаў павінна ўзяць на сябе дзяржава.

Апошняе пытанне, вядома, — ці можна пашырыць падатковую базу. Гэта залежыць, з аднаго боку, ад узроўню занятасці і колькасці адпрацаваных гадзін, а з другога — ад узроўню даходаў тых, хто працуе. Такім чынам, рост занятасці — ключавы складнік забеспячэння дабрабыту, але гаворка павінна ісці пра працоўныя месцы з годнымі заробкамі. Калі шмат нізкааплатных працоўных месцаў, то ўнёсак у падатковыя паступленні меншы за адпаведны аб'ём паслуг дабрабыту, якімі карыстаюцца работнікі з нізкімі заробкамі. Таму ідэя правых рабіць стаўку на большую колькасць нізкааплатных працоўных месцаў дае адваротны вынік; сапраўдная перадумова — палітыка ў сферы рынку працы і адукацыі, якая адкрывае магчымасці добра аплачванай працы для вялікай часткі рабочай сілы.

Можна таксама дадаць, што працоўнае асяроддзе і ўмовы працы, якія не ствараюць празмернай нагрузкі на работнікаў і не шкодзяць іх здароўю, — гэта адначасова важныя патрабаванні дабрабыту для кожнага паасобку і крыніца эканоміі для сістэмы дабрабыту.

Міграцыя і інтэграцыя

На працягу ўсёй гісторыі Швецыя была краінай з высокім узроўнем іміграцыі — з патокам людзей з Фінляндыі, якая каля 600 гадоў была другой паловай краіны, і з краін узбярэжжа Балтыйскага мора. У навейшы час узровень іміграцыі няўхільна рос пачынаючы з 1950-х гадоў. Хуткая індустрыяльная экспансія пасля заканчэння Другой сусветнай вайны патрабавала значнай працоўнай іміграцыі. Палітычныя рэпрэсіі і ваенны гвалт у іншых частках свету пастаянна павялічвалі колькасць бежанцаў, а свабода перамяшчэння ў ЕС азначае большую мабільнасць рабочай сілы паміж краінамі — сябрамі ЕС.

Наступствы пераважна пазітыўныя. Іміграцыя давала і дае важны дадатковы рэсурс рабочай сілы і кампетэнцый для грамадства, эканомікі, валанцёрскай працы і культуры. Мы павінны таксама разлічваць на тое, што іміграцыя будзе працягвацца, калі мы хочам пакрываць унутраны попыт на рабочую сілу, і таму, што войны, палітычныя рэпрэсіі і рост экалагічных праблем прымушаюць занадта многіх пакідаць свае краіны.

Закрыць межы Швецыі для імігрантаў, чаго патрабуюць некаторыя партыі, — ні рэалістычна, ні аб'ектыўна абгрунтавана. Вядома, наша здольнасць прымаць імігрантаў не бязмежная, і свабодная або амаль свабодная іміграцыя, якую падтрымліваюць лібертарыянскія групы, — гэтаксама як і забарона іміграцыі — не з'яўляецца ўстойлівай альтэрнатывай. Замест гэтага дыскусія павінна быць пра тое, як сфармуляваць правілы — і ў самой краіне, і ў межах ЕС. Яна павінна ахопліваць і пытанне пра тое, як задаволіць попыт у сферах жылля і адукацыі, бо яны ключавыя для таго, каб імігранты маглі ўладкавацца і інтэгравацца.

Патрэбная таксама дыскусія пра цяперашнія моцна сегрэгаваныя жылыя раёны, пра праблемы, якія яны спараджаюць, і пра тое, што трэба зрабіць, каб палепшыць там умовы. Такое паляпшэнне — абсалютная перадумова для таго, каб вырашыць праблемы, якія цяпер дамінуюць ва ўсёй дыскусіі пра міграцыю, такія як злачыннасць груповак і рэлігійная радыкалізацыя.

Дыскусія, асабліва пасля крызісу бежанцаў 2015 года і нядаўняга росту папулярнасці поглядаў антыіміграцыйных Шведскіх дэмакратаў, засяроджвалася на розных негатыўных наступствах іміграцыі. Гэтыя праблемы досыць сур'ёзныя і патрабуюць як неадкладнага супрацьдзеяння, так і больш доўгатэрміновай стратэгіі. Каб меры, уведзеныя для непасрэднага супрацьдзеяння праявам гэтых праблем, далі сапраўдны вынік, іх трэба спалучаць з мерамі супраць усіх глыбінных фактараў.

Аднак важна сачыць за тым, каб гэтая дыскусія і ўведзеныя меры не засланялі ўсіх іншых, пазітыўных бакоў іміграцыі; у гэтым кантэксце асабліва апраўдана звяртаць увагу на неабходнасць шматбаковага і нюансаванага падыходу. Мы павінны таксама ўсведамляць, што абгрунтаваную занепакоенасць гвалтоўнай злачыннасцю і радыкалізмам могуць выкарыстоўваць сілы, чые мэты прынцыпова іншыя і больш змрочныя, чым пошук вырашэння гэтых праблем.

Агульнае паняцце «іміграцыя» само па сабе ахоплівае некалькі розных відаў міграцыі, якія рэгулююцца зусім рознымі правіламі. Шукальнікі прытулку, працоўная іміграцыя, іміграцыя дзеля ўз'яднання сям'і і свабоднае перамяшчэнне ў межах ЕС разам складаюць пераважную большасць мігрантаў.

Трансгранічная мабільнасць рабочай сілы ў прынцыпе пазітыўная, і многія шведы асабіста і з карысцю для сябе скарысталіся магчымасцямі, якія дае ў гэтым сэнсе ЕС. Аднак патрэ-

бныя правілы і выразны ўплыў прафсаюзаў, каб нязменна няроўныя адносіны сілы паміж наймальнікам і работнікам не вялі да эксплуатацыі ў выглядзе дэмпінгу заробкаў, доўгага працоўнага дня і шкоднага працоўнага асяроддзя.

Першапачатковыя правілы ЕС не давалі дастатковай абароны ад такой эксплуатацыі і ў некаторых галінах, асабліва ў будаўніцтве і на транспарце, мелі значныя негатыўныя наступствы і для ўмоў працы, і для канкурэнцыі. Цяпер гэтыя першапачатковыя правілы ўзмоцненыя, што азначае больш жорсткія патрабаванні да наймальнікаў, але рэальныя вынікі пакуль незразумелыя, і пытанне трэба трымаць у полі ўвагі.

Правілы працоўнай іміграцыі ў Швецыі, сфармуляваныя ў пагадненні аб міграцыйнай палітыцы, якое ў 2011 годзе падпісалі мадэраты і Партыя зялёных, таксама маюць вялікія шчыліны для жорсткай эксплуатацыі рабочай сілы — і гэтымі шчылінамі карысталіся. Шмат гадоў жорсткая крытыка з боку прафсаюзаў і сацыял-дэмакратаў не давала выніку. Аднак дыскусія пра больш жорсткія патрабаванні да шукальнікаў прытулку падштурхнула мадэратаў — хутчэй за ўсё, як вынік іх уласных, у цэлым больш жорсткіх патрабаванняў у міграцыйнай палітыцы — пагадзіцца на больш жорсткі кантроль і над працоўнай іміграцыяй. Вынікі гэтага і далей трэба адсочваць.

Шукальнікі прытулку мігруюць, каб абараніць сябе ад наступстваў рэпрэсій, пераследу і вайны. Працоўныя імігранты прыязджаюць у Швецыю, бо наша краіна мае патрэбу ў рабочай сіле. Таму працоўная іміграцыя павінна быць накіраваная на галіны ці прафесіі, дзе не хапае ўнутранай рабочай сілы з патрэбнымі кампетэнцыямі. У галінах ці прафесіях з дастатковай або залішняй колькасцю кандыдатаў працоўная іміграцыя, адпаведна, неапраўданая. Гэта асабліва датычыць

працы, якая не патрабуе спецыяльнай адукацыі. Сёння такія працоўныя месцы складаюць адносна невялікую долю рынку працы, і колькасць прэтэндэнтаў перавышае колькасць месцаў. Неразумна яшчэ больш узмацняць канкурэнцыю ў гэтай сферы, дазваляючы наймальнікам прывозіць рабочую сілу з іншых краін.

Прадастаўленне прытулку азначае не толькі тое, што бежанцам дазваляюць застацца ў Швецыі. Гэта таксама абавязацельства даць гэтым новым жыхарам сапраўдныя магчымасці ўладкавацца ў краіне і пабудаваць новае жыццё. Гэтае абавязацельства адпавядае і інтарэсам Швецыі як нацыі. Рост паралельных супольнасцяў, дзе мігранты могуць існаваць толькі на ўскрайку рынку працы і рынку жылля, з відавочна горшымі ўмовамі жыцця і меншымі правамі, чым у карэннага насельніцтва, шкодзіць і імігрантам, і грамадству вакол іх.

Таму здольнасць прымаць мігрантаў залежыць ад рэсурсаў, даступных для паспяховай інтэграцыйнай палітыкі. Менавіта гэта павінна вызначаць, якія правілы — у дадатак да міжнародных канвенцый, падпісаных Швецыяй, — будуць дзейнічаць адносна колькасці бежанцаў, якіх прымае краіна. Да неабходных рэсурсаў належаць жыллё, навучанне шведскай мове і даступнасць навучання для рынку працы, прафесійнага навучання і папаўнення ўласных прафесійных навыкаў бежанцаў. Сёння з жыллём існуюць сур'ёзныя недахопы, але патрабаванні інтэграцыйнай палітыкі толькі ўзмацняюць агульную патрэбу ў павелічэнні жыллёвага будаўніцтва.

У цэлым, падобна, арганізацыю прыёму і рассялення бежанцаў трэба ўмацаваць. Пагадненне аб міграцыйнай палітыцы, падпісанае ў 2011 годзе паміж урадам «Альянсу» і Партыяй зялёных, адкрыла шлях да росту іміграцыі — чаго і чакалі і што стала непасрэдным вынікам. Аднак мала што было зроблена,

каб павялічыць рэсурсы, неабходныя як для прыёму імігрантаў, так і для дапамогі ім ва ўладкаванні. Відавочна, партыі разлічвалі, што гэтае пытанне вырашыцца само сабой. Частку гэтых недахопаў выправілі, але шмат што яшчэ трэба зрабіць, асабліва ў сферы жылля.

Швецыя ніколі не змагла б прыняць і інтэграваць больш за невялікую частку цяперашняга міграцыйнага патоку. Мы павінны дабівацца, каб больш краін ЕС прымалі больш бежанцаў, і актыўна падтрымліваць міжнародныя арганізацыі, якія працуюць з патокамі бежанцаў. Аднак у доўгатэрміновай перспектыве мы не знойдзем вырашэння праблемы несправядлівасці ці вайны, перасяляючы пацярпелых у новую краіну. Адзінае сапраўды ўстойлівае рашэнне — супрацьдзейнічаць тым фактарам, якія прымушаюць людзей станавіцца бежанцамі, і ліквідаваць іх. Швецыя ва ўсім сваім міжнародным супрацоўніцтве павінна спрыяць міру і раззбраенню, аднаўленню краін, разбураных вайной, і дапамозе развіццю бедных краін; супрацьдзеянне фактарам, якія прымушаюць людзей уцякаць, і іх ліквідацыя — адзіныя сапраўдныя рашэнні праблемы вымушанай міграцыі.

Добра наладжаная інтэграцыя зводзіць да мінімуму патрэбу ў жорсткіх правілах, якія рэгулююць саму міграцыю. Аднак калі мы хочам выкарыстаць здольнасці і кампетэнцыі імігрантаў, якія прыбылі нядаўна, большасці з іх спатрэбіцца час на ўладкаванне, які ўключае некалькі відаў навучання і можа доўжыцца некалькі гадоў, на працягу якіх выдаткі нясе грамадства. Зыходзячы са складу патоку бежанцаў, які існуе ўжо пэўны час, многія не маюць адукацыі звыш базавай і маюць патрэбу не толькі ў курсах шведскай мовы, але і ў адносна вялікім аб'ёме дадатковага навучання.

Укладаць рэсурсы ў такія кампетэнцыі безумоўна варта, нават калі гэта сапраўды займае некалькі гадоў. Такія меры дадуць ім мацнейшую пазіцыю на рынку працы, вышэйшыя заробкі і з часам лепшыя пенсіі. Цяперашнюю тэндэнцыю да ўзнікнення этнізаванага нізкааплатнага пралетарыяту ў пэўных жылых раёнах, які ўжо можна там убачыць, трэба павярнуць назад; прапанова правых свядома створаць больш нізкааплатных працоўных месцаў сацыяльна непрымальная, калі не шкодная.

Гэтая прапанова таксама эканамічна дае адваротны вынік. Яна зыходзіць з ідэі, што імігранты ўсё роўна будуць плаціць падаткі і тым самым рабіць унёсак у фінансаванне паслуг дабрабыту. Аднак самога факту наяўнасці працы недастаткова; мае значэнне і памер заробку. Падатак, які спаганяецца з вельмі нізкіх даходаў, не пакрывае ні выдаткаў на сацыяльныя паслугі, на якія чалавек мае права, ні яго пенсіі звыш узроўню гарантаванай пенсіі. Каб спагнаныя падаткі пакрывалі і паслугі дабрабыту для самога чалавека, патрэбны заробак пэўнага памеру. Проста кажучы, павелічэнне колькасці дрэнна аплачваных працоўных месцаў не вырашае тых праблем, якія гэтая прапанова нібыта вырашае.

Другі бок цяперашніх праблем, звязаных з міграцыяй, датычыць недастатковай інтэграцыі, якая ўжо стала фактам. Гэтая праблема датычыць не ўсіх імігрантаў, што прыехалі ў Швецыю за апошнія дзесяцігоддзі, але самі недахопы сур'ёзныя. Ёсць таксама рызыка, што гэта будзе адбівацца яшчэ пэўны час у будучыні, бо наступствы для многіх дзяцей, якія растуць ва ўразлівых, сегрэгаваных раёнах, негатыўныя.

Сацыялагічныя даследаванні поўнасцю пацвярджаюць, што дзяцінства, у якім пераважаюць беднасць, дрэнныя адзнакі ў школе, перанаселенае жыллё і цяжкасці з пошукам працы, —

гэта фактары рызыкі для злачыннасці. І даследаванні, і штодзённы досвед паказваюць таксама, што сацыяльнае асяроддзе, атрыманы досвед і вобраз грамадства, які яны перадаюць, уплываюць на самаўспрыманне чалавека, яго чаканні ад будучыні і погляды на грамадства. У раёнах, дзе пераважаюць эканамічныя нястачы, няўстойлівыя ўмовы працы і школы, у якіх многім вучням цяжка дасягнуць патрэбнага ўзроўню, ёсць рызыка, што ўзнікне адчуванне адчужанасці ад «звычайнага» грамадства і адсутнасці ў ім магчымасцяў. Хутчэй за ўсё, гэтыя адчуванні яшчэ мацнейшыя ў раёнах, дзе большасць жыхароў паходзіць з розных краін, дрэнна валодае шведскай мовай і не здолела па-сапраўднаму ўладкавацца і ўключыцца ў жыццё новай краіны. Высокая рызыка, што частка жыхароў адчуе, быццам шляхі да інтэграцыі і ўключэння закрытыя да такой ступені, што нават спрабаваць няма сэнсу, і што трэба шукаць іншыя спосабы атрымаць эканамічную выгаду і сацыяльны статус. Яны нават могуць адкінуць нормы і каштоўнасці, якія, як ім здаецца, асабліва пануюць у грамадстве, куды яны не могуць увайсці, і замест гэтага ўтвараць уласныя анклавы, заснаваныя на іншых поглядах і часам супрацьпастаўленыя грамадству большасці.

Паняцце «праблема іміграцыі» часта адлюстроўвае такое развіццё грамадства, якое азначае праблемы і ў іншых адносінах, — адзін з прыкладаў доўгатэрміновы нізкі ўзровень жыллёвага будаўніцтва. Усе палітычныя партыі, у тым ліку сацыял-дэмакраты, нясуць адказнасць за тое, што сегрэгацыі дазволілі ўзнікнуць. Аднак меркаванне, што на працягу вельмі доўгага часу нічога не рабілася, патрабуе больш дакладнага ўдакладнення.

Праблемы школ у раёнах, дзе вельмі вялікая доля дзяцей недастаткова валодае шведскай мовай, абмяркоўваюцца ўжо даўно.

Школьныя ўлады прымалі ў гэтай сферы актыўныя меры, а муніцыпалітэты рэалізавалі буйныя і важныя ініцыятывы, каб палепшыць тут вынікі. Аднак на намаганні, якія робяцца ўнутры школ, уплывае тое, што адбываецца за іх сценамі, бо разрывы ў Швецыі сталі большымі. Найцяжэй гэта ўдарыла па эканамічна слабейшых групах, да якіх у значнай ступені належаць і этнічна сегрэгаваныя жылыя раёны. Жыллёвае будаўніцтва на рынкавых умовах найбольш негатыўна адбілася на групах з нізкімі эканамічнымі рэсурсамі. Сістэма свабоднага выбару школы толькі ўзмацніла праблему для школ у несприяльных раёнах. Паслабленне працоўнага заканадаўства і больш жорсткія ўмовы на рынку часовай працы асабліва закранулі групы са слабейшымі пазіцыямі на рынку працы. Рэсурсы, выдзеленыя на сацыяльныя паслугі, скараціліся, а разам з імі — і магчымасці прафілактычных мер і падтрымкі сем'яў. І гэтак далей...

Усё гэта ў суме моцна ўскладняе штодзённае жыццё. Такое развіццё ў значнай ступені тлумачыцца рынкава-ліберальнай палітыкай і маркетызацыяй сацыяльных паслуг, якія праводзілі правыя ўрады. Меры, якія цяпер патрэбныя, каб не даць больш маленькім дзецям быць уцягнутымі ў злачыннасць або рэлігійную радыкалізацыю, павінны быць палітычнымі, а не рынкавымі. Патрэбна больш рэсурсаў для сацыяльных паслуг, разам з большымі інвестыцыямі ў вольны час падлеткаў, больш магчымасцяў для прафесійнага навучання і адукацыі, меры па будаўніцтве большай колькасці жылля для людзей з нізкімі даходамі, больш змешанага жыллёвага будаўніцтва і цэлы шэраг іншых мер. І, вядома, патрэбныя меры паліцыі і судова-прававой сістэмы, каб ліквідаваць груповкі і сілы, якія за імі стаяць. Аднак, як падкрэсліваюць прадстаўнікі паліцыі, злачыннасць немагчыма па-сапраўднаму ліквідаваць без дадатковых сацыяльных мер.



Будаўнічая пляцоўка жыллёвага таварыства на вуліцы Уусікату, 8 у Оўлу, 17 верасня 1947 года

Сегрэгацыя — рухаючая сіла гвалтоўных груп, якія мы бачым сёння, і менавіта яе трэба ліквідаваць. Таму адзін з ключавых фактараў прафілактыкі — дзеянні па паляпшэнні вынікаў у школах. У нас ужо ёсць практычны досвед гэтага ў такіх муніцыпалітэтах, як Сёдэртэлье, Боткюрка і Мальмё. Аднак кагнітыўныя навыкі, неабходныя для добрых адзнак у школе, трэба развіваць і па-за школай. Гэта азначае меры для дзяцей і падлеткаў у іх вольны час: розныя віды творчых заняткаў, прыродазнаўчыя эксперыменты, звязаныя з навакольным асяроддзем, і г. д. Дзеці і падлеткі ў больш забяспечаных раёнах, натуральна, маюць доступ да такіх заняткаў дома. Каб такія заняткі былі даступныя і дзецям ва ўразлівых раёнах, часта патрэбныя меры з боку супольнасці (грамадства).

Перанаселенае жыллё — вялікая праблема: яно дорага абыходзіцца сямейнаму жыццю і часта выганяе дзяцей на вуліцу. Адна з частак гэтай праблемы ў тым, што імігранты, якія прыехалі нядаўна і не могуць знайсці ўласнае жыллё, у выніку жывуць у сваякоў або знаёмых, — і гэта сведчыць пра важнасць значнага павелічэння жыллёвага будаўніцтва з большай разнастайнасцю тыпаў жылля.

Сённяшняя сегрэгацыя спарадзіла як рэлігійную радыкалізацыю, якая не цураецца гвалтоўных тэндэнцый і моцна прыгнятае жанчын, так і ўсё больш жорсткую злачыннасць груповак. У цэлым чыста гвалтоўныя групы невялікія, але маюць шырокі ўплыў на грамадства. Іх падтрымліваюць больш арганізаваныя сілы рознага кшталту. Некаторыя групы звязаныя з камерцыйнай злачыннасцю. Важна ліквідаваць і такі від злачыннасці, каб спыніць утварэнне груповак.

Іншыя групы паходзяць з больш фундаменталісцкіх рэлігійных супольнасцяў, на практыцы перадусім ісламісцкіх, з больш міжнароднымі каранямі. У апошніх галоўная мэта — не гвалт супраць дзяржаўных інстытутаў, але асобныя людзі, відавочна, натхняліся на гвалт праз кантакт з рэлігіяй. Галоўную мэту можна апісаць перадусім як місіянерскую і як імкненне змяніць нормы. Ёсць таксама пытанне пра змены, якіх такія рэлігійныя групы патрабуюць ад шведскага грамадства, каб яно прыняло іх правілы жыцця і ў школе, і на працы, — але ў супярэчнасці з каштоўнасцямі, асноватворнымі для сучаснага шведскага грамадства.

Свабода веравызнання — асноўнае права ў дэмакратыі. Аднак свабода выбіраць веру і вызнаваць яе ў рэлігійным, духоўным сэнсе не азначае права патрабаваць, каб правілы, што рэгулююць грамадскую дзейнасць і грамадскія інстытуты, падладжваліся пад пэўную веру. Законы і правілы аднолькава рас-

паўсюджваюцца на ўсіх незалежна ад рэлігіі; гэта асноватворная дэмакратычная перадумова. Гэтаксама на свабоду веравызнання нельга спасылацца, каб перашкаджаць крытыцы рэлігіі, і яна не дае ніякага права абмяжоўваць свабоду перамяшчэння і жыццёвы выбар іншых людзей у імя рэлігіі.

Стабільнасць і згуртаванасць краіны не патрабуюць, каб кожны чалавек думаў аднолькава, меў тыя самыя інтарэсы, тую самую рэлігію ці тыя самыя традыцыі, калі гаворка пра выхадныя і святы, адзенне, музыку і ежу. Аднак стабільнасць і згуртаванасць патрабуюць разумення і падтрымкі пэўных асноватворных каштоўнасцяў, замацаваных у заканадаўстве. Найбольш відавочныя каштоўнасці, якія трэба абараняць, — гэта каштоўнасці дэмакратыі. Адкрыта антыдэмакратычным поглядам трэба і неабходна супрацьстаяць. Паралельныя супольнасці ў межах Швецыі, заснаваныя на недэмакратычных каштоўнасцях — напрыклад, на непрызнанні таго, што ўсе людзі маюць роўную каштоўнасць і роўныя правы, — недапушчальныя. Гэтаксама недапушчальныя палітычныя меры, якія прама ці ўскосна спрыяюць такім паралельным супольнасцям або недэмакратычным аб'яднанням.

Дэмакратычныя каштоўнасці павінны канкрэтна выяўляцца ва ўмовах, якія грамадства і яго розныя інстытуты ствараюць для сваіх жыхароў. Барацьба з пэўнымі праявамі рэлігійнага экстрэмізму — гэтаксама як і барацьба са злачыннасцю груповак — задача паліцыі і судова-прававой сістэмы. І ўсё ж адзіная эфектыўная доўгатэрміновая стратэгія заўсёды — мяняць умовы жыцця, якія сёння ствараюць глебу для экстрэмізму, гвалту і злачыннасці, — змены, дзякуючы якім дэмакратычныя ідэалы становяцца рэальнай часткай жыцця кожнага.

Ілюстрацыі

ВОКЛАДКА

«Första maj 1912, demonstrationståget på Järntorgsgatan» (першамайскае шэсце, Гётэборг, 1.05.1912). Фатограф невядомы. Göteborgs stadsmuseum (GSMArkiv:150078:7), Wikimedia Commons. Грамадскі набытак.

ПРАДМОВА · С. 6

«Helsinki city's library 1931» (дзіцячы аддзел бібліятэкі на Rikhardinkatu). Фота: Eric Sundström, 1931. Museovirasto (JOKAOT3KI2KSTO-7, Finna), Wikimedia Commons. CC BY 4.0.

ЧАСТКА I, 1 · С. 15

«1909 storstrejk. Militärbevakning Centralstationen». Фатограф невядомы, 1909; рэпрадукцыя з кнігі Z. Höglund «Hjalmar Branting och hans livsgärning» (1928), Wikimedia Commons. Грамадскі набытак.

ЧАСТКА I, 2 · С. 23

«Stockholm – Nordiska museet 20190818-20» (кухня кватэры часоў folkhemmet у экспазіцыі Nordiska museet). Фота: Pymouss, 2019, Wikimedia Commons. CC BY-SA 4.0.

ЧАСТКА I, 3 · С. 32

«Assembly hall of the Riksdag Tour 1 Wikimania 2019 02». Фота: BugWarp, 2019, Wikimedia Commons. CC BY 3.0.

ЧАСТКА II, 1 · С. 43

«Från strejken i Norbergs gruvdistrikt den 13–23 april». Малюнкі: Carl Kjellin (1862–1939), «Ny Illustrerad Tidning», 2.05.1891; рэпрадукцыя з кнігі T. Nerman «Svensk arbetarrörelse under hundra år» (Tiden, 1938), Wikimedia Commons. Грамадскі набытак.

ЧАСТКА II, 2 · С. 53

«Hjalmar Branting i talarstolen på Gärdet 1 maj 1917». Фатограф невядомы; рэпрадукцыя з кнігі «Hjalmar Branting och hans livsgärning – Hövdingen» (1928), Wikimedia Commons. CC BY-SA 4.0.

ЧАСТКА II, 3 · С. 62

«Demonstration för kvinnlig rösträtt i Göteborg 2 juni 1919». Фатограф невядомы. Göteborgs stadsmuseum (GSMArkiv:210030:19), Wikimedia Commons. CC0.

ЧАСТКА II, 4 · С. 72

«Een enorme menigte is naar de Groenmarkt in Den Haag getrokken om het Algemeen Kiesrecht af te dwingen», 17.09.1912. Фатограф невядомы. Spaarnestad Photo (SFA002018713), Wikimedia Commons. Грамадскі набытак.

ЧАСТКА II, 5 · С. 82

«Berlin, Opernplatz, Bücherverbrennung», 10–11.05.1933. Фота: Georg Pahl. Bundesarchiv (Bild 102-14597), Wikimedia Commons. CC BY-SA 3.0 DE.

ЧАСТКА III, 1 · С. 94

Партрэт Карла Маркса. Фота: John Jabez Edwin Mayall, 1875. International Institute of Social History, Wikimedia Commons. Грамадскі набытак. Тытульны ліст: K. Marx, «Das Kapital», т. 1 (Hamburg: Otto Meissner, 1867), Wikimedia Commons. Грамадскі набытак.

ЧАСТКА III, 2 · С. 105

«Per Albin Hansson». Фатограф невядомы; рэпрадукцыя з кнігі E. Wrangel (рэд.) «Svenska folket genom tiderna», т. 12 (Allhem, 1940), Wikimedia Commons. Грамадскі набытак.

ЧАСТКА III, 3 · С. 115

«Torghandel på Grönsakstorget». Фота: Aron Jonason (1838–1914), 1890-я. Göteborgs stadsmuseum (GhmPK:213), Wikimedia Commons. Грамадскі набытак.

ЧАСТКА IV, 1 · С. 128

«The cookers of the elementary school in Oulu 1953», 28.10.1953. Фатограф невядомы, газета «Kaleva». Museovirasto (JOKAKAL3B-10306, Finna), Wikimedia Commons. CC BY 4.0.

ЧАСТКА IV, 2 · С. 140

«Coffee break in the Oulu old people's home 1949», 7.02.1949. Фатограф невядомы, газета «Kaleva». Museovirasto (JOKAKAL3B-23508, Finna), Wikimedia Commons. CC BY 4.0.

ЧАСТКА V, 1 · С. 151

«Diatomite factory Skåne Sweden» (Östra Genastorp каля Osby). Фота: Finn-j, 2015, Wikimedia Commons. CC0.

ЧАСТКА V, 2 · С. 162

«An unemployed father of a family 1931» (Vallila, Хельсінкі). Фота: Wolfgang Heine, 1931. Museovirasto (JOKAOT4SK1931 39-2, Finna), Wikimedia Commons. CC BY 4.0.

ЧАСТКА V, 3 · С. 174

«Ihmisiä nousee Petsamoon menevään linja-autoon» (Sodankylä). Фота: Samuli Paulaharju, 1937. Museovirasto (KK3490:7162, Finna), Wikimedia Commons. CC BY 4.0.

ЧАСТКА VI, 1 · С. 180

«Lehtikioskeja» (Хельсінкі). Фота: Aarne Pietinen Oy, 1932. Museovirasto (HK19670603:7317, Finna), Wikimedia Commons. CC BY 4.0.

ЧАСТКА VI, 2 · С. 195

«People at Tax Office 1945», 3.10.1945. Фота: Hugo Sundström. Museovirasto (8335C; JOKAHBL3C F10-1, Finna), Wikimedia Commons. CC BY 4.0.

ЧАСТКА VI, 3 · С. 207

«The construction site of the housing corporation Uusikatu 8 in Oulu 1947», 17.09.1947. Фатограф невядомы, газета «Kaleva». Museovirasto (JOKAKAL3B-7899, Finna), Wikimedia Commons. CC BY 4.0.

Калажы — Праксіс. Выявы ў грамадскім набытку і пад ліцэнзіяй CC0 можна выкарыстоўваць свабодна; выявы пад ліцэнзіямі CC BY і CC BY-SA — з пазначэннем аўтараў, крыніцы і ліцэнзіі.

Нататкі

Нататкі

Нататкі

БЕЛАРУСКАЕ ВЫДАННЕ

praxis.hramada.eu

АРЫГІНАЛ

palmecenter.se

Выданне перакладзена і апублікавана з дазволу Olof Palme International Center.



ПРАКСІС